WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

20 КАСТРЫЧНІКА 2011 г.
ЧАЦВЕР
№ 200
(27064)

Кошт 800 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

БЕЛАРУСЬ ВЫКОНВАЕ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ ДЛЯ АТРЫМАННЯ КРЭДЫТУ З АНТЫКРЫЗІСНАГА ФОНДУ ЕЎРАЗЭС

Аб гэтым заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч на пасяджэнні Міждзяржсавета ЕўрАзЭС на ўзроўні кіраўнікоў урадаў, перадае БЕЛТА.

«У адпаведнасці з матрыцай, усё выконваецца», — сказаў прэм'ер-міністр.

У сваю чаргу кіраўнік расійскага ўрада Уладзімір Пуцін звярнуўся да беларускага боку з просьбай аб своечасовым выкананні гэтых абавязацельстваў. «Мы прасілі б звярнуць вашу ўвагу на тое, каб гэтыя ўмовы, узгодненыя беларускім бокам, выконваліся своечасова», — сказаў ён, звяртаючыся да Міхаіла Мясніковіча. Паводле слоў Уладзіміра Пуціна, своечасовае выкананне Беларуссю ўзятых на сябе абавязацельстваў неабходнае для эфектыўнага выкарыстання крэдыту, які выдзяляецца. «Мы разумеем, як гэта няпроста, але для таго каб выдзяляемыя рэсурсы працавалі, іх трэба эфектыўна выкарыстоўваць», — дадаў ён.

Старшыня ўрада Расіі звярнуў увагу на тое, што Беларусь, як і многія іншыя краіны, сёння вымушана вырашаць няпростыя эканамічныя праблемы. «Мы жадаем поспехаў беларускай дзяржаве, беларускаму народу», — адзначыў Уладзімір Пуцін. Ён нагадаў аб прынятым рашэнні выдзеліць Беларусі з Антыкрызіснага фонду ЕўрАзЭС крэдыт у аб'ёме $3 млрд. «Першы транш прайшоў ужо — гэта $800 млн, цяпер вырашаецца пытанне аб наступным траншы $445 млн», — адзначыў ён.

ДЗЯРЖАКЦЫІ БЕЛТРАНСГАЗА І КАМПАНІІ МТС МОГУЦЬ БЫЦЬ ПРАДАДЗЕНЫ ЎЖО СЁЛЕТА

Пра гэта паведаміў на прэс-канферэнцыі па пытаннях прыватызацыі ў прэс-цэнтры Дома прэсы старшыня Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі Георгій Кузняцоў.

Згодна з падрыхтаваным планам прыватызацыі дзяржмаёмасці на тры гады, у перыяд 2011—2013 гадоў неабходна рэалізаваць дзяржакцыі 240 прадпрыемстваў краіны. Сёлета на адкрытых таргах патэнцыяльным інвестарам будуць прапанаваны актывы 178 сярэдніх акцыянерных таварыстваў краіны.

Сёлета першыя аўкцыёны па продажы дзяржакцыяў пачаліся толькі ў чэрвені. Усяго за гэты час інвестарам былі прададзены акцыі 29 прадпрыемстваў на агульную суму каля 110 млрд рублёў. Аналіз першых аўкцыёнаў паказаў, што попыт на дзяржакцыі сярэдніх беларускіх прадпрыемстваў больш існуе з боку айчынных гаспадарчых структур рознай формы ўласнасці. Па адным лоце акцый набылі на аўкцыёнах латышская фірма і расійская кампанія. Часткова ў складзе інвестараў беларускіх юрасобаў прысутнічаў расійскі і ўкраінскі капітал. Пэўная колькасць аўкцыёнаў не адбылася па прычыне недакладнасці трактоўкі агульных умоў правядзення аўкцыёнаў. Цяпер спрэчныя пытанні, якія тычацца алгарытма правядзення аўкцыёнаў, ужо выпраўлены.

Асобна Георгій Кузняцоў адзначыў, што канчатковае рашэнне аб прыватызацыі сапраўды буйных прадпрыемстваў, якія маюць стратэгічнае значэнне для дзяржавы, прымае кіраўнік краіны.

Цяпер спецыялісты рыхтуюць дакументы аб магчымым продажы пакета акцый Белтрансгаза. Вядуцца перамовы з расійскім Газпрамам, які мае намер набыць гэтыя каштоўныя паперы па рынкавым кошце, які цяпер складае каля 2,5 млрд доларaў. Магчыма, што пасля падпісання адпаведнага пагаднення паміж нашымі ўрадамі, грошы за акцыі Белтрансгаза будуць пералічаны беларускаму боку ўжо ў лістападзе.

Аб'яўлены адкрыты конкурс па продажы дзярждолі (51 працэнт) актываў аператара сотавай сувязі МТС. Георгій Кузняцоў паведаміў, што адзначыліся сур'ёзныя фірмы, якія жадаюць купіць гэты пакет каштоўных папер. Аднак існуе адно «але». Кампанія МТС з'яўляецца сумесным беларуска-расійскім прадпрыемствам. Расійскі бок згадзіўся з тым, што кантрольны пакет сумеснай кампаніі будзе прададзены, але з умовай — не прадаваць гэтыя актывы пэўным замежным фірмам. Цяпер якраз адна з гэтых кампаній і хоча набыць кантрольны пакет МТС па максімальным кошце. Перамовы па продажы актываў МТС працягваюцца. Георгій Кузняцоў выказаў думку аб тым, што доля дзяржавы ў складзе МТС будзе прададзена замежным інвестарам ужо сёлета.

Старшыня Дзяржмаёмасці ўдакладніў, што нейкіх новых дадатковых перамоў аб магчымым продажы Беларускалія цяпер не вядзецца.

Сёння спецыялісты камітэта сумесна з Мінпрамам вывучаюць актыўнасць інвестараў, якіх зацікавіў праект па распрацоўцы калійных угнаенняў Петрыкаўскага радовішча. Заяўкі ад патэнцыйных інвестараў прымаюцца да 21 кастрычніка. Рашэнне аб правядзенні конкурсу па гэтым праекце будзе прымацца Прэзідэнтам Беларусі.

У наступным годзе ў краіне павінна запрацаваць новая праграма народнай прыватызацыі дзейных прадпрыемстваў. Першай ластаўкай гэтай праграмы павінна стаць мерапрыемства па продажы насельніцтву каштоўных папер Мінскага завода ігрыстых він. Папярэдне будзе зроблены выпуск дадатковага пакета акцый гэтага прадпрыемства. Потым такія каштоўныя паперы будуць прадавацца жыхарам Беларусі на біржы.

Сяргей КУРКАЧ.

КОШТ ПРАЕЗДУ Ў ГРАМАДСКІМ ТРАНСПАРЦЕ МІНСКА ДА КАНЦА ГОДА МОЖА БЫЦЬ ПАВЫШАНЫ ЎДВАЯ

Аб гэтым паведаміў старшыня Мінгарвыканкама Мікалай Ладуцька на пасяджэнні мэрыі, перадае БЕЛТА.

«У Мінску неабходна павышаць кошт праезду да канца года ў 2 разы — да Br1850», — сказаў мэр сталіцы.

Як паведаміў карэспандэнту БЕЛТА дырэктар ДУ «Сталічны транспарт і сувязь» Валерый Шкуратаў, цяпер сабекошт адной паездкі ў грамадскім транспарце Мінска складае амаль Br2,5 тыс. Пры дзеючых тарыфах (Br950) насельніцтва аплачвае каля 45 працэнтаў гэтага кошту, астатнюю частку — гарадскі бюджэт. «Каб мінімізаваць вялікія затраты бюджэту, насельніцтва павінна плаціць за праезд амаль Br1,9 тыс. Таму падрыхтавана прапанова, якую сёння плануецца накіраваць на ўзгадненне ў Міністэрства эканомікі, аб павышэнні кошту праезду ў грамадскім транспарце сталіцы ўдвая паэтапна: у кастрычніку — да Br1,3 тыс., лістападзе — да Br1600, снежні — да Br1850», — сказаў Валерый Шкуратаў.

ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

21 кастрычніка 2011 года ў 14.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 4) адбудзецца пасяджэнне сёмай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання.

БЕЛАРУСКІ РУБЕЛЬ ЯШЧЭ ТРОШКІ ЎМАЦАВАЎСЯ

Пасля чарговай дадатковай сесіі на Беларускай валютна-фондавай біржы долар патанneў на 100 рублёў, еўра — на 10, а расійскі рубель — на 3.

Нагадаем, што сёння будзе вызначаны адзіны афіцыйны курс беларускага рубля.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

РЫНКАВЫЯ КУРСЫ НА 19 КАСТРЫЧНІКА:
Долар ЗША — 8790 беларускіх рублёў;
Еўра — 12160 беларускіх рублёў;
Расійскі рубель — 283 беларускія рублі.

КУРСЫ НЕКАТОРЫХ БАНКАЎ НА 19 КАСТРЫЧНІКА:

«Беларусбанк»: долар ЗША — 8300 і 8650; еўра — 11400 і 11900; расійскі рубель — 265 і 278.

«Белгазпрамбанк»: долар ЗША — 8000 і 8600; еўра — 11300 і 11900; расійскі рубель — 245 і 279.

«Дэльта Банк»: долар ЗША — 8000 і 9000; еўра — 11200 і 12400; расійскі рубель — 255 і 280.

БЕЛАРУСЬ ІМКНЕЦЦА СТАЦЬ ПРЫВАБНАЙ ТУРЫСТЫЧНАЙ ДЗЯРЖАВАЙ

Беларусь мае неабходны патэнцыял, каб стаць цікавай турыстычнай дзяржавай. Аб гэтым учора журналістам заявіў намеснік прэм'ер-міністра Анатоль Тозік. У Брэсцкай вобласці ён прымаў удзел у інвестыцыйным форуме «Белавежская пушча — турызм і рэкрэацыя», які праходзіць у Пружанскім і Камянецкім раёнах, перадае БЕЛТА.

Паводле яго слоў, вялікі патэнцыял для развіцця турыстычнага бізнэсу мае рэгіён Белавежскай пушчы. «Але не толькі вакол гэтага нацыянальнага парку мы павінны сканцэнтраваць намаганні ў сферы развіцця турызму. У нас сёння ёсць усё неабходнае, каб зрабіць Беларусь цікавай турыстычнай дзяржавай. Гэтаму садзейнічаюць і прыродна-кліматычныя ўмовы, нацыянальная культура», — адзначыў Анатоль Тозік.

Пры гэтым віцэ-прэм'ер падкрэсліў, што і ў далейшым пытанням развіцця сферы турызму ў краіне будзе ўдзяляцца значная ўвага. «Мы хочам і будзем рабіць усё неабходнае, калі трэба — ствараць дадатковыя ўмовы, каб турыстычная галіна стала адной з вядучых у Беларусі», — сказаў ён.

Намеснік прэм'ер-міністра выказаў упэўненасць, што сённяшні форум дасць значны штуршок для стварэння новых турыстычных аб'ектаў як у зоне Белавежскай пушчы, так і ў іншых рэгіёнах Беларусі. Ён адзначыў, што на інвестфоруме са сваімі інвестыцыйнымі прапановамі прысутнічаюць практычна ўсе рэгіёны Беларусі.

«Рабі, як мы!»

МОДА НА ВЯЛІКУЮ СЯМ'Ю, або Дзяцей шмат не бывае

З такім перакананнем выхоўваюць сваіх і прыёмных дзетак жыхары вёсак Дубіца і Гаўрыльчыцы Салігорскага раёна

СУМНА робіцца, калі прыязджаеш у вёску і бачыш там на кожным кроку апусцелыя хаткі, побач з якімі закінутыя сады, агароды... Шчыра кажучы, многія беларускія вёскі, у якіх некалі віравала жыццё і гучаў дзіцячы смех, выміраюць. Але, дзякуй Богу, не ўсе. На днях выпала магчымасць наведаць два ўнікальныя мястэчкі на мяжы Мінскай і Брэсцкай абласцей. У Дубіцы ды Гаўрыльчыцах з радасцю назірала супрацьлеглую, на першы погляд, фантастычную для нашага часу карціну. У якую хату ні зазірні — усё шматдзетныя сем'і. Калі Бог не даў сваіх дзетак альбо даў адно ці два дзіцяці, палешукі бяруць прыёмных. Што паказальна, Гаўрыльчыцкі сельсавет — рэкардсмен па колькасці прыёмных сем'яў у раёне.

«За 15 гадоў падарыла жыццё 10 дзеткам»

У адной з хат у Дубіцы мяне вітала шматдзетная маці Вера Майсяйчук разам з трыма статнымі сынамі Віктарам, Мікалаем і Іванам.

— Я ўжо хоць і на пенсіі, але, як бачыце, дагэтуль пры дзецях (усміхаецца). Не ўсе яшчэ ўладкаваныя. Віця завочна вучыцца на пятым курсе юрыдычнага факультэта БДУ. Коля вось нядаўна скончыў Салігорскі горна-хімічны тэхнікум і ўладкаваўся на «Белкалій», зараз дома ў водпуску. Ваня ў Слуцку вучыцца на шафёра, у хуткім часе пойдзе ў салдаты. Наша самая малодшая, Роза, бацькава любіміца, цяпер у школе, вучыцца ў 11 класе.

— А сам шматдзетны тата дзе?

— Якраз чакаем Іванавіча на абед. Ён зараз на працы, кармы жывёле развозіць.

Іван Іванавіч працуе ў мясцовай гаспадарцы трактарыстам ні многа ні мала 27 гадоў. Паводле слоў суседзяў, Іван Майсяйчук верны не толькі працы, але і сваёй вялікай сям'і. З любай жонкай разам ідуць па жыцці ўжо больш як 30 гадоў. Летась адзначылі круглую дату — жамчужнае вяселле.

СТАР. 2

Вера МАЙСЯЙЧУК разам з любым мужам і пакуль яшчэ нежанатымі сынамі.

МІЛІЦЫЯ ШУКАЕ ЦАРКОЎНЫХ ЗЛОДЗЕЯЎ

Адразу тры крадзяжы царкоўнай маёмасці здарыліся апошнімі днямі ў Магілёўскай вобласці.

У вёсцы Туркаўская Слабада Бабруйскага раёна абрабавалі царкву Пакрова Святой Багародзіцы. Прыхаджане прыходзяць сюды толькі ў святы, у астатні час царква зачыненая. Таму вядома толькі, што крадзеж адбыўся ў перыяд з 21 верасня па 14 кастрычніка. Вернікі ўбачылі, што ў царкве пабывалі зладзеі і праз вакно вынеслі два металічныя крыжы, 6 абразоў і дзве царкоўныя кнігі на суму болей за 4 мільёны рублёў.

З 14 на 15 кастрычніка, як паведамлялася, каштоўныя рэчы зніклі з храма ў гонар Святых царственных пакутнікаў у Магілёве.

Па дапамогу ў міліцыю звярнулася і старшыня прыходу храма Пакрова Прасвятой Багародзіцы, што будуецца ў Магілёве. Жанчына паведаміла, што з вагончыка, які месціцца каля будоўлі храма, з 17 на 18 кастрычніка знікла 1,5 мільёна рублёў. Зладзеі выбілі шыбу, узламалі металічную скрыню для ахвяраванняў і забралі ўсе грошы. Паводле ўсіх гэтых фактаў распачаты крымінальныя справы, вядзецца расследаванне.

Алена КАЗЛОВА.

У сталіцы прыярытэт будзе аддадзены будаўніцтву плоскасных ахоўных аўтастаянак

— Паркінгі сёння не запатрабаваныя з-за высокага кошту машына-месца, — адзначыў старшыня Мінгарвыканкама Мікалай Ладуцька. — Мы працягнем будаваць ахоўныя стаянкі, у якой колькасці — гэта іншае пытанне. Яны павінны быць эфектыўна размешчаны і даваць рэальную аддачу. Прыярытэт — адкрытым асфальтаваным пляцоўкам для захоўвання аўтамабіляў.

Ініцыятыўныя групы насельніцтва ўжо сёння гатовы стварыць кааператывы для абсталявання стаянак умяшчальнасцю да 100 машына-месцаў. А вось будаваць такія аб'екты дзяржаўнаму прадпрыемству нявыгадна. Таксама ў горадзе вядзецца работа па прыцягненні інвестараў для будаўніцтва ахоўных стаянак. Працягнецца практыка абсталявання парковачных месцаў у дварах з прыцягненнем сродкаў насельніцтва. Плануецца, што ў 2012 годзе жыхары шматпавярховікаў будуць пакрываць 40—45% гэтых выдаткаў.

«Мінск—Навіны».

ОАО «БЕЛАГРОПРОМБАНК»

В соответствии с условиями договоров срочного банковского вклада (депозита) ОАО «Белагропромбанк» сообщает об увеличении с 20 октября 2011 года до 45% годовых размера основной процентной ставки по договорам срочного банковского вклада (депозита) «Двадцатка», заключенным в период с 21.03.2011 по 19.10.2011 года.

Телефон Контакт-центра Банка – 136
8.00-20.00 – рабочие дни, 8.00-18.00 – выходные и праздничные дни.
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) – по тарифам операторов связи. Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2 выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

ТАБЛИЦА ПРОЦЕНТНЫХ СТАВОК ПО СРОЧНОМУ БАНКОВСКОМУ ВКЛАДУ (ДЕПОЗИТУ) ОАО «БЕЛАГРОПРОМБАНК»
с 20 октября 2011 г.

Сумма депозита, ед. валюты	Вклады (депозиты) с плавающими процентными ставками, % годовых — Срок, дни: 100	200	300	500	1 000	2 000	3 000	Вклады (депозиты) с фиксированными процентными ставками, % годовых — Срок, дни: 100	200	300	500	1 000	2 000
Белорусские рубли													
1 – 1 000 000	39,00	40,00	41,00	45,00	45,15	45,25	45,35	25,50	26,00	26,50	27,00	27,50	28,00
1 000 001 – 10 000 000	39,50	40,50	41,50	45,10	45,20	45,30	45,40	25,75	26,25	26,75	27,25	27,75	28,25
10 000 001 и более	40,00	41,00	42,00	45,15	45,25	45,35	45,50	26,00	26,50	27,00	27,50	28,00	28,50
Доллары США													
1 – 500	7,60	8,20	8,80	9,40	9,60	9,80	9,90	5,00	5,80	6,40	6,80	7,20	7,60
501 – 5 000	7,80	8,40	9,00	9,50	9,70	9,85	9,95	5,30	6,00	6,60	7,00	7,40	7,80
5 001 и более	8,00	8,60	9,20	9,60	9,80	9,90	10,00	5,60	6,20	6,80	7,20	7,60	8,00
Евро													
1 – 500	7,60	8,20	8,80	9,40	9,60	9,80	9,90	5,00	5,80	6,40	6,80	7,20	7,60
501 – 5 000	7,80	8,40	9,00	9,50	9,70	9,85	9,95	5,30	6,00	6,60	7,00	7,40	7,80
5 001 и более	8,00	8,60	9,20	9,60	9,80	9,90	10,00	5,60	6,20	6,80	7,20	7,60	8,00
Российские рубли													
1 – 15 000	8,60	9,20	9,80	10,40	10,60	10,80	10,90	6,00	6,80	7,40	7,80	8,20	8,60
15 001 – 150 000	8,80	9,40	10,00	10,50	10,70	10,85	10,95	6,30	7,00	7,60	8,00	8,40	8,80
150 001 и более	9,00	9,60	10,20	10,60	10,80	10,90	11,00	6,60	7,20	7,80	8,20	8,60	9,00

Подробные условия вклада «Линия роста» в газетах: «Советская Белоруссия» № 49 от 16.03.2006, «Звязда» № 50 от 04.03.2006, на сайте банка в сети Интернет – www.belapb.by и в офисах ОАО «Белагропромбанк».
Информация о размере процентов, выплаченных по привлеченным средствам физических лиц в течение последнего финансового года, – в офисах и на сайте банка.
Полная сохранность и возврат денежных средств физических лиц, размещенных в ОАО «Белагропромбанк», гарантируются государством и осуществляются в соответствии с законодательством РБ.
Сведения о выплаченных процентах по привлеченным средствам физических лиц в 2010 году в эквиваленте, тыс. бел. руб.:

	Январь	Февраль	Март	Апрель	Май	Июнь	Июль	Август	Сентябрь	Октябрь	Ноябрь	Декабрь	Итого
Срочные вклады (депозиты)	22 150 017	22 217 382	26 283 012	23 570 773	24 305 769	23 429 778	24 105 505	25 734 923	23 504 004	21 902 005	22 376 779	20 939 428	280 519 376
До востребования	109 717	112 167	154 527	147 164	130 440	153 009	175 320	208 613	207 977	209 476	234 959	253 869	2 097 239

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136
Время работы Контакт-Центра Банка: 8.00 - 20.00 - рабочие дни; 8.00 - 18.00 - выходные и праздничные дни.
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) - по тарифам операторов связи.
Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

БЕЛАРУСБАНК

220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32.
Тел.: (017) 200 18 31. Факс: (017) 226 47 50.
Телекс: 252408 PION BY.
E-mail: info@belarusbank.by
Интернет: http://www.belarusbank.by

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2011 г.
ОАО «Акционерный Сберегательный банк «Беларусбанк»
(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	2011 г.	2010 г.
1	2	3	4	5
1	**АКТИВЫ**			
2	Денежные средства	1101	921491,4	536357,5
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102	892,5	4258,4
4	Средства в Национальном банке	1103	13993477,3	4187495,6
5	Средства в банках	1104	3735140,7	1662140,3
6	Ценные бумаги	1105	6040337,8	1928573,4
7	Кредиты клиентам	1106	51646601,9	35619318,6
8	Производные финансовые активы	1107	1854550,4	244511,4
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108	229096,9	199037,5
10	Основные средства и нематериальные активы	1109	1017713,1	812187,6
11	Имущество, предназначенное для продажи	1110	508,4	228,5
12	Прочие активы	1111	305733,6	212193,3
13	ИТОГО активы	11	79745544,0	45406302,1
14	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**			
15	Средства Национального банка	1201	11779011,7	9920607,6
16	Средства банков	1202	10151882,6	4422599,3
17	Средства клиентов	1203	45568908,4	24229574,9
18	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204	6516817,3	2779571,2
19	Производные финансовые обязательства	1205	-	41,3
20	Прочие обязательства	1206	292495,0	195127,1
21	ВСЕГО обязательства	120	74309115,0	41547521,4
22	**КАПИТАЛ**			
23	Уставный фонд	1211	3287552,6	2287552,6
24	Эмиссионный доход	1212	-	-
25	Резервный фонд	1213	368263,0	266156,6
26	Фонд переоценки статей баланса	1214	386973,9	342197,4
27	Накопленная прибыль	1215	1393639,5	962874,1
28	ВСЕГО капитал	121	5436429,0	3858780,7
29	ИТОГО обязательства и капитал	12	79745544,0	45406302,1

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 октября 2011 года
ОАО «Акционерный Сберегательный банк «Беларусбанк»
(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	2011 г.	2010 г.
1	2	3	4	5
1	Процентные доходы	2011	5141708,1	3077413,9
2	Процентные расходы	2012	3787759,3	2219635,9
3	Чистые процентные доходы	201	1353948,8	857778,0
4	Комиссионные доходы	2021	682650,0	393020,3
5	Комиссионные расходы	2022	294909,2	101259,4
6	Чистые комиссионные доходы	202	387740,8	291760,9
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203	3660,6	1254,5
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	25941,4	4409,4
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205	(2517959,7)	74680,1
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206	2524583,9	32605,4
11	Чистые отчисления в резервы	207	261211,3	140251,0
12	Прочие доходы	208	132717,1	70226,5
13	Операционные расходы	209	939417,9	712428,0
14	Прочие расходы	210	147958,7	88363,7
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211	562045,0	391672,1
16	Налог на прибыль	212	145676,6	63405,4
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2	416368,4	328266,7

И.о. Председателя Правления **С.П. Писарик**
Главный бухгалтер **И.П. Лысоковская**

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

ДЗЁРЗКІ ЗЛАЧЫНЦА СТАЎ ПРЫЧЫНАЙ САПРАЎДНАЙ ПАГОНІ НА СТАЛІЧНЫХ ВУЛІЦАХ

Затрымаць яго ўдалося, дзякуючы мінчаніну, які не пашкадаваў свайго аўтамабіля

Гісторыя, вартая сцэнара галівудскага баевіка, разгарнулася на сталічных вуліцах. Мінчанін дапамог аператыўнікам затрымаць злачынцу, а само затрыманне суправаджалася пагоняй на аўтамабілях.

— Нашы аператыўнікі ведалі, што ў «Маздзе», прыпаркаванай непадалёк ад Фрунзенскага выканкама, знаходзіцца злачынца. Да машыны падышлі наш супрацоўнік у цывільным і супрацоўнік ДАІ і папрасілі мужчыну выйсці, — расказвае прэс-афіцэр Фрунзенскага РУУС сталіцы Ала Галубовіч.

Але падзеі развіваліся нечакана — злачынца не збіраўся так проста здавацца. Гэта аператыўнікі лічылі, што ўсе шляхі для адступлення адрэзаныя, мужчына думаў інакш. Ён уключыў заднюю перадачу і, ударыўшы суседнюю машыну, выехаў на тратуар. Пешаходы, якім у гэты час не пашчасціла там знаходзіцца, вымушаныя былі разбягацца ў розныя бакі ад «Мазды», якая імкліва набірала хуткасць. Сярод гэтых людзей быў і 51-гадовы Віктар Лапартуеў.

— Я па справах быў у выканкаме, а калі выйшаў на вуліцу, убачыў, як па тратуары нясецца аўтамабіль, а за ім — міліцыянер, — расказвае Віктар Віктаравіч.

Мужчына прапанаваў аператыўнікам сесці ў сваю машыну, і пачалася пагоня. Машыну ўдалося спыніць толькі на праспекце Жукава (каля 5 прыпынкаў грамадскага транспарту), калі на шляху ўцекача ўзнік выкліканы патруль ДАІ. На 21-гадовага затрыманага толькі па лініі ДАІ афармілі 7 пратаколаў, у прыватнасці, за ДТЗ і з'езд з месца здарэння, стварэнне аварыйнай сітуацыі і рух па тратуары. Малады чалавек раней быў асуджаны за хуліганства, а зараз абвінавачваецца па крымінальнай справе. Яго маці знайшла ў банкамаце пластыкавую картку, забытую жанчынай, і аддала яе сыну, каб той вярнуў у банк. Аднак хлопец скарыстаўся ёй па-свойму — набыў для сябе ў магазінах тавараў на 4 мільёны рублёў. Цяпер яго чакае доўгі роздум у СІЗА. А вось Віктара Лапартуева, які не пашкадаваў часу і свайго аўтамабіля, кіраўніцтва Фрунзенскага РУУС за актыўную грамадзянскую пазіцыю ўзнагародзіць.

Віктар Віктаравіч працуе на прадпрыемстве «Гаражы, аўтастаянкі і паркоўкі» і выхоўвае траіх дзяцей.

— На маім месцы так паступіў бы кожны, — сціпла растлумачыў ён пасля свой учынак міліцыянерам.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 20.10.2011 г. (для б/н разлікаў)			
▼ 1 долар ЗША	5 712,00	1 чэшская крона	317,86
▲ 1 еўра	7 892,84	1 польскі злоты	1 823,99
1 латвійскі лат	11 203,30	▼ 1 расійскі рубель	184,70
1 літоўскі літ	2 288,83	1 украінская грыўня	713,91

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрбанк РФ	
USD	30,9257
10 UAH	38,6475
10000 BYR	53,9716
EUR	42,7084

Агентства Уладзіміра Грацкова

Парламенцкі дзённік

СУД ДЫ СПРАВЫ

Рэфармаванне сістэмы юстыцыі абмеркавалі на дэпутацкім семінары

«Прашу ўсіх устаць, суд ідзе». Так пачынаюць кожнае пасяджэнне служкі Фемиды. Атмасфера ў зале суда халодная: не толькі па тэмпературы паветра, але і па знешнім убранні. Змушае трымацца ў рамках. Усё строга функцыянальна, нічога лішняга. У тым ліку і «клетка» для падсуднага — абавязковае патрабаванне апаратыўнікаў: хто знаходзіцца пад следствам, павінен быць ізаляваны і на працэсе.

Чалавек за кратамі з яхіднай ухмылкай слухае расповед хлопца, які ў матэрыялах справы значыцца як «пацярпелы». Ад рабунку і пабояў. Шкадаванне і спагада да ахвяры пакрысе змяняюцца цвярозымі ацэнкамі, што і сам ён не анёл. На добрым падпітку «захацеў працягу» — проста на аўтобусным прыпынку запрасіў на піва мінакоў і... апрытомнеў у незнаёмым месцы. Мыў падлогу, «падахвочаны» кухталямі, і так служаўся, што не рабіў спроб уцячы і сам аддаў свой ноўтбук... Расказвае і ледзь не плача.

Падсудны, у якога пры затрыманні знайшлі наркотыкі, агучвае сваю версію ціха, без эмоцый і з абсалютна іншай фабулай. Гэта будзе далёка не першая яго судзімасць. Ён не так даўно амніставаны. Дэпутаты маглі пабачыць на свае вочы, каго здараецца вызваляць, падпісваючы закон аб амністыі... Для іх лепшага знаёмства з судовай сістэмай, чым пабываць на крымінальным працэсе, і ўявіць цяжка. Дэпутат Валянціна Лукашонак уразілася ўбачаным і прыйшла да высновы, што на такія судовыя працэсы трэба прыводзіць непаўналетніх. Каб ім навука была. Маўляў, няхай паглядзяць, да чаго можа прывесці распіцэ піва ў дварэ.

Мяне ж больш уразіла, наколькі чалавека можа апанаваць страх, што ён не спрабуе нават супраціўляцца. Так, у некаторых сітуацыях ты можаш аказацца бяссільным. Але як пра гэта даведацца, калі нават не спрабаваць?..

Падзеі, якія сталі прадметам судовага разбору, адбыліся ў лістападзе. Зараз на дварэ кастрычнік. Правасуддзе — справа не аднаго дня. Ды і суддзі яшчэ загружаныя будзь здароў. Звяртацца ў суд для беларусаў стала нормай. Суддзі даводзіцца мець справу недзе з сотняй матэрыялаў за месяц. Гэта, бадай, адна з самых галоўных праблем сучаснай сістэмы. Бо толькі дурань можа не ўсведамляць, што з-за колькасці пачынае цярпець якасць, ды і аператыўнасць таксама. Як аптымізаваць работу судоў і зрабіць яе больш эфектыўнай, абмяркоўвалі сумесна дзве галіны ўлады — заканадаўчая і судовая. Такі тандэм цалкам лагічны: першыя прымаюць законы, па якіх працуюць другія.

Апошнім часам «праведзена значная работа па рэалізацыі Канцэпцыі судова-прававой рэформы», канстатуе **старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА.** «На прынцыпова новае судаводства перайшлі агульныя і гаспадарчыя суды. У поўнай меры рэалізавана права грамадзян на судовую абарону ў адміністрацыйным судаводстве. Сёлета зроблены яшчэ адзін важны крок ва ўмацаванні права грамадзян на судовую абарону. Пленум Вярхоўнага суда заканадаўча надзелены функцыяй наглядной інстанцыі па грамадзянскіх і крымінальных справах». Унесеныя змены ў Грамадзянскі, Гаспадарчы працэсуальны і Грамадзянскі працэсуальны кодэксы павінны аптымізаваць парадак выканання судовых рашэнняў, разлічваюць заканадаўцы. А прыняты закон «Аб трацейскіх судах» паслужыць скарачэнню нагрузкі на агульныя і гаспадарчыя суды.

Але відавочна, што патрэбна яшчэ мноства пераўтварэнняў.

— У ліку ключавых задач — павышэнне даступнасці і якасці правасуддзя, скарачэнне тэрмінаў разгляду судовых спраў і выканання прынятых па іх рашэнняў, — падкрэслівае спікер. — Асаблівую ўвагу неабходна надаць пытанням прававога забеспячэння судовага працэсу, дэбюракратызацыі судаводства, зніжэнню нагрузкі на суды, аптымізацыі мер крымінальнай адказнасці і, вядома ж, павышэнню статусу судзейскіх працаўнікоў.

Падчас восеньскай сесіі парламентарыі плануюць разгледзець блок законапраектаў, скіраваных на пашырэнне паўнамоцтваў судоў другой інстанцыі пры разглядзе крымінальных спраў, увядзенне працэдуры завочнага разбору грамадзянскіх спраў і выключэнне з судовай юрысдыкцыі бясспрэчных грамадзянскіх спраў. А ў перспектыве ім даводзіцца працаваць над праектамі заканаў аб канстытуцыйным судаводстве і аб медыяцыі, якія павінны паступіць у парламент ужо сёлета.

Пра нагрузку на суддзяў казаў і **старшыня Вярхоўнага Суда Беларусі Валянцін СУКАЛА.** «Мы не можам павялічваць колькасць суддзяў, трэба праходзіць на сучасны ўзровень арганізацыі». У сферы крымінальнага правасуддзя, якая традыцыйна карыстаецца павышанай грамадскай увагай, гэта можа быць увядзенне элементаў апеляцыі. «Прадугледжваецца бязбольны пераход ад касацыі да апеляцыі», — адзначае старшыня Вярхоўнага Суда. Уважліва прааналізаваны вопыт калег на постсавецкай прасторы паказвае: такі інструмент «дазваляе эфектыўна і хутка выпраўляць дапушчаныя судовыя памылкі». Згадваў ён і тэндэнцыі да гуманізацыі крымінальнага заканадаўства. Будучыня, маўляў, не за каральнымі, а за выхаваўчымі захадамі. А пакаранні ў выглядзе пазбаўлення волі за няцяжкія злачынствы павінны адысці ў нябыт.

Яшчэ адзін рэзерв зніжэння нагрузкі на суддзяў — спыненне спраў на дасудовай стадыі. Такіх за дзевяць месяцаў сёлета было каля трох тысяч. Аднак лічба, на думку старшыні ВС, магла б быць большай.

У сферы грамадзянскага правасуддзя тым часам пастаянна пашыраецца юрысдыкцыя. Але кіраўнік Вярхоўнага Суда заклікае заканадаўцаў пры прыняцці падобных рашэнняў улічваць вопыт практыкаў. Так, на яго думку, шэраг спраў няма патрэбы вырашаць у судзе: спагнанне запазычанасці па банкаўскіх крэдытах, камунальных паслугах, напрыклад. Згадаў В. Сукала і пра магчымасці прымірэння без пачатку вытворчасці па справе. Гаспадарчыя суды, паводле яго звестак, ужо назапасілі значны вопыт падобнага вырашэння спраў.

Абысцися без судовага разбору можна было б і ў многіх выпадках адміністрацыйных парушэнняў. Такое папулярнае, напрыклад, як распіццё спіртных напояў на дварэ. Калі вінаваты нічога не аспрэчвае, нашто задзейнічаць судаводства, запускаць няпросты механізм, весці пратакол і гэтак далей?!

Новыя спосабы арганізацыі судовага працэсу прадугледжваюць і тэхнічны бок справы. Ці трэба казаць, што папяровы пратакол — сёння ўжо проста архаізм? «Дзяўчына, якая запісвае, можа забяспечыць фіксацыю толькі 60 адсоткаў таго, што адбываецца ў зале суда», — прызнае Валянцін Сукала. Аўдыёзапіс забяспечвае не толькі дэталёвую фіксацыю, але і «выключае спрэчкі па пратаколе, дысцыплінуе ўдзельнікаў працэсу», мяркуе старшыня Вярхоўнага Суда. Дыктафонам свабодна можа карыстацца любы ўдзельнік працэсу. З відэазапісам, на жаль, у дзейным заканадаўстве ёсць істотныя абмежаванні: калі хоць адзін з удзельнікаў працэсу супраць, відэа не здымаецца...

Павысіць якасць правасуддзя, на думку старшыні ВС, таксама спецыялізацыя суддзяў. «Магчыма, прыйдзем да стварэння спецыялізаваных судоў, — не выключае В. Сукала. — Ювенальная ці адміністрацыйная юстыцыя, напрыклад». Якасць правасуддзя ў многім залежыць ад якасці нацыянальнага заканадаўства, канстатуе кіраўнік Вярхоўнага Суда. «Нам хацелася б папрацаваць ва ўмовах стабільнага заканадаўства», — кажа ён. Не паспеў суддзя засвоіць прынятыя папраўкі ў той ці іншы кодэкс, як ужо з'явіліся новыя.

Адно з самых прыкметных воку простага абывацеля пераўтварэнняў, якія могуць чакаць судовую сістэму, — з'яўленне прысяжных засядацеляў. Ці варта дапускаць непрафесіяналаў у храм Фемиды, і калі так, то як усё павінна функцыянаваць?

— Праблема прадстаўнікоў народа ў судах не новая. На яе існуюць палярныя погляды і меркаванні, — досыць стрымана каментуе такую перспектыву старшыня Вярхоўнага Суда.

Ён звяртае ўвагу на паходжанне беларускай прававой сістэмы ад раманагерманскай, якой уласцівая наяўнасць прафесійнага суддзі поруч з калегіяй прысяжных. У адрозненне ад, скажам, англасаксонскай, дзе калегія працуе самастойна.

— Будзем думаць аб прымальных варыянтах для нашай сістэмы правасуддзя, — рэзюмуе кіраўнік ВС, выступаючы на семінары.

Калі рабіў экскурс дэпутатам, у нефармальнай абстаноўцы ён падзяліўся з імі некаторымі папярэднімі развагамі. Напрыклад, што на ўзроўні раённых судоў калегія прысяжных не плануецца. Суд прысяжных будзе, відаць, па значных справах у абласных і вярхоўных судах. А калегія будзе складацца, верагодна, з сямі прысяжных. Але ж зразумела, што справа няпростая, яна пакуль у распрацоўцы, і якім будзе вынік, сёння сказаць цяжка.

Сваім бачаннем такой рэформы мы папрасілі падзяліцца **старшыню Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па заканадаўстве і судова-прававых пытаннях Мікалая САМАСЕЙКУ,** таксама прафесійнага суддзю ў мінулым.

— Сыходзячы з эканамічнай сітуацыі, я мяркую, што суды прысяжных не будуць уведзены ўжо заўтра. Вядома ж, гэта сусветныя стандарты правасуддзя, дэмакратычны інстытут. І, натуральна, у будучыні — далёкай ці не, я не бярусь прагназаваць — ён, вядома ж, будзе прысутнічаць у судовай сістэме Беларусі. У якім выглядзе? У тым класічным, які мы бачым па фільмах — 12 прысяжных засядацеляў? Ці меншая колькасць? Магчыма, інстытут народных засядацеляў, які сёння мае месца і, праўду кажучы, не апраўдвае сваю функцыю, будзе трансфармаваны нейкім чынам... Асабіста я схіляўся б усё ж да прафесійных суддзяў: каб судовыя пасяджэнні асаблівай значнасці — напрыклад, звязаныя са справамі непаўналетніх, выключнай мерай пакарання — праводзілі ўсё ж такі прафесіяналы.

Можа, для нашай памяркоўнай краіны залатая сярэдзіна і лепш — каб былі і суддзя, і прысяжныя засядацелі. Але калі ад чалавечага фактару нікуды не падзенешся, дык, можа, лепш, каб гэта ўсё ж быў не адзін чалавек?

Ала МАЧАЛАВА.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПРАГНАЗУЕ РЭЗКАЕ ЗНІЖЭННЕ КУРСУ ДОЛАРА ПАСЛЯ ПАЧАТКУ РАБОТЫ АДЗІНАЙ СЕСІІ НА ВАЛЮТНАЙ БІРЖЫ

Аб гэтым ён заявіў на нарадзе 18 кастрычніка, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

«Майце на ўвазе, што курс долара такі не будзе. Цяпер звядзём абедзве сесіі ў адну літаральна з дня на дзень, і курс долара гэты абваліцца. Калі ўжо шчыра гаварыць, мы высокі курс долара і падтрымлівалі, не ўмешваючыся, дзесьці акуратна дзейнічаючы», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

«Я ж бачу, хто робіць заяўкі на гэтыя долары, на замежную валюту. Гэта ў асноўным так званыя індывідуальныя прадпрымальнікі і тыя, хто ўвозіць імпарт некрытычнага парадку. Ну дык чаму ім долар танны прадаваць? Але галоўнае — гэта тое, што прадпрыемствы цяпер не прадаюць валюту, яны чакаюць адзінага курсу, які ён складзецца. І як толькі выльецца на рынак гэта ўся наяўная валюта, долары і еўра, якія мы аддаём цяпер на закупку газу і гэтак далей, то прапанаванне па долару будзе вельмі высокае, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — І калі будзе адзін курс, прадпрыемства 30 працэнтаў абавязкова прадае, — па гэтай цане прадаў, па гэтай жа цане можна і купіць валюту, — зусім будзе іншы курс».

«Таму гэта таксама трэба мець на ўвазе, а не прыстасоўвацца да курсу, які сёння 8 ці 9 тысяч», — папярэдзіў беларускі лідар.

Прэзідэнт Беларусі не бачыць падстаў для далейшага значнага росту цэн на прадукты харчавання

«Многія гавораць: цэны, цэны растуць, давай заціскай. Ні ў якім выпадку гэтага нельга рабіць цяпер. Так, трэба кантраляваць, каб «разбэшчанасці» не было, але ў нас нават не ў «разбэшчанасці» справа. У нас цэны такога ўзроўню, што яны ўжо ўперліся ў попыт насельніцтва. Далей ужо цэны не могуць так расці», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«Мы, фактычна, жывём у нейкім ажыятажна-крызісным свеце, калі паглядзець навокал. І тое, што мы перажылі, — гэта нам плюс. Мы ўжо гэта прайшлі. Наш народ гэта прайшоў ужо, ён гэта вытрымаў, выцерпеў. Ім давядзецца прайсці. Без выдаткаў, як мы бачым, не пройдзем», — прызнаў Прэзідэнт.

«Ну так, мы можам заўтра спыніць цэны. А што такое цана на малако, мяса? Гэта зарплата сялян. І мы ўпершыню ўраўнавалі іх фактычна. Ужо да мяне прэтэнзіі не трэба прад'яўляць па цэнавым нейкім фактары. Так, там дзесьці нейкая ялавічына — але гэта дробязі. І той, хто не скарыстаецца цяперашняй сітуацыяй, сялян я маю на ўвазе, — бяда будзе. І ўжо Міхаіл Русы гаварыць, што з выплатай крэдытаў больш-менш нармальная сітуацыя. Гэта значыць мы далі магчымасць нашым таваравытворцам справіцца з гэтай закрэдытаванасцю. Гэта таксама вялікая справа», — падкрэсліў беларускі лідар.

«Але ў нас вельмі хочуць узбудзіць народ, каб перавярнуць краіну. Першая спроба была, не атрымалася, так званы «народны сход», — 120 чалавек сабраліся. Людзі гэта разумеюць, але мы ім павінны паказваць перспектыву. Яны павінны бачыць, што цяпер можна ўсё закруціць, але заўтра пустыя будуць паліцы. Ні ў якім выпадку гэтага нельга рабіць», — лічыць Аляксандр Лукашэнка.

Звяртаючыся да кіраўнікоў рэгіёнаў, Прэзідэнт заклікаў іх вырашаць пытанне павышэння дабрабыту грамадзян не толькі на ўзроўні Прэзідэнта: «Давайце не толькі на маім узроўні ўказам павышаць, але і там, на месцы. Вы лепш ведаеце, каго падтрымаць. Ну і дырэктараў прымушайце, каб яны ў гэты час падтрымлівалі сваіх рабочых, у залежнасці ад прадукцыйнасці працы».

Аляксандр Лукашэнка павіншаваў з юбілеем народную артыстку РСФСР Жанну Болатаву

Як адзначыў кіраўнік дзяржавы, творчасць актрысы складае адну з самых яркіх старонак у гісторыі савецкага і расійскага тэатра і кіно. «У нашай краіне тысячы паклоннікаў ведаюць і любяць Вас як выдатную актрысу, якая прысвяціла сябе справе маральнага ўзвышэння чалавека, сцвярджэнню ідэалаў гуманізму і прыгажосці. Упэўнены, што Ваша майстэрства і ў далейшым будзе садзейнічаць умацаванню духоўнага адзінства і развіццю культурных сувязяў брацкіх народаў», — гаворыцца ў віншаванні. Аляксандр Лукашэнка пажадаў Жанне Болатавай здароўя, шчасця, натхнення, новых поспехаў і радасных сустрэч з удзячнымі гледачамі.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Цяжарнасць — не перашкода для звальнення

Твае правы

ПАКУЛЬ я працавала на месцы спецыяліста-жанчыны, якая пайшла ў дэкрэтны адпачынак, — сама зацяжарала. Ці могуць мяне цяпер звольніць, калі асноўны супрацоўнік вяртаецца з дэкрэтнага водпуску?

СЕЛЯДЗЕЦ М.І., *г. Мінск.*

Могуць, патлумачыла **кансультант аддзела працоўнага заканадаўства юрыдычнага ўпраўлення Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Таццяна РАХУБА.**

Тэрміновы працоўны дагавор у гэтым выпадку заключаецца на перыяд водпуску асноўнага работніка. Пры прыёме на працу работніка на перыяд выканання абавязкаў часова адсутнага работніка, за якім у адпаведнасці з Працоўным кодэксам Рэспублікі Беларусь захоўваецца месца працы, з працаўніком заключаецца тэрміновы працоўны дагавор (пункт 4 часткі 1 артыкула 17 Працоўнага кодэкса). Гэта абумоўлена тым, што працоўны дагавор на час выканання абавязкаў часова адсутнага работніка, за якім захоўваецца месца працы, з'яўляецца разнавіднасцю тэрміновага працоўнага дагавора. У адпаведнасці з часткай трэцяй артыкула 38 Працоўнага кодэкса, працоўны дагавор, заключаны на час выканання абавязкаў часова адсутнага работніка, спыняецца з дня, які папярэднічае дню выхаду гэтага работніка на працу. Звальненне ў гэтым выпадку ажыццяўляецца на падставе пункта 2 артыкула 35 Працоўнага кодэкса ў сувязі з заканчэннем тэрміну працоўнага дагавора. Адпаведна ў загадзе аб звальненні і працоўнай кніжцы работніка робіцца спасылка на вышэйназваны пункт.

На гэтай падставе можа быць звольненая любая катэгорыя работнікаў, у тым ліку цяжарныя жанчыны і жанчыны, якія знаходзяцца ў сацыяльным водпуску па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім узросту 3 гадоў. Гарантыі па падаўжэнні, заключэнні новага кантракта з цяжарнымі жанчынамі, жанчынамі, якія знаходзяцца ў сацыяльных водпусках па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім узросту 3 гадоў, прадугледжаныя пунктам 2 Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь №180. А на тых, хто працуе па тэрміновым працоўным дагаворы, яны не распаўсюджваюцца.

Падрыхтавала Інга МІНДАЛЁВА.

Папраўкі ў закон аб органах дзяржбяспекі Беларусі не будуць прыняты ў аўтарскім варыянце

На разглядзе ў Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі знаходзіцца законапраект аб змяненнях і дапаўненнях у закон «Аб органах дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь». Як паведаміў БЕЛТА член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па нацыянальнай бяспекі Алег Кот, праект закона не будзе прыняты ў аўтарскім варыянце, ён можа быць істотна зменены.

Субяседнік падкрэсліў, што «неабходна ўлічыць пазіцыю ўсіх зацікаўленых, на выхадзе ў першапачатковым выглядзе можа застацца толькі 50-60 працэнтаў дакумента». «Гаварыць больш падрабязна аб гэтым законапраекце лічу заўчасным. Пакуль ёсць толькі адно меркаванне — меркаванне распрацоўшчыка», — растлумачыў дэпутат. Магчыма, да канца асенняй сесіі законапраект будзе прыняты ў першым чытанні.

Карэкціроўка закона «Аб органах дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь» звязана са змяненнем заканадаўчай базы, у прыватнасці, у рэспубліцы прыняты законы аб статусе ваеннаслужачых, аб дзяржаўных сакрэтах і інш. Акрамя таго, законапраект 2005 года ўжо не адпавядае сучасным патрабаванням. Апублікаванне аўтарскага варыянта законапраекта ў інтэрнэце супаводжалася бурным абмеркаваннем. У ім удакладнены правы і абавязкі супрацоўнікаў органаў дзяржаўнай бяспекі, якія структуры належаць да органаў дзяржбяспекі. Значныя змяненні ўнесены ў артыкулы аб контрразведвальнай дзейнасці, аб умовах і межах прымянення фізічнай сілы, спецыяльных сродкаў, зброі, баявой і спецыяльнай тэхнікі, аб камплектаванні органаў дзяржаўнай бяспекі. Закон «Аб органах дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь» дапоўнены новымі артыкуламі аб прымяненні фізічнай сілы, спецыяльных сродкаў, выкарыстанні зброі, баявой і спецыяльнай тэхнікі, аб тым, хто можа быць супрацоўнікам і цывільным персаналам органаў дзяржаўнай бяспекі.

Абзац

◢ Мінскія загсы за студзень—верасень г.г. зарэгістравалі 192 двойні і 5 тройняў. Як сведчыць статыстыка, пры нараджэнні дзіцяці сярэдні ўзрост бацькі складае па краіне 28-29 гадоў, маці — 25-26 гадоў. Самай маладой маме, якая зарэгістравала дзіця, споўнілася 15 гадоў, а самаму маладому бацьку — 16. Самым старым бацькам стаў 73-гадовы мінчанін, а самай «узроставай» маці — 52-гадовая жанчына.

◢ 18 кастрычніка ў вёсцы Квасоўка Гродзенскага раёна ў аварыю трапіла група з пяці студэнтаў, якія вярталіся з практыкі. У канцы вёскі на абазначаным скрыжаванні «Хонда» са студэнтамі пайшла на абгон «ЗІЛа», які паварочваў налева. Легкавік зачапіў грузавую машыну, праехаў па інерцыі каля ста метраў, потым зляцеў у кювет і, зламаўшы некалькі дрэў, перакуліўся. У аварыі загінула 21-гадовая пасажырка. Студэнты, што трапілі ў аварыю, вучыліся ў Гродзенскім аграрным універсітэце.

Поўны абзац

◢ Зуб Джона Ленана выстаўлены на аўкцыён. У лістападзе ў брытанскім горадзе Стокпарт пройдзе аўкцыён, на якім у ліку іншых будзе выстаўлены незвычайны лот — зуб легендарнага саліста The Beatles. Музыкант падараваў зуб сваёй хатняй работніцы ў канцы 1960-х, пасля таго як уласнаручна вырваў яго на кухні. Падарунак прызначаўся яе дачцэ, якая была фанаткай The Beatles. Да зуба прыкладаецца пісьмовае пацвярджэнне сапраўднасці. Арганізатары аўкцыёну спадзяюцца выручыць за зуб Ленана не менш за £10000 і не выключаюць, што кошт такога ўнікальнага лота можа дасягнуць шасцізначнай лічбы.

◢ З сайта пра кіно патрабуюць $1 млн за выдаванне ўзросту актрысы. Рэсурс Internet Movie Database адмовіўся зняць дату нараджэння амерыканскай актрысы нават тады, калі яна сама папрасіла аб гэтым. Абнародаванне ўзросту, лічыць актрыса, можа паставіць крыж на яе кар'еры. Ёй нядаўна споўнілася 40 гадоў, аднак выглядае яна нашмат маладзей за свой узрост, а таму не можа іграць равесніц. Між тым, пасля апублікавання ў інтэрнэце звестак пра ўзрост ёй прапануюць ролі 40-гадовых жанчын. Прозвішча актрысы не называецца, вядома толькі, што яна пражывае ў штаце Тэхас. Справа знаходзіцца ў судзе.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ДОМ ПАД ВІДЭАНАЗІРАННЕМ

З 17 па 23 кастрычніка на тэрыторыі Мінска праводзіцца прафілактычная акцыя «Дамавік», скіраваная на выяўленне правапарушэнняў у жылых памяшканнях і грамадскіх месцах, перш за ўсё, у пад'ездах і на дваровых тэрыторыях. Як паведамляюць у Першамайскім РУУС г. Мінска, на тэрыторыі гэтага раёна, напрыклад, будуць праводзіцца прэзентацыі абсталявання тэрыторый дамоў шматпавярховай забудовы сістэмамі відэаназірання, а кватэр грамадзян — тэхнічнымі сродкамі аховы.

Святлана БАРЫСЕНКА.

З МАСАЖАМ ЗАТРЫМКА

На дарозе паміж населенымі пунктамі Семяховічы і Невяль (Пінскі раён) быў затрыманы мікрааўтобус «Форд-Транзіт», у якім выявілі партатыўныя масажоры і парагенератары, нелегальна перапраўленыя праз дзяржаўную мяжу. Кантрабанда разам з мікрааўтобусам пацягнула на 475 млн рублёў.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

№ п/п	Название и описание предметов	Оценка, бел. руб. (с учетом НДС)
1.	Домашний кинотеатр BBK DK1010S	308 880 рублей
2.	Пылесос CLATRONIC 1400 BT	247 320 рублей
3.	Вытяжной шкаф PATIO 90H 650	779 760 рублей
4.	Вытяжной шкаф ELICA CUBE ix/a/60	918 000 рублей
5.	Домашний кинотеатр Sony Dav DZ 300	1 193 400 рублей
6.	Видеоплеер DVD LG DK 764	178 000 рублей
7.	Система акустическая Velas	74 520 рублей
8.	Газовая панель Ariston TD 640	857 520 рублей

Время проведения торгов — 04.11.2011 года в 11.00 в хозяйственном суде Витебской области, каб. 318.

Собственник имущества: Билал М.Д. (Витебск, пр-т Победы, 17, кв. 83-84).

Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано:

1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.

2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903000023 в 201 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Витебск, код 259, УНН 300007670, не позднее 10 ч. 30 м. 04.11.2011.

Минимальная величина первого шага — 5% от первоначальной стоимости лота.

В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

По вопросам проведения и участия в торгах следует обращаться в отдел исполнения постановлений хозяйственного суда Витебской области по телефонам: тел./факс. **(80212) 49 13 45, (8 029) 366 40 15 (судебный исполнитель Бураков Игорь Вячеславович)** и на сайт хозяйственного суда Витебской области http://vitebsk.court.by/.

СПК «Агрофирма «Лучники» извещает о проведении повторного открытого аукциона о продаже объектов недвижимости:

Здание коровника, расположенное: Минская обл., Слуцкий р/н, Серяжский с/с, д. Павловка общей площадью — 1404,4 м², инв. № 01/502, начальная цена — 15979425 белорусских рублей с НДС. Год постройки — 1977.

Условия продажи: без условий.

Условия пользования: объект продается в собственность.

Размер задатка для участия в аукционе — в размере 10% от начальной цены перечисляется на расчетный счет № 3012755030015 ЦБУ г. Слуцк отд. ОАО «БПС-Банк» г. Солигорск, ул. Ленина, 18, код 321. УНП 600043549, ОКПО 03819671. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней с даты проведения аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Объект недвижимости является собственностью СПК «Агрофирма «Лучники».

Срок подачи заявления на участие в аукционе с момента опубликования до 10.00 1 ноября 2011 года по адресу: Минская обл., Слуцкий р-н, д. Лучники, ул. Цыкова, 5а, каб. № 6 (здание администрации).

Дата, время, место проведения аукциона: 5 ноября 2011 года в 11.00 по адресу: Минская обл., Слуцкий р-н, д. Лучники, ул. Цыкова, 5а, актовый зал (здание администрации).

Справки и дополнительная информация по телефону: 801795 96 860, Т/Ф 801795 96 105, 8 029 1111220.

ФСООО «Белкоопстрах» в г. Минске информирует о признании недействительными:

- страховые свидетельства по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории РБ серии ВС № 2705744, 2730204, 2774354, 2757462, 2772191, 1935445, серии АЖ № 6679275, 5782856, 5782875, 6713306, 5863450, 9698795, 9713161.

- квитанции о приеме наличных денежных средств формы 1-СУ серии КС № 0602542, (0629377-0629378), 0629015, 0869084, 0584091, (0208167-0208170), 4120345, 0238625, серии КВ № (4123338-4123359), 4100290, 4122976.

- страховые полисы по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездок за границу формы 2РН, 2РП серии БМ № (0343870-0343872), 0343879, 0313319, 0267679, 0267980, 0289775, (0156335-0156338), 0156340, 0205759, 0205761, (0205763-0205765), (0237207-0237210), 0237214, 0237216, 0237217, 0294941, 0294805, (0267761-0267763), 0201323, 0184209, 0184210, 0203650, 0213560, 0216496, 0289179, 0213886, 0213893, 0334141, 0155660, 0155661, 0205388, 0279084, 0232436, 0232437, 0312922, 0265750, 0213160, 0324804, 0201909, 0201912, 0266663, 0313166, 0205349, 0205350, 0214201, 0214202, (0214225-0214226), 0169136, 0202445, 0202446, 0169800, 0184330, (0312411-0312421), (0312448-0312500), 0313930, 0232952, 0232963, (0265291-0265293), 0265301, 0278235, (0246334-0246336), (0350453-0350469).

- страховые полисы по добровольному страхованию транспортных средств граждан формы 2РН серии БГ № 0005542, 0005544, 0009041.

- страховые полисы по договорам страхования, заключаемые с физическим лицом (Форма 2РН), юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем (Форма 2РП) по страхованию иному, чем страхование жизни формы 2РН, 2РП серии БК № (0073361-0073367), 0073370, 0080074, 0093852.

- страховые сертификаты «Зеленая карта» серии BY 12 № 4703226, 4756096, 4702615.

- страховые полисы по добровольному страхованию транспортных средств граждан формы 2РН, 2РП серии БТ № (0000093-0000094), 0007394.

МОДА НА ВЯЛІКУЮ СЯМ'Ю...

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

— Я пайшла замуж за Івана ў 23 гады, — распавядае Вера Мікалаеўна. — Праз год нарадзіла першага сына. І пайшлі дзеці — адно за адным. На месяц-два выйду з дэкрэту — і зноў у дэкрэт. Гэтак усіх 10 нарадзіла за 15 гадоў. Сем сыноў і тры дачкі. Праўда, адна дзяўчынка ў мяне памерла ў хуткім часе пасля нараджэння.

— Вера Мікалаеўна, а што вы можаце параіць тым жанчынам, якія плануюць стварыць вялікую сям'ю?

— Вой, гэта ж зараз нейкае планаванне прыдумалі! *(Смяецца).* Раней Бог даваў дзіцятка — дык і нараджалі. Што дзяцей багата, то я не баялася. Не скажу, што лёгка гадаваць дзетак. Але ж раз асмеліўся нарадзіць, трэба іх усіх на ногі паставіць. Слава Богу, пагадавалі. А цяперака, як кажуць, хлеба на іх усіх хопіць, хай зарабляюць ды ядуць. А ты сама яшчэ не зведала радасць мацярынства?.. То ўсё наперадзе. Што параіць, чаму навучыць?.. Жыццё навучыць. Цяпер жа кніжак столькі! Як пачытаеш, дык ты ж зусім не гэтак рабіў. Адзінае скажу, добра выбірай бацьку для будучых дзетак. Гэта, мая даражэнькая, вялікая справа. Толькі з добрым мужам можна адважвацца на вялікую сям'ю.

— Суседзі вельмі хваляць вашых дзетак. Маўляў, не п'юць, бацькоў не забываюць, праведваюць, адно за аднаго гарой стаяць, слабейшых не дадуць пакрыўдзіць. Падзяліцеся сакрэтам выхавання.

— Царква дапамагала выхоўваць. У нас у Дубіцы 90 адсоткаў насельніцтва (і мы ў тым ліку) — веруючыя людзі, прыхаджане хрысціянскай царквы «Благодать». Усе нашы дзеткі хадзілі ў нядзельную школу з 5 гадоў. Тры нашыя сыны атрымалі духоўную адукацыю: двое, што жывуць зараз у Расіі, скончылі духоўную семінарыю ў Маскве, трэці — Раман — вучыўся ў тэалагічным інстытуце ў Мінску. Яны і шлюбам пабраліся з такімі ж веруючымі, як самі.

— А як атрымалася захаваць дружную сям'ю?

— Бацькі былі прыкладам, — уступае ў размову Коля, які з цікавасцю сачыў за кожным словам маці. — Ні разу не сварыліся.

— Коля, а вось асабіста ты колькі хочаш мець дзетак? — звяртаюся да хлопца.

— Як мінімум трое, — не раздумваючы, выпаліў ён. — Каб весялей было ў сям'і, каб дзецям было цікавей паміж сабой кантактаваць. Я думаю, траіх змагу ўтрымліваць. Не такая вялікая задача. Калі адзін, распешчаныя атрымліваюцца, вырастаюць эгаістамі. Калі трое, адно аднаму дапамагаць будуць. У нас, у хрысціян веры евангельскай, заведзена, каб сем'і былі шматдзетныя. Бо дзеці — гэта блаславенне бацькоў.

— Мы з Іванам усё жыццё прысвяцілі дзецям. І зараз у нас толькі адна мара: каб малодшыя ўладкаваліся хораша і жылі паміж сабой мірна. Колькі Бог дасць жыць нам разам з бацькам — столькі будзем удваіх жыць. І вы, — звяртаецца да сыноў, — не шукайце нікога на баку. Памятайце, як маці выхоўвала: пабраўся шлюбам — дык навек.

Пакуль мы размаўлялі, з працы на абед прыехаў гаспадар.

— Памятаеш, тата, як мы за табой па вёсцы ў царкву ў радок хадзілі, як хвосцікі, — з усмешкай вітае бацьку Коля.

— Вой, мне тады такі гонар быў! Дзевяць дзяцей — і з іх сем сыноў!

— Хвала была бацьку, што сыноў столькі мае, — смяецца Вера Мікалаеўна, — але ж і ў дочках, якія ў нашай сям'і ў меншасці, Іван душы не чуе. Вы б бачылі, як ён чакаў наша апошняе дзіця. Думаў, зноў сын будзе. І нават жартам папракаў мяне: маўляў, ты, жонка, дачок развучылася нараджаць. А тут на табе — дзяўчынка нарадзілася. Радасці не было межаў. Мой муж, што казаць, добры наконт дзяцей.

«Самая галоўная ўзнагарода для бацькоў — што дзеці прыязджаюць»

З Дубіцы мы накіраваліся ў суседнія Гаўрыльчыцы — цэнтр сельсавета. Каля хаты Бойкаў у дварэ нас сустрэла процьма качак ды курэй. Без слоў зразумела: тут жывуць гаспадарлівыя людзі.

— Мой дом вунь, па суседстве, — кажа стараста вёскі. — Таму смела магу сказаць, што гэта сям'я — узор працавітасці для ўсіх месцічаў. Як бацькі, так і дзеці не цураюцца работы. Бульбу капаць усе з'язджаюцца. Усё робяць гуртам. На зіму 230 слоікаў закручваюць. Свіней ажно 11 цяпер трымаюць...

У сенцах паказалася ўсмешлавая гаспадыня з маленькім дзіцем на руках. Калі прайшлі далей, убачылі яшчэ адну льняную галоўку, якая цікавала за новымі людзьмі з-за печкі.

— Я сёння за няньку, — усміхаецца Таццяна Сцяпанаўна. — Гэта мае ўнучачкі Ксенія і Сафійка. Дачка паехала на горад па сваіх патрэбах. Папрасіла пасядзець з дзецьмі. Гаспадар жа мой зараз у бальніцы, з дня на дзень павінны выпісаць.

***— А як з Іванам Іванавічам лёс зв

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

20 кастрычніка 2011 г. № 29 (267)

ФОРМА І ЗМЕСТ

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

НЕ РАБІЦЬ РЭЗКІХ РУХАЎ

У ПОШУКУ АПТЫМАЛЬНАЙ МАДЭЛІ ЖЫЛЛЁВАГА САМАКІРАВАННЯ

Два гады таму мы пазнаёмілі нашых чытачоў з новай для Беларусі формай кіравання шматкватэрнымі дамамі — «сумесным домаўладаннем» і структурамі, якія яго ажыццяўляюць, — таварыствамі ўласнікаў. Разам з экспертам — старшынёй праўлення Рэспубліканскага сацыяльна-асветніцкага грамадскага аб'яднання «Сумеснае домаўладанне» Эдуардам ЛАТУШКАМ на старонках «МС» мы падрабязна абмеркавалі відавочныя перавагі і перспектыўнасць гэтай формы кіравання, нагадалі, што яна ўжо даўно добра сябе зарэкамендавала ў Еўропе і некаторых краінах былога Саюза, агучылі прыблізную колькасць таварыстваў уласнікаў, якія існавалі на той час (іх было каля 900, ім падпарадкоўвалася 3% жылфонду краіны). Прайшло два гады. Ці адбыўся пералом у свядомасці ўласнікаў? Ці пачалі яны актыўна ствараць таварыствы?

— Абсалютная большасць уласнікаў працягвае думаць, што адказнасць за жыллё і за дом нясуць не яны, а тыя, хто яго абслугоўвае, — патлумачыў Эдуард Латушка. — Можна сцвярджаць, што пералом не адбыўся. Дарэчы, сёння неабавязкова ствараць такія таварыствы ўласнікаў у кожным новым шматкватэрным доме, як гэта было раней. Апроч таго, акрамя таварыстваў уласнікаў актыўна ствараюцца жыллёва-будаўнічыя вытворчыя кааператывы (ЖБВК), якія таксама з'яўляюцца формай жыллёвага самакіравання. Яны фарміруюцца яшчэ да пачатку работ па ўзвядзенні дома і працягваюць існаваць пасля здачы яго ў эксплуатацыю.

Увогуле, прычын замаруджвання развіцця жыллёвага самакіравання некалькі, назаву найбольш важкія з іх. Дарэчы, пра гэта вельмі грунтоўна напісана ў Нацыянальным жыллёвым аглядзе Еўрапейскай эканамічнай камісіі ААН, які быў падрыхтаваны па запыце Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва некалькі гадоў таму. Там адзначалася, што для паляпшэння якасці жыцця мясцовых супольнасцяў неабходна надзяліць мясцовыя органы кіравання больш шырокімі паўнамоцтвамі па прыняцці рашэнняў. Акрамя таго, еўрапейскія эксперты падкрэслівалі неабходнасць стымулявання тых суб'ектаў, якія з'яўляюцца ўдзельнікамі працэсаў мясцовага развіцця. Там жа была агучана прапанова абавязковага стварэння таварыстваў уласнікамі жылля. Праз гэта прайшлі ўсе еўрапейскія краіны, бо іншым чынам немагчыма перадаць адказнасць за дом. На жаль, гэтыя рэкамендацыі пакуль што не сталі асновай жыллёвай палітыкі ў нашай краіне, але спадзяюся, што гэты працэс пойдзе.

Для таго, каб ён праходзіў эфектыўна, неабходна зараз вырашаць бягучыя праблемы таварыстваў уласнікаў і ЖБВК. Яны фактычна аднолькавыя і ў большасці сваёй датычацца менавіта кіравання, арганізацыі эксплуатацыі, заключэння дагавораў і г.д. Адзіная адметная праблема жыллёва-будаўнічых вытворчых кааператываў — што рабіць з тым, хто не з'яўляўся членам ЖБВК, а набыў кватэру пазней? Ці ўлічваць яго голас у абмеркаванні спрэчных пытанняў? Такія моманты трэба загадзя прапісваць у статуце кааператыва. Аднак сёння гэта не глабальная праблема. З ёй сутыкаюцца адзінкі. Самая агульная, вострая праблема — арганізацыя эканамічна абгрунтаванага тэхнічнага абслугоўвання.

На маю думку, у большай ступені масаваму стварэнню таварыстваў перашкаджае адсутнасць празрыстасці тарыфікацыі жыллёва-камунальных паслуг, іх дэталізацыі. Людзі павінны быць зацікаўлены ў эканоміі. А калі яны не бачаць, на што і як яны могуць уплываць, ніякай эканоміі не будзе.

Калі б сёння ў краіне быў сфарміраваны рынак прадастаўлення паслуг тэхнічнага абслугоўвання, а функцыі кіравання былі асобна вылучаны ў жыроўцы (а значыць, і заканадаўча), то таварыства ўласнікаў магло б, па-першае, выканаць сваю функцыю па аб'яднанні жыльцоў, а па-другое, арганізаваць тэхабслугоўванне.

— Хто яго можа ажыццяўляць?

— Тут ёсць некалькі варыянтаў. Той, хто ажыццяўляе кіраванне домам (чалавек ці арганізацыя), можа заключыць дагавор на тэхнічнае абслугоўванне з дзяржаўным прадпрыемствам (ЖЭСам) ці з прыватнікам. А можа стварыць адпаведную структуру пры сваім таварыстве ці кааператыве, наняць спецыялістаў, якія і будуць выконваць гэтыя функцыі.

— Любым шматкватэрным домам, незалежна ад формы ўласнасці, павінен нехта кіраваць. З таварыствамі ўласнікаў і ЖБВК усё зразумела: яны самі ажыццяўляюць кіраванне і заключаюць з кімсьці дагавор на тэхабслугоўванне. А калі тэхнічным абслугоўваннем займаецца ЖЭС, то хто тады рэалізуе функцыі кіравання?

— Фактычна — ЖЭС. У старых дамах ЖЭСы, якія ажыццяўляюць тэхнічнае абслугоўванне, фактычна ажыццяўляюць і функцыі кіравання. Кажу «фактычна», бо інакш павінен быў існаваць адпаведны дагавор на кіраванне, заключаны паміж жыльцамі і ЖЭСам. Праблема ў тым, што функцыі кіравання не вылучаны асобна ў тэхнічным абслугоўванні, хоць яны туды ўваходзяць.

— Увогуле, у чым заключаюцца гэтыя функцыі кіравання?

— Сюды ўваходзіць шмат рэчаў, у прыватнасці, кантроль за якасцю працы абслуговай арганізацыі, вядзенне каштарысу расходаў і даходаў па канкрэтным доме, захаванне тэхнічнай дакументацыі, пашпартоў прыбораў і матэрыялаў, якія пайшлі на рамонт, вядзенне кнігі сезонных агляданў і інш. Усім гэтым павінен займацца той, хто ажыццяўляе кіраванне. Тэарэтычна на кожны дом павінен быць сабраны цэлы набор дакументаў.

— Вы кажаце «павінен быць», бо ў ЖЭСаў яго няма?

— Мы гэтага не ведаем, бо не правяраем іх. Таварыствы ўласнікаў вядуць такую дакументацыю, захоўваюць у належным парадку, паколькі трымаюць за яе справаздачу перад членамі таварыства. Магчыма, і ў іх яна яшчэ не ў поўным аб'ёме, але гэта звязана толькі з тым, што сёння такая дакументацыя не да канца распрацавана. Трэба разумець, што само паняцце «сумеснае самакіраванне» — маладое, яно з'явілася параўнальна нядаўна. І самае сумнае тое, што людзі пакуль не разумеюць, што на першым месцы па значнасці — менавіта **кіраванне**, а не эксплуатацыя.

— Для жыльцоў важна ведаць, што хтосьці займаецца іх домам. А што там для гэтага робіцца і як, якія дакументы збіраюцца — іх, як правіла, не цікавіць...

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

ЗАПЛАНАВАЦЬ — ТОЛЬКІ ПАЛОВА СПРАВЫ

Перш чым прыняць праграмы развіцця рэгіёнаў на новую пяцігодку, на Міншчыне спачатку зацвердзілі адпаведныя планы сацыяльна-эканамічнага развіцця для сельсаветаў. Загадзя абмеркавалі на сходах грамадзян усе праблемныя пытанні, якія трэба вырашаць па кожным населеным пункце (дзе школу адрамантаваць, дзе дарогу заасфальтаваць і інш.), распісалі дакладны план дзеянняў на 5 гадоў наперад. Такія планы сацыяльна-эканамічнага развіцця вывешаны на стэндах ва ўсіх сельвыканкамах і ў самых буйных населеных пунктах. Цяпер мясцовыя жыхары ведаюць, што, напрыклад, дарога ў іх вёсцы будзе заасфальтавана не сёлета, а ў 2012 годзе, у сваю чаргу капітальны рамонт школы адбудзецца ў 2013-м. Аднак запланаваць — гэта яшчэ палова справы. Галоўнае — рэалізаваць.

Нягледзячы на цяжкасці

— Нягледзячы на ўсе фінансавыя цяжкасці, вобласць намагаецца выканаць запланаванае, — пацвердзіла **старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Святлана ГЕРАСІМОВІЧ,** выступаючы перад старшынямі Саветаў дэпутатаў пярвічнага ўзроўню, якія з'ехаліся з усіх куткоў рэспублікі на вучобу ў Мінск. — Як і ў іншых абласцях, нашы сельвыканкамы зарабляюць грошы. У прыватнасці, шляхам продажу зямельных участкаў праз аўкцыёны. У 2008 годзе мы зарабілі такім чынам 46 мільярдаў. Потым быў невялікі спад. Цяпер мы зноў актывізавалі гэтую работу і сёлета ўжо зарабілі 30 мільярдаў рублёў. Акрамя таго, актыўна вядзём працу па эфектыўным выкарыстанні нерухомай маёмасці (будынкаў былых школ, ФАПаў, бальніц і інш), знаходзім інвестараў, здаём ім азначаныя аб'екты ў арэнду. Найбольш вынікаў — ў Мінскім раёне, які традыцыйна з'яўляецца самым прывабным для інвестараў.

— Мы прыкладаем усе намаганні для таго, каб грошы, якія зарабляюць сельвыканкамы, заставаліся на гэтай тэрыторыі, — дадала Святлана Герасімовіч. — Напрыклад, у Нарацскім сельсавеце Мядзельскага раёна змаглі зарабіць 500 мільёнаў рублёў. Зразумела, раёну не вельмі хацелася вяртаць гэтыя грошы. Але старшыня сельвыканкама прадставіў праграму аб выкарыстанні гэтых сродкаў: дзе з іх дапамагай ён падтрымае аб'екты гандлю, размешчаныя на тэрыторыі сельсавета; дзе — школу, дзе — упарадкуе мясцовую дарогу... На сесіі прынялі рашэнне аб зацвярджэнні праграмы, правялі ўдакладненне бюджэту, узгаднілі яго з Мінюстам — і ў выніку большая частка грошай, якія такім чынам былі зароблены, раён дзелгаваў у сельвыканкам. А той атрымаў права выкарыстоўваць іх для рэалізацыі згаданых вышэй планаў сацыяльна-эканамічнага развіцця сваёй тэрыторыі.

«Дровамі забяспечым, але не ўсіх...»

Гадоў пяць таму на Міншчыне пачалі праводзіць выязныя сесіі аблсавета. Святлана Герасімовіч лічыць такую форму работы дэпутатаў карыснай і прадуктыўнай, бо падчас наведвання рэгіёна разглядаюцца ўсе пытанні, якія тычацца як Міншчыны ў цэлым, так і канкрэтнага рэгіёна. Цікава, што маршрут праезду па тэрыторыі распрацоўваецца не загадзя, а непасрэдна пасля прыбыцця на месца.

Некалькі гадоў таму ў вобласці пачалі ўкараняць яшчэ адну цікавую форму работы — планёркі-нарады ў старшынь сельскіх Саветаў дэпутатаў, куды запрашаюцца кіраўнікі ўсіх устаноў і арганізацый, размешчаных на пэўнай тэрыторыі. Загадзя плануецца кола тэм, на самой планёрцы вызначаюцца адказныя па кожным праблемным пытанні.

— Калі такую работу арганізаваць правільна — вынікі відавочныя, — пацвердзіла старшыня аблсавета.— Галоўнае — кантраляваць выкананне разгледжанага, не дапускаць фармалізму. Такія планёркі спрыяюць павышэнню рэальнага статусу ўлады на месцах, статусу старшыні сельскага Савета.

Кожную другую сераду месяца ў вобласці праводзіцца Дзень дэпутата. Тут таксама народныя абраннікі імкнуцца па максімуме перавесці сваю дзейнасць у практычную плоскасць. Напрыклад, напярэдадні новага навучальнага года тэмай чарговага Дня дэпутата яны абралі праверку падрыхтоўкі дзяцей да школы. Наведалі сем'і, якія выклікалі найбольшую занепакоенасць, паглядзелі, ці ёсць у дзяцей вучнёўскае адзенне, абутак, падручнікі, канцтавары і г.д. Сельскім дэпутатам давялося кантраляваць, каб не вельмі адказныя бацькі паспелі да 1 верасня атрымаць аванс, потым асабіста суправаджаць такіх бацькоў у магазін выбіраць дзецям адзенне, абутак і г.д.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

НА ДАТАЦЫІ СПАДЗЯВАЙСЯ, АЛЕ МАГЧЫМАСЦІ ШУКАЙ

На каго абапіраюцца старшыні сельскіх Саветаў у Жыткавіцкім раёне?

Калі на тэрыторыі сельсавета няма сельгаспрадпрыемства, дадатковы галаўны боль кіраўніку мясцовай улады, лічы, забяспечаны. Гэта вам скажа кожны старшыня сельвыканкама, пазбаўлены магчымасці звяртацца пры неабходнасці ў «сваю гаспадарку». Адных такая сітуацыя расхалоджвае, ператварае ў песімістаў. Іншых, наадварот, мабілізуе і падштурхоўвае да дзейнасці — як, напрыклад, старшыню Юркевіцкага сельскага Савета дэпутатаў Алену ШПАКЕВІЧ.

— У 1995-м, калі я прыйшла на гэтую пасаду, грошай у бюджэце не было ўвогуле. І калгаса на тэрыторыі не было. Ні падтрымкі, ні апоры. Адлегласць паміж населенымі пунктамі вялікая, насельніцтва пераважна немаладое... Як з такімі стартавымі ўмовамі вырашаць праблемы жыццезабеспячэння людзей?

Яна не стала «вынаходзіць веласіпед», а зрабіла стаўку на актыўнае насельніцтва — інакш кажучы, на грамадскае самакіраванне, на тых жа старастаў, якіх жыхары Юркевіцкага сельсавета выбіралі аднымі з першых у Жыткавіцкім раёне. Старасты «пайшлі ў народ» — тлумачыць «палітыку» кіраўніка сельсавета, якая заключалася ў тым, што добраўпарадкаваць сваю тэрыторыю (і ў першую чаргу — уласныя падворкі) давядзецца сваімі сіламі.

Рэакцыя насельніцтва на такія патрабаванні была, мякка кажучы, неадназначнай. Гэта сёння жыхарам сельсавета, прывучаным ужо вырашаць неглабальныя мясцовыя пытанні грамадой і пераважна за ўласныя сродкі, не трэба тлумачыць «азы» самакіравання. А тады, каб угаварыць людзей замяніць старыя агароджы на падворках, Алене Іванаўне давялося не адну пару абцасаў стаптаць.

— Іду па вуліцы, бачу: стаяць каля магазіна 4—5 чалавек. Падыходжу і пачынаю гаварыць пра неабходнасць паставіць новую агароджу. Яны не слухаюць — а я ўсё роўна гавару. Яны ўбок адыходзяць — а я зноў падыходжу і зноў гавару: маўляў, гэта ваша прыватная ўласнасць, а таму здавайце грошы... І старасты ўвесь час мне дапамагалі. Бо якім бы актыўным ні быў старшыня сельскага Савета, у адзіночку вялікі аб'ём работы ён не выканае.

Простыя ісціны, якія не страчваюць сваю значнасць... Напэўна, таму так уважліва слухалі Алену Шпакевіч калегі з іншых раёнаў рэспублікі падчас выязнога практычнага семінара, арганізаванага Інстытутам дзяржаўнай службы Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь і Саветам па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання. Не кожны кіраўнік пярвічнага звяна ўлады можа разлічваць на актыўнасць сваіх жыхароў, тым больш, калі размова заходзіць пра добраахвотны збор сродкаў. А ў Юркевіцкім сельсавеце, дзе пражывае ўсяго 973 чалавекі, толькі сёлета на будаўніцтва агароджы сабралі 38 мільёнаў рублёў, прычым грашовыя ўнёскі яшчэ паступаюць.

— Людзі здавалі і па 400 тысяч рублёў, і па 800 тысяч, і па 1,5 мільёна. Акрамя гэтага, папярэдне параіўшыся з насельніцтвам, мы вырашылі: у тых вёсках, дзе ўзводзіцца агароджа, кожны падворак (за выключэннем адзінокіх грамадзян) павінен выдзеліць аднаго работніка для яе ўстаноўкі — скажам, зяця ці сына. Калі такіх у наяўнасці няма, трэба кагосьці наняць. Яшчэ дваіх работнікаў забяспечваў сельвыканкам. Кожную раніцу і ўвечары я звязвалася з лясніцтвамі, з доследным рыбгасам «Белае», якія знаходзяцца на нашай тэрыторыі, — і яны таксама накіроўвалі людзей на дапамогу. Паступова нашы жыхары так уцягнуліся ў справу, што самі пачалі прыдумваць і падказваць, як гэтую агароджу лепш паставіць і пафарбаваць, — кажа Алена Іванаўна. — У выніку на ўстаноўку было затрачана толькі 40 працэнтаў бюджэтных сродкаў, а ўсё астатняе даплаціла насельніцтва.

Але арганізацыяй добраўпарадкавання падворкаў і вуліц органы грамадскага самакіравання ў Юркевіцкім сельсавеце не абмяжоўваюцца. Менавіта на падтрымку сваіх старастаў, як і на падтрымку мясцовых арганізацый, разлічвала Алена Шпакевіч, калі летась сельсавет узяў удзел у конкурсе праектных ініцыятыў ПРААН — і выйграў. Праект меў на ўвазе адкрыццё (на базе Юркевіцкай сярэдняй школы) дзіцячага садка, пра які не першы год марылі мясцовыя мамы і таты. На ўвасабленне мары ў жыццё сельвыканкам атрымаў па лініі міжнароднага тэхнічнага фонду 21 мільён рублёў, яшчэ 15 мільёнаў выдзеліў раённы бюджэт. Сваю лепту ўнеслі і мясцовыя арганізацыі, і простыя жыхары, якія дапамагалі літаральна за «дзякуй». У выніку адно «крыло» сельскай школы ператварылася ў дзіцячы садок, два былыя школьныя класы сталі гульнявым і спальным пакоямі. Малыя, нарэшце, атрымалі дзённы прытулак, а іх мамы і таты — магчымасць спакойна працаваць, не хвалюючыся за дзяцей.

Яшчэ адзін сельсавет, Людзяневіцкі, які старшыні сельскіх і пасялковых Саветаў дэпутатаў наведалі таксама, яго кіраўнік Юрый ВОЛЧЫК сціпла ахарактарызаваў як тыповы, з такімі ж праблемамі, як і ў многіх. Аднак адну асаблівасць сваёй тэрыторыі Юрый Аляксандравіч усё ж не мог не адзначыць: тут пражывае ажно 25 прыёмных сем'яў, а таксама знаходзяцца 2 дамы сямейнага тыпу. Каб лепш ведаць, як адаптуюцца дзеці ў новых умовах, якія праблемы хвалююць прыёмных бацькоў, ды і ўвогуле — каб мамы і таты маглі проста сустрэцца і абмяняцца думкамі, сельвыканкам стварыў свой клуб прыёмных сем'яў.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

Мікалай КАКОРА, старшыня Жыткавіцкага раённага выканаўчага камітэта:

— Што датычыцца ўзаемаадносін з раённай заканадаўчай уладай — ацэнку тут няхай даюць іншыя. Але я лічу, што мы знаходзім агульную мову і разам імкнемся рабіць усё магчымае, каб нашы населеныя пункты выглядалі дастойна.

Працы тут яшчэ шмат, мы знаходзімся на пачатковай стадыі. Але па-добраму падганяе тое, што ёсць рэальнае веданне сітуацыі на тэрыторыі кожнага сельсавета. Раней як было? На першым плане — сельгаспрадпрыемства, а што там адбываецца ў сельскім Савеце — справа дзясятая. Цяпер межы нашых узаемаадносін з пярвічным узроўнем улады прыкметна пашыраюцца, узаемадзеянне ўзмацняецца. А значыць, парадак будзе.

Ніна РАМАНОВІЧ, старшыня Жыткавіцкага раённага Савета дэпутатаў:

— Для рэалізацыі шэрагу тэрытарыяльных праграм (па абуладкаванні населеных пунктаў) патрабаваліся дадатковыя бюджэтныя сродкі. Аднак дзякуючы працы дэпутатаў і старост з насельніцтвам многія ініцыятывы былі рэалізаваны за кошт асабістых сродкаў грамадзян і пры іх непасрэдным удзеле. За гэты год мы ў раёне сабралі 43 мільёны рублёў шляхам самаабкладання, а 83 мільёны склалі добраахвотныя ўнёскі на добраўпарадкаванне.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

ЛОТ 1	
Наименование объекта	Здание склада ядохимикатов № 2, бытовое помещение
Краткая характеристика	Здание склада ядохимикатов № 2, кап. строение инв. № 451/С-12343, общая площадь 697 кв.м, объем здания 3313 м.куб., площадь застройки с рампой 1071 кв.м, фундамент бутобетонный, стены и перегородки кирпичные, перекрытия – ж/б плиты, крыша двухскатная шиферная. Бытовое помещение, кап. строение инв.№ 451/С-12342 общая площадь здания 29 кв.м, объем здания 125 м.куб., площадь застройки 41 кв.м, фундамент бутобетонный, стены и перегородки кирпичные, перекрытия ж/б, крыша совмещенная, рулонная, полы бетонные.
Начальная цена продажи	164 694 000 белорусских рублей без учета НДС
Сумма задатка	8 234 700 белорусских рублей
Местонахождение объекта	Гродненская обл., Дятловский р-н, г.п. Новоельня, ул. Чапаева, 6
Земельный участок	Кадастровый № 422356300002000657, общая площадь земельного участка – 0,2727 га, назначение – для эксплуатации и обслуживания строений
Продавец	ЗАО «Агровнешсервис» г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, т. 74 03 12, 72 28 42
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41 98 32, 41 98 34
Условия аукциона	Аукцион без условий
Условия оплаты	По договоренности сторон
Срок заключения договора купли-продажи	Не позднее 10 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/с для перечисления задатка	Р/с 3012286350011 отделение № 201 г. Гродно ГФ по Гродненской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 152101705, УНП 500833225

Аукцион состоится 01 ноября 2011 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3

К участию в аукционе допускаются юридические лица,физические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

индивидуальным предпринимателем – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическими лицами – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – нотариально заверенная доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

Информация о первом аукционе была опубликована в газете «Звязда» № 110(26794) от 15.06.2011 г.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3 с 8.30 до 17.30. Последний день приема заявлений – 31 октября 2011 г. до 15.00.

Телефон для справок: 41 98 32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». Дополнительная информация: www.ino.by

НЕ РАБІЦЬ РЭЗКІХ РУХАЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Менавіта. Вось і маем тое, што маем. У нашым заканадаўстве прапісана, што такое кіраванне жылфондам, пералічаны абавязкі... А хто іх павінен ажыццяўляць? Якая дакументацыя для гэтага неабходна?

Наша грамадскае аб'яднанне «Сумеснае домаўладанне» не адзін год прасоўвае ідэю «разбіць» адзіны артыкул жыроўкі «тэхнічнае абслугоўванне» на асобныя складнікі, каб людзі разумелі, за што яны плацяць і якая дакументацыя павінна быць у наяўнасці ў кіруючай арганізацыі. Скажам, калі ёсць у доме пажарная сігналізацыя, значыць, яна павінна быць прапісана асобным пунктам у жыроўцы. Адпаведна павінны быць схемы пажарнай сігналізацыі, дагавор на яе ўстаноўку, акт выканання работ і г.д. Тады жыльцы ў любы момант могуць звярнуцца ў арганізацыю, якая ажыццяўляе кіраванне, пацікавіцца, калі плануецца замена сістэмы і загадзя падрыхтавацца, сабраць грошы.

— Калі дом насычаны новымі інжынернымі сістэмамі (кшталту пажарнай сігналізацыі, прымусовай вентыляцыі і г.д.), то яго тэхнічнае абслугоўванне будзе каштаваць больш, чым абслугоўванне звычайнай панельнай хрушчоўкі...

— Сапраўды. Таму перад тым, як мадэрнізаваць нейкую інжынерную сістэму дома, трэба пралічыць эканамічны эфект. Сёння ён не вельмі заўважны, бо большую частку камунальных затрат бярэ на сябе дзяржава (я маю на ўвазе датацыі). І жыльцы не адчуваюць вялікай нагрузкі на свой бюджэт, як, дарэчы, і эканамічнага эфекту ад мадэрнізацыі. Я лічу гэта не зусім правільным, бо такая сітуацыя выхоўвае ўтрыманцаў, гаворачы народнай мовай — «халяўшчыкаў». Жыльцы неашчадна ставяцца да агульнай маёмасці, не адчуваюць адказнасці за яе. Датацыя людзей распесціла.

Іншая справа — калі арганізуецца таварыства ўласнікаў ці ЖБВК. Паколькі жыльцы абралі такі спосаб кіравання маёмасцю, то яны зацікаўленыя ў мінімізацыі сваіх затрат і разам шукаюць шляхі гэтай мінімізацыі. Яны бачаць каштарыс даходаў і расходаў па сваім доме, вырашаюць, на чым можна эканоміць, і такім чынам далучаюцца да фарміравання тэхнічнага абслугоўвання. Напрыклад, сродкі, прызначаныя на капрамонт, якія збірае іх таварыства ўласнікаў, яны ў любы момант могуць расходаваць на мадэрнізацыю ці тэрміновы рамонт пэўнай інжынернай сістэмы.

Нагадаю: нарматыўныя тэрміны эксплуатацыі розных інжынерных сістэм розныя. А той факт, што мы замяняем іх усе разам падчас капітальнага рамонту, які праводзіцца праз 40 гадоў, сведчыць толькі пра адсутнасць нармальнага кіравання. На самой справе, капрамонт павінен тычыцца толькі нясучых канструкцый. А да гэтага павінны ўжо быць заменены сістэмы водаправода, электразабеспячэння і інш. — кожная ў свой час. Разумны старшыня таварыства ці ЖБВК будзе загадзя ведаць, якую сістэму першай прыйдзецца замяняць ці рамантаваць, і да таго часу паспее сабраць з жыльцоў неабходную суму, знайсці падрадчыка, заказаць праект мадэрнізацыі.

— Чаму ж такая прагрэсіўная форма кіравання, як таварыствы ўласнікаў, актыўна не прасоўваецца самімі таварыствамі? Хіба яны не зацікаўлены ва ўмацаванні і пашырэнні свайго сектару?

— Ваша пытанне мае рацыю. Я лічу, што большасць старшыняў таварыстваў і ЖБВК засяроджаны на сваіх прыватных праблемах, якія ім трэба тэрмінова вырашаць. Гэта зразумела. Але сёння патрэбна і другое. Так адбылося, што мы жывём у эпоху актыўных змен і час патрабуе ад нас стратэгічнага мыслення і шырокай камунікатыўнасці. На практыцы гэта значыць актыўна ўдзельнічаць у рабоце ўжо дзейсных механізмаў. Некалькі гадоў таму пры раённых адміністрацыях Мінска былі створаны саветы па развіцці жыллёвага самакіравання. Іх патэнцыял для вырашэння канфліктных сітуацый, пытанняў якасці будаўнічых паслуг, развіцця мясцовых тэрыторый, удасканалення жыллёвай палітыкі да гэтай пары яшчэ не выкарыстаны. Хаця самі раённыя адміністрацыі зацікаўлены ў такіх саветах, бо тыя маюць на ўвазе зваротную сувязь з насельніцтвам. Калі б мы паказалі эфектыўнасць такой формы супрацоўніцтва ў Мінску, гэта б дазволіла распаўсюдзіць станоўчы досвед па ўсёй краіне і зняць шматлікія праблемы ў жыллёвай сферы.

— У тым ліку і злоўжыванні з боку старшынь таварыстваў уласнікаў?

— Каб пазбегнуць гэтага, дзяржава павінна ажыццяўляць належны кантроль за дзейнасцю такіх кіраўнікоў. Сам кіраўнік павінен мець сертыфікат дзяржаўнага ўзору. З ім неабходна заключаць дагавор на выкананне пэўных паслуг, якія былі б дакладна прапісаны. Тады чалавек ведаў бы, што з яго ў любы момант могуць запатрабаваць справаздачу — і жыльцы, і дзяржава як орган, які правёў сертыфікацыю. Акрамя таго, само таварыства можа застрахаваць сябе ад рызыкі махлярства старшыні.

Што ж да тарыфу — замест яго варта было б увесці адрасную дзяржаўную дапамогу па аплаце жыроўкі для малазабяспечаных грамадзян. А ўсе астатнія вучыліся б ашчадна ставіцца да агульнай маёмасці і шукаць шляхі эканоміі сваіх сродкаў.

Зразумела, усё гэта патрабуе ўнясення змяненняў у дзейнае заканадаўства. Сёння сталічныя гарадскія ўлады, зацікаўленыя ў развіцці таварыстваў уласнікаў як спосабе кіравання, ініцыявалі правядзенне даследавання Мінскім навукова-даследчым інстытутам сацыяльна-эканамічных праблем. Аналітычную запіску, якая ахоплівае разгляд усіх пытанняў, звязаных з развіццём гэтага спосабу кіравання, спецыялісты павінны падрыхтаваць да канца года. Да працы далучылася і Акадэмія навук. У выніку павінна акрэсліцца навукова абгрунтаваная і эканамічна выгадная мадэль жыллёвага самакіравання.

У любым выпадку, прасоўваючы ідэю стварэння таварыстваў уласнікаў, не трэба рабіць рэзкіх рухаў, варта дасканала ўзважыць кожны крок: як адыходзіць ад датацыі, як дыферэнцаваць тэхнічнае абслугоўванне, як фарміраваць у жыльцоў адказнасць за сваю ўласнасць... А пачынаць трэба з навучання не толькі слухаць, але і чуць адно аднаго.

Інга МІНДАЛЁВА.

ЗАПЛАНАВАЦЬ — ТОЛЬКІ ПАЛОВА СПРАВЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Цяпер будзем разглядаць пытанне падрыхтоўкі да ацяпляльнага сезона, — падзялілася планамі Святлана Міхайлаўна. — У прыватнасці, забеспячэнне домаўладанняў дровамі. Падобную акцыю па ініцыятыве старшыні аблвыканкама мы правялі яшчэ летась. Арганізацыйным бокам займаліся сельскія Саветы. Сумесна з аддзеламі па працы і сацыяльнай абароне яны склалі спісы — каго забяспечыць дровамі ў першую чаргу. Потым дакладна распісалі — колькі дроў павінна вывезці з лесу кожная арганізацыя — сваімі сіламі, сваім транспартам. Задзейнічалі ўсе арганізацыі: і ЖКГ, і аблпаліва, і дарожнікаў, і будаўнікоў, і прыватныя структуры. Сельскія Саветы скааперавaліся з СВК. За тры месяцы вывезлі 23 тысячы кубаметраў дроў. Сёлета мы таксама працягнем такую практыку, але вывозіць будзем меншымі аб'ёмамі: не трэба людзей прывучаць да таго, што хтосьці ўсё зробіць за іх сам. Тым не менш непрацуючым пенсіянерам і адзінока пражываючым прывязём дровы ў першую чаргу.

На працягу апошніх некалькіх гадоў у вобласці праводзяцца рэгіянальныя сходы дэпутатаў. Раз у паўгоддзе ў канкрэтным раёне збіраюцца дэпутаты раённага і ўсіх сельскіх Саветаў, прысутнічаюць і некаторыя старэйшыны вёсак. Сюды ж запрашаюцца старшыня райвыканкама з намеснікамі і кіраўнікамі службаў, дэпутаты аблсавета, члены Савета Рэспублікі і дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, якія вылучаліся ад гэтага рэгіёна. На рэгіянальным сходзе старшыня райвыканкама трымае справаздачу аб сацыяльна-эканамічным развіцці раёна, старшыня райсавета расказвае, што зроблена дэпутацкім корпусам у вырашэнні пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва. Выступаюць дэпутаты, старэйшыны. Сутнасць ме-рапрыемства — прыцягненне дэпутатаў усіх узроўняў да актыўнай працы на тэрыторыі.

Асобная тэма

Добраўпарадкаванне — гэта вельмі сур'ёзная праца, якая павінна весціся кожны дзень, падкрэсліла Святлана Герасімовіч. І для атрымання значных вынікаў важна максімальна прыцягнуць да ўдзелу у гэтай агульнай справе жыхароў, бо «за ўсіх усё не зробіш». У многім гэтую работу аблягчылі прынятыя сёлета ў вобласці адзіныя патрабаванні да добраўпарадкавання домаўладанняў, дзе, апроч іншага, прапісаны і штрафныя санкцыі для нядобрасумленных гаспадароў (ад 5 да 50 базавых велічынь).

Міні-палігоны ў вобласці ліквідаваны, у кожным раёне засталіся ўсяго па 2-3 буйныя палігоны. Па словах Святланы Міхайлаўны, спачатку ідэя па закрыцці шматлікіх міні-звалак выклікала ў старшынь сельскіх Саветаў разгубленасць. Іх занепакоенасць была цалкам зразумелая: не сакрэт, што пасля закрыцця адной звалкі людзі часта тут жа ўтвараюць новую (носяць смецце ў лес, выкідваюць ля дарогі). Адзінае выйсце ў такой сітуацыі — заключэнне дагавораў на цэнтралізаваны вываз смецця. І не толькі з жыхарамі, але і з мясцовымі арганізацыямі (гаражнымі кааператывамі, садаводчымі таварыствамі).

— Асноўную долю гэтай работы мы ўжо зрабілі, — падсумавала старшыня аблсавета. — Цяпер стаіць іншая задача — наладзіць перапрацоўку смецця. У нас ужо ёсць два прадпрымальнікі, якія выступаюць з ініцыятывай будаўніцтва такога перапрацоўчага завода. Такім чынам, у перспектыве ў Барысаўскім раёне з'явіцца завод па перапрацоўцы смецця.

Трэба ў кожнай справе імкнуцца да цывілізаванага падыходу, у тым ліку і ў дачыненні да вывазу смецця.

Спачатку ўзнікалі пытанні з вывазам буйнагабарытных рэчаў. Але не кожны ж дзень вяскоўцу трэба вывезці стары тэлевізар, канапу ці шафу. Мы прапануем некалькім людзям з адной вёскі скааперавацца (тады паслуга для кожнага будзе каштаваць менш), заказаць транспарт у ЖКГ ці СВК і адным рэйсам вывезці непатрэбныя ім рэчы.

Падсумоўваючы тэму добраўпарадкавання, Святлана Міхайлаўна прызнала, што ў гэтым плане Міншчыне яшчэ ёсць над чым працаваць, але ўжо сёння два рэгіёны можна прыводзіць у якасці станоўчага прыкладу выніковай работы — Вілейскі і Маладзечанскі.

— Я не скажу, што там ужо ўсё ідэальна. Але калі сёння наведаць там любы сельсавет, то не будзе соромна перад гасцямі самага высокага ўзроўню.

Інга МІНДАЛЁВА.

НА ДАТАЦЫІ СПАДЗЯВАЙСЯ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

На імправізаваным пасяджэнні клуба прысутнічалі і ўдзельнікі выязнога семінара. А вось праблемы, узнятыя прыёмнымі бацькамі, аказаліся цалкам рэальнымі. Адных не вельмі задавальняюць магчымасці аздараўлення дзяцей, другіх — памеры грашовай дапамогі, трэціх — забеспячэнне палівам... Прыёмны тата расказаў, што яму даводзіцца часта вазіць дзіця па бальніцах, у тым ліку і ў Гомель. А грашовая дапамога, якую штомесяц выдзяляе дзяржава на дзіця, на такія паездкі не разлічана, таму яе элементарна не хапае. Камандзіровачныя ж расходы для прыёмных бацькоў не прадугледжаны.

Аляксей СЦЕПАНЕНКА, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу:

— Вырашэнне пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва — тэма, важная для ўсіх сельскіх Саветаў без выключэння. Ці ўсе так працуюць, як тыя кіраўнікі пярвічнага звяна ўлады, якіх мы ўбачылі ў Жыткавіцкім раёне? Не, не ўсе. Але хачу адзначыць, што пасля выхаду вядомага Указа Прэзідэнта № 21 працаваць на месцах пачалі больш сістэмна, больш эфектыўна і вынікова. З'явілася самастойнасць у гэтай працы. Сёння часу на раскачку ўжо не засталося, прыйшла пара адказнасці. Тым больш, што заканадаўчая база для падтрымкі органаў мясцовага кіравання і самакіравання цалкам створана. Усе пытанні, якія датычацца водазабеспячэння, вонкавага асвятлення, дарог і г.д., ужо практычна зняты. Застаецца, умела карыстаючыся законамі, эфектыўна кіраваць сваёй тэрыторыяй.

Старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Марыя БОНДАР, якая таксама прымала ўдзел у сустрэчы, папрасіла прыёмных бацькоў падрабязна выкласці ўсе праблемы на паперы і пераслаць іх на адрас аблсавета, паабяцаўшы разабрацца і па кожнай даць кампетэнтны адказ.

Што датычыцца добраўпарадкавання тэрыторыі, сёлета на гэтыя мэты Людзяневіцкі сельвыканкам ужо выкарыстаў 55 мільёнаў (!) бюджэтных грошай, яшчэ 25 мільёнаў сабрала насельніцтва.

— Калі такое было? Ды ніколі! — гаворыць Юрый Волчык, у першую чаргу маючы на ўвазе суму, выдзеленую на добраўпарадкаванне з бюджэту. — З такімі грашыма ўжо можна нармальна працаваць.

Сёння на тэрыторыі сельсавета практычна не засталося дамоў, якія пустуюць, хоць параўнальна нядаўна (пяць гадоў таму) такіх будынкаў налічвалася каля 400. Частка з іх займела гаспадароў. Безгаспадарныя ж будынкі зносяць, а выслабаненую зямлю рыхтуюць, як і паўсюдна ў раёне, для ўводу ў севазварот. З гэтай мэтай рашэннем райвыканкама за кожным населеным пунктам замацавана арганізацыя, якая выдзяляе сваіх людзей і тэхніку.

... А яшчэ госці звярнулі ўвагу на інфармацыйны стэнд з выразнымі фотаздымкамі «сваіх» дэпутатаў і даваных асоб (старастаў), іх каардынатамі і графікамі прыёму. «Прыеду дадому — абавязкова гэтак жа афармлю стэнд, — сказала адна з удзельніц семінара. — А то нашы наведвальнікі без акуляраў літар не бачаць». Напэўна, гэта не адзінае «ноу-хау», якое захочуць пераняць у сваіх калег з Жыткавіцкага раёна ўдзельнікі сустрэчы.

Наталля КАРПЕНКА,
Жыткавіцкі р-н.

Марыя БОНДАР, старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў:

СТАРШЫНЯМ СЕЛЬСКІХ САВЕТАЎ ДЭПУТАТАЎ ТРЭБА ВЫКЛЮЧЫЦЬ З УЖЫТКУ СЛОВА «ПРАСІЦЬ»

— Узгадваю перыяд, калі толькі прыйшла на сваю пасаду. Задумалася тады: а што, уласна кажучы, павінен рабіць старшыня абласнога Савета дэпутатаў? У законе вызначана: каардынаваць дзейнасць Саветаў ніжэйшага ўзроўню. Але як зразумець сутнасць гэтай кардынацыі, трэба было зразумець сутнасць працы пярвічнага звяна ўлады.

Першае, што зрабіла, — паехала выбарачна да вопытных кіраўнікоў сельскіх Саветаў, каб даведацца пра ўсе асаблівасці і нюансы. Паралельна наведала і навічкоў, якія толькі-толькі прыступілі да сваіх абавязкаў. У выніку зразумела, што паміж першымі і другімі існуе... пэўны вакуум. Прыходзіць на пасаду новы чалавек, і яму патрэбны год—два, а часам і больш, каб напрацаваць сваю сістэму. Але ў старшыні сельскага Савета вельмі мала часу — усяго 4 гады, каб траціць палову з іх на апрабацыю нейкага «ўласнага бачання». Асабіста я палічыла такі падыход немэтазгодным. Уключацца ў працу неабходна адразу, а для гэтага павінна існаваць **адзіная сістэма**, якая, так бы мовіць, транслявалася б з абласнога ўзроўню на раёны, з раёнаў — на сельсаветы.

Першая задача, якую мы перад сабой паставілі, ствараючы такую сістэму, — узняць статус старшыні сельскага Савета і цалкам выключыць з яго ўжытку слова «прасіць». Я ніяк не магла зразумець: чаму кіраўнік пярвічнага звяна ўлады ўвесь час павінен нешта ў некага прасіць? Тым больш, законам вызначана, што менавіта ён адказвае за жыццядзейнасць сваёй тэрыторыі, інакш кажучы, з'яўляецца паўнапраўным гаспадаром.

Тыя ж старшыні сельскіх Саветаў наведвалі райвыканкам хутчэй у ролі «ганаровых гасцей», чым у якасці заўсёднікаў — практычна толькі раз на месяц. Я была ўпэўнена, што гэта няправільна. Старшыня сельскага Савета дэпутатаў (ён жа — старшыня сельвыканкама) павінен напрасткі працаваць са старшынёй райвыканкама, якому таксама трэба быць у курсе ўсяго, што адбываецца на тэрыторыі сельсаветаў, а не толькі ў асобных гаспадарках. Таму мы ўвялі ў вобласці адзіную сістэму: старшыні сельскіх Саветаў абавязкова прысутнічаюць на планёрных нарадах у старшыні райвыканкама. Скажу шчыра: такое наваўвядзенне спадабалася далёка не ўсім. Адразу пасыпаліся пытанні: «А навошта?.. А як нам укладвацца ў ліміт паліва?..» Але сёння такія пытанні адпалі. Тыя, хто іх задаваў, зразумелі, як гэта важна, калі кіраўнік пярвічнага звяна ўлады прыязджае ў раён на планёрку не госцем, а паўнапраўным гаспадаром тэрыторыі, і ўжо як гаспадар можа вырашаць любое пытанне з раённымі службамі, якія там таксама прысутнічаюць.

У дадатак мы ўвялі ў практыку правядзенне планёрных нарад і ў старшыні сельвыканкама. Асобных старшыняў давялося элементарна вучыць, як праводзіць такія нарады з усімі службамі і арганізацыямі, што знаходзяцца на падначаленай тэрыторыі. Інакш кажучы, мы зламалі стэрэатыпы, у адпаведнасці з якімі старшыня сельскага Савета раніцай бег на планёрку да старшыні калгаса — прасіць. Цяпер для вырашэння пытанняў жыццезабеспячэння тэрыторыі прадстаўнікі ўсіх мясцовых службаў перыядычна збіраюцца ў старшыняў сельвыканкамаў. Спачатку апошнім даводзілася вельмі цяжка, у першую чаргу псіхалагічна: яны ж не прывыклі патрабаваць. Але пазней, калі сістэма ўкаранілася і пачала працаваць, я ўбачыла зусім іншых кіраўнікоў мясцовай улады: яны быццам плечы расправілі!..

Другая задача, якую мы імкнуліся рэалізаваць, — стварэнне нармальных умоў працы для органаў пярвічнай улады. Той жа адміністрацыйны будынак Людзяневіцкага сельвыканкама, што ў Жыткавіцкім раёне, можна ўзяць за ўзор. Лепшы можа быць, горшы — не хацелася б. У нас у вобласці 252 сельсаветы. Не скажу, што ўсе іх адміністрацыйныя будынкі выглядаюць на ўзроўні, але мы ў хуткім часе да гэтага прыйдзем... Як кошт касцюма першапачаткова сведчыць пра магчымасці яго ўладальніка, так і будынак сельвыканкама, яго аздабленне характарызуюць мясцовую ўладу. Сёлета мы каласальныя сродкі накіравалі на добраўпарадкаванне сельсаветаў, у тым ліку і на рамонт адміністрацыйных будынкаў.

Будынкі будынкамі, а на аўтарытэт улады працуюць перш за ўсё канкрэтныя людзі. Пагаджуся, што сёння на ўзроўні пярвічнай «гарызанталі» існуе пэўны кадравы дэфіцыт. Але калі нам удасца вырашыць трэцюю нашу задачу, ахвотных паспрабаваць свае сілы на пасадзе старшыні сельвыканкама, упэўнена, з'явіцца больш. Я маю на ўвазе добраўпарадкаванне тэрыторый — не толькі абкос ці вываз смецця, а ў першую чаргу выкарыстанне зямлі ў адпаведнасці з яе мэтавым прызначэннем. Пакуль мы з гэтым не разбярэмся і не перададзім тую зямлю, якая ў сельскіх населеных пунктах не выкарыстоўваецца, сельгаспрадпрыемствам, датуль праблемы добраўпарадкавання кардынальна не вырашацца. Трэба «ісці» не ад колькасці метраў пафарбаванай агароджы, а ад таго, колькі рэкультываванай зямлі перададзена ў севазварот.

Зразумела, што адзін старшыня сельскага Савета з такой працаёмкай задачай не справіўся б. Але сёння існуе даручэнне старшыні Гомельскага аблвыканкама, у адпаведнасці з якім кожны кіраўнік сельгаспрадпрыемства абавязаны літаральна штодзень выдзяляць адзінку тэхнікі ў распараджэнне сельвыканкама. І ўжо сельвыканкам курыруе на сваёй тэрыторыі і знос старых дамоў, і раскарчоўку, і апрацоўку глебы, і ўсё астатняе, што мае непасрэднае дачыненне да рэкультывацыі зямлі.

Тое, што немагчыма было «пацягнуць» у адзіночку, становіцца цалкам дасягальным, калі працуе каманда, калі дзейнічае сістэма «вобласць — раён — сельсавет».

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА С ПРИМЕНЕНИЕМ МЕТОДА ПОНИЖЕНИЯ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ

Повторный аукцион по продаже объектов коммунальной собственности г. Минска с применением метода понижения начальной цены (далее – аукцион) состоится 28 октября 2011 г. в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Организатор аукциона: Минский городской территориальный фонд государственного имущества, г. Минск, пр. Независимости, 8, каб. 227, конт. тел. (8017) 200 20 89.

На аукцион выставляются:

№ лота	лот № 1	лот № 2
Полные и сокращенные наименования объектов коммунальной собственности, место нахождения	Не завершенное строительством здание и сооружение блока доочистки «Минская станция аэрации, 3-я очередь» объекта «Канализационные очистные сооружения (расширение)» 1-я очередь, г. Минск, ул. Инженерная, 3, промузел «Шабаны»	Не завершенный строительством объект «Автоцентр скорой и неотложной медпомощи на 500 автомашин по ул. П. Бровки в г. Минске», г. Минск, ул. П. Бровки, 38А
Наименования единых предметов аукциона	Не завершенное строительством здание и сооружение блока доочистки «Минская станция аэрации, 3-я очередь» объекта «Канализационные очистные сооружения (расширение)» 1-я очередь и право заключения договора аренды земельного участка для его обслуживания	Не завершенный строительством объект «Автоцентр скорой и неотложной медпомощи на 500 автомашин по ул. П. Бровки в г. Минске» и право заключения договора аренды земельного участка для его обслуживания
Начальные цены единых предметов аукциона, руб.	16 597 934 969 белорусских рублей (в том числе: недвижимое имущество – 16 079 614 375 белорусских рублей, право заключения договора аренды земельного участка – 518 320 594 белорусских рубля)	10 859 283 257 белорусских рублей (в том числе: недвижимое имущество – 9 637 448 921 белорусский рубль, право заключения договора аренды земельного участка – 1 221 834 336 белорусских рублей)
Минимальные цены единых предметов аукциона, руб.	3 734 243 594 белорусских рубля (в том числе: недвижимое имущество – 3 215 923 000 белорусских рублей, право заключения договора аренды земельного участка – 518 320 594 белорусских рубля)	3 149 334 336 белорусских рубля (в том числе: недвижимое имущество – 1 927 500 000 белорусских рублей, право заключения договора аренды земельного участка – 1 221 834 336 белорусских рублей)
Размер задатка (рублей), срок и порядок его внесения, реквизиты расчетного счета	2 700 000 000 белорусских рублей до подачи заявления на участие в аукционе вносятся на р/с 3642000000015 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, код 153001795, УНП 100048181 Минского городского территориального фонда государственного имущества, **назначение платежа – задаток для участия в аукционе**	
Наименования продавцов	Государственное производственное объединение «Коммунальное хозяйство Мингорисполкома», 220037, г. Минск, ул. Червякова, 25, тел. (8017) 2332664, 2331059 (осмотр)	КУП «УКС Мингорисполкома», г. Минск, ул. Советская, д. 17, тел. (8017) 3285848 (осмотр)
Характеристики объектов коммунальной собственности	Начало строительства – 1988 г.; размеры в осях – 162,5 м х 54 м; отдельностоящее, одноэтажное здание, включающее в себя отделение барабанных сеток, отделение фильтров и галерею трубопроводов, служащих для подачи, распределения и отвода сточных вод на дополнительную доочистку; насосную станцию; административно-бытовой корпус; помещения трансформаторной подстанции; степень готовности объекта – 75%	В состав объекта входят: гараж-стоянка на 500 автомашин (здание представляет собой круглый восьмиэтажный объем диаметром 56 м и высотой этажа 3,3 м), административно-бытовая и производственная пристройка (двухэтажное здание с размерами в плане 24х30 м, высота первого этажа – 4,2 м, второго – 3,3 м; работы по внутренней отделке, внутренним инженерным сетям, благоустройству и монтажу технологического оборудования не производились; степень готовности объекта – 50%
Информация о земельных участках	Общая площадь – 2,5432 га; кадастровый номер земельного участка – 500000000002006709. Арендодатель земельного участка – Минский городской исполнительный комитет; срок аренды – 5 лет. Условия использования: для его дальнейшего использования в соответствии с утвержденной градостроительной документацией. Победителю аукциона в установленном порядке получить разрешение на разработку (корректировку) проектно-сметной документации по завершению строительства объекта. Беспрепятственный доступ к земельному участку победителю аукциона обеспечивает КУП «Минскводоканал»	Общая площадь – 1,3760 га с ограничениями в использовании земель – водоохранная зона водных объектов г. Минска, охранные зоны линий электропередач, трубопроводов и иных инженерных сооружений. Арендодатель земельного участка – Минский городской исполнительный комитет; срок аренды – 5 лет. Условия использования: в соответствии с регламентами генерального плана г. Минска – для дальнейшего использования под многофункциональный комплекс с многоярусной парковкой с объектами автосервиса легкового автотранспорта, под административные, торговые и иные функции, не противоречащие генеральному плану
Условия использования объектов коммунальной собственности	Освоение данной территории в соответствии с утвержденной градостроительной документацией	1. Освоение данной территории в соответствии с утвержденной градостроительной документацией. 2. Возмещение налога на добавленную стоимость проектно-изыскательских, строительно-монтажных и прочих работ в бюджет г. Минска в течение 30 дней с момента подписания договора купли-продажи с уточнением в УП «УКС Мингорисполкома» суммы налога на добавленную стоимость на момент перечисления. 3. Возмещение в течение 30 дней с момента подписания акта приема-передачи в бюджет г. Минска стоимости затрат на дополнительные проектно-изыскательские, строительно-монтажные и прочие работы, понесенных УП «УКС Мингорисполкома» на дату подписания акта приема-передачи. 4. Возмещение 8 655 995 рублей – стоимости работ по изготовлению ведомости технических характеристик объекта на р/с 3012016353515, отделение № 535 г. Минск, ОАО «Белинвестбанк», УНП 807000028, ОКПО 37558116, код банка 153001739, адрес банка: 220033, г. Минск, пр. Партизанский, 6а, РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 8, каб. 227, по рабочим дням с 9.00 до 17.00. Заявления принимаются с 20 по 27 октября 2011 года включительно.

Извещение о проведении открытого аукциона с применением метода понижения начальной цены опубликовано в газетах «Звязда» 19.08.2011 № 157 (27021), 28.09.2011 № 185 (27049); «Вечерний Минск» 20.08.2011 № 95 (12398), 29.09.2011 № 112 (12415).

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты его проведения.

Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, в том числе расходах, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, а также расходах, связанных с формированием земельных участков и изменением земельных участков в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этих участков (далее – затраты на организацию и проведение аукциона) доводится до сведения участников перед началом аукциона при заключительной регистрации.

В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником (далее – претендент на покупку), предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Минский горисполком в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона по продаже предмета аукциона принимает решение о предоставлении земельного участка победителю аукциона (претенденту на покупку). Победитель аукциона (претендент на покупку) в течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения обязан внести плату за право заключения договора аренды земельного участка и возместить затраты на организацию и проведение аукциона.

Победитель аукциона (претендент на покупку) в течение одного рабочего дня со дня оплаты должен представить копии платежных документов, названных выше, Организатору аукциона, после чего, не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке в соответствии с условиями аукциона Продавцом заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а Минским горисполкомом – договор аренды земельного участка.

Оплата за недвижимое имущество производится в течение 30 календарных дней с момента подписания договора купли-продажи.

Рассрочка внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка не предусмотрена.

Порядок и срок осмотра объектов установлен и производится Продавцами с 09.00 до 16.00 по будним дням с 20 по 27 октября 2011 г. включительно.

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»

Галоўны рэдактар НАРКЕВІЧ Уладзімір Браніслававіч.

Адказная за выпуск КАРПЕНКА Наталля.

Грамадскі савет: **НАВІЦКІ Г.В.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **БАЙКОЎ В.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **АЦЯСАЎ А.Я.**, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў; **СЦЕПАНЕНКА А.М.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **ПРЭДКА С.У.**, старшыня Ваўкавыскага раённага Савета дэпутатаў Гродзенскай вобласці; **МАКСІМЕНКА С.А.**, старшыня Азярыцка-Слабадскога сельскага Савета дэпутатаў.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН: 292 21 03;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 33.380. **Нумар падпісаны ў 19.30 19 кастрычніка 2011 года.**

МОЖНА І ДРАНІЧКАЎ!

Здаровае харчаванне

Прыхільнікі здаровага харчавання часам абсалютна неабгрунтавана выкрэсліваюць са свайго рацыёну адзін прадукт за другім — бо нешта чулі пра іх шкоду. Адначасова некаторыя з нас залішне захапляюцца тым ці іншым прадуктам. Аднак асноўным прынцыпам сапраўды здаровага харчавання быў і застаецца прынцып разнастайнасці. Самы карысны ў нашым разуменні прадукт можа стаць самым шкодным пры неразумным яго ўжыванні. І наадварот, самы шкодны ў нашым разуменні прадукт можа быць аб'ектыўна нармальным. Кропкі над «і» адносна некаторых прадуктаў, папулярных у нашага насельніцтва, расстаўляе начальнік аддзела харчавання і маркетынгавых даследаванняў Навукова-практычнага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па харчаванні, кандыдат біялагічных навук Людмила МЕЛЬНІКАВА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

БУЛЬБА.
Ці варта цалкам адмаўляцца ад смажанай бульбы і дранікаў?

— У першую чаргу мы гаворым пра тое, што смажаная бульба — страва каларыйная, а таму людзі, якія сочаць за вагой, не ўключаюць яе ў свой рацыён. З другога боку, у апошні час вельмі многа кажуць пра шкоду смажання бульбы, якая пры такім спосабе гатавання становіцца крыніцай акрыламіду — канцэрагеннага рэчыва, якое павышае рызыку анкалагічных захворванняў. Тым не менш, я б не стала расцэньваць атрыманыя даныя як рэальную пагрозу здароўю чалавека. **На сёння не існуе пацверджаных навуковых даных аб сувязі акрыламіду з рызыкай узнікнення раку ў чалавека.** Так што наўрад ці варта панікаваць з прычыны наяўнасці ў смажанай бульбе гэтага рэчыва. **У штодзённым жыцці кожны з нас сутыкаецца з дзясяткам розных канцэрагенных фактараў, у параўнанні з якімі порцыя смажанай бульбы выглядае абсалютна бяскрыўдна.**

Што да поўнага адмаўлення некаторых людзей ад ужывання бульбы, то я лічу яго неабгрунтаваным. Па-першае, з усёй гародніны бульба лічыцца самай багатай крыніцай энергіі. Па-другое, бялок бульбы вылучаецца высокай біялагічнай каштоўнасцю, паколькі ў яго састаў уваходзяць неабходныя арганізму амінакіслоты. Па-трэцяе, асаблівая каштоўнасць бульбы заключаецца ў тым, што яна з'яўляецца крыніцай калію, які іграе вялікую ролю ў падтрымцы работы сэрца. Бульба змяшчае калію значна больш, чым хлеб, мяса ці рыба. Сярод іншых мінеральных элементаў, якія ёсць у бульбе, варта назваць фосфар, кальцый, жалеза і магній. Бульба з'яўляецца, хоць і не самай багатай, але найбольш таннай крыніцай вітаміну С. У зваранай «у мундзіры» бульбіне застаецца каля 90 працэнтаў гэтага вітаміну, а ў ачышчанай і зваранай — каля 80.

Нарэшце, не зусім абгрунтаваным можна лічыць меркаванне, што ад бульбы папраўляюцца. Энергія адной вялікай бульбіны — гэта каля 418 кДж. Прыкладна столькі ж змяшчае яблык, апельсін ці грэйпфрут. Застаецца дадаць, што ў нашым цэнтры створаны і пастаўлены на вытворчасць напой «Мікола» — на аснове бульбянога соку. Рэкамендую пакаштаваць.

КАЎБАСА.
Няўжо наогул там адна «хімія»?

— Практычна ў любой галіне харчовай прамысловасці сёння прымяняюць харчовыя дабаўкі. Многія прадукты харчавання наогул не існавалі б без харчовых дабавак. Як вядома, тая ж соль, цукар, воцат і іншыя арганічныя кіслоты ёсць не што іншае, як кансерванты для самых розных прадуктаў.

Сучаснаму спажыўцу неабходна ўсвядоміць галоўнае: харчовыя дабаўкі, якія ўваходзяць у пералік дазволеных для выкарыстання Міністэрствам аховы здароўя нашай краіны, прымяняюцца ў канцэнтрацыях, якія вымяраюцца долямі працэнтаў, і гэта строга адсочваецца рознымі кантрольнымі службамі. Дазволеныя харчовыя дабаўкі ў вызначанай дозе не наносяць шкоды нашаму здароўю. З другога боку, у празмернай колькасці нават «бяскрыўдная» соль можа нанесці непапраўную шкоду.

Чытайце этыкетку, і калі вам не падабаецца вялікая колькасць дабавак, пазначаных на ёй, адмоўцеся ад гэтага прадукту. Зразумела, **лепей імкнуцца да таго, каб у штодзённым рацыёне было як мага больш простых прадуктаў, якія не праходзілі тэхналагічную апрацоўку ў прамысловых умовах.** Куплю замест каўбасы кавалак мяса і адварыце яго. **Калі ж вы жыць не можаце без каўбасных вырабаў, значыць, аддавайце перавагу тым гатункам, дзе больш мяса, менш тлушчу, крухмалу, раслінных кампанентаў і харчовых дабавак з індэксам Е. Добрым арыенцірам тут будзе абрэвіятура СТБ або ДАСТ (ГОСТ) на этыкетцы, паколькі дзяржаўны стандарт не дапускае выкарыстання соевага бялку і харчовых дабавак, акрамя нітрыту натрыю.**

АВАКАДА і ЛАСОСЬ.
Чым замяніць экзатычную садавіну і дарагія гатункі рыбы?

— Здароўе чалавека і нацыі ў цэлым у значнай ступені вызначаецца тыповым рацыёнам харчавання, прынятым у канкрэтным рэгіёне на працягу некалькіх стагоддзяў. Авакада не ўваходзіла ў штодзённы рацыён сяроднестатыстычнага беларуса. Быць здаровым і прыгожым можна і без падобных прадуктаў. Калі ласка, замест авакада ўжывайце больш нашай, мясцовай гародніны, садавіны і ягад, якія таксама змяшчаюць шмат антыаксідантаў, мінеральных рэчываў — магній, калій, жалеза і г.д., вітаміны групы А, С, В і Е. Карысці будзе не менш. Наогул рацыён чалавека павінен складацца з бялкоў, тлушчаў, вугляводаў, мінеральных рэчываў, мікра- і макраэлементаў, вітамінаў. Пры непаўнавартым харчаванні будзе парушацца абмен рэчываў, дзейнасць страваваль най, сардэчна-сасудзістай, нервовай і іншых сістэм. Таму ў рацыёне кожнага чалавека павінны прысутнічаць разнастайныя прадукты, у тым ліку мяса, рыба, гародніна і садавіна. Адмаўляцца ад прадуктаў з мяса не варта, паколькі гэта крыніца незаменных амінакіслот, жалеза і вітамінаў групы В. Асабліва важнае жалеза, якое цяжка ў дастатковай колькасці атрымаць з раслінных прадуктаў.

Рыба таксама з'яўляецца адной з крыніц паўнацэннага бялку, акрамя таго, яна змяшчае вітамін Д і фосфар. Тлустыя гатункі марской рыбы, да якіх адносіцца лосось, багатыя ненасычанымі тлустымі кіслотамі і ёдам. Але ўсё гэта ёсць і ў іншых гатунках рыбы, напрыклад, у селядцы і скумбрыі.

МАЯНЭЗ.
Каму наогул нельга ўжываць?

— Маянэз — гэта густы соус, які робіцца з ачышчанага алею, яечнага жаўтка, гарчыцы, солі, цукру, воцату, спецый і, вядома, харчовых дабавак. У маянэзе досыць вялікая колькасць вітамінаў А і Е, мала бялкоў і вугляводаў, але шмат тлушчу. У залежнасці ад рэцэптуры можа змяшчаць 35-70 працэнтаў тлушчаў. З-за таго, што маянэз адносіцца да высокакаларыйных прадуктаў, падчас гатавання розных страў яго варта выкарыстоўваць ва ўмеранай колькасці, асабліва людзям, якія пакутуюць ад лішняй вагі. **Не варта ўключаць маянэз хіба ў рацыён дзяцей малодшага школьнага ўзросту, а таксама ў час цяжарнасці. Адмовіцца ад гэтага прадукту павінны і пажылыя людзі.**

КАНСЕРВЫ.
Ежа выключных выпадкаў?

— Сокі ў пакетах, рыба ў бляшанках — гэта кансерваваныя прадукты, не прызначаныя для штодзённага ўжывання. Іх добра ўзяць з сабой у паход, на дачу, у паездку ў машыне, а дома лепей ужываць свежаадціснутыя сокі, паколькі так захоўваецца больш вітамінаў, і адвараную, запечаную або смажаную скумбрыю.

Святлана БАРЫСЕНКА.

ЗАКУРЫЎ І НЕ ПРАЧНУЎСЯ. І ГОСЦЯ ЗАГУБІЎ

Трагедыя ў вёсцы В. Арлы Столінскага раёна здарылася ўвечары: пры пажары ў прыватным доме загінулі двое...

Пасля выкліку падраздзяленні МНС былі на месцы здарэння праз восем хвілін, а яшчэ праз дзевяць — ужо лакалізавалі пажар. У адным з пакояў на канапе пажарныя знайшлі загінулага гаспадара дома, грамадзяніна 1946 года нараджэння. Ён закурыў перад сном, а прачнуцца ўжо не змог... Яго госць, мужчына, на 13 гадоў маладзейшы, спрабаваў пакінуць памяшканне, аднак, надыхаўшыся дыму, так і не здолеў дабрацца да выхаду: яго цела знайшлі літаральна ў некалькіх кроках ад выратавальных дзвярэй.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Беларускі бізнэс збіраецца лічыць індэкс дзелавога аптымізму

Ён будзе падлічвацца і публікавацца кожны квартал. Як паведаміў Уладзімір КАРАГІН, старшыня Мінскага сталічнага саюза прадпрымальнікаў і працадаўцаў, індэкс дзелавога аптымізму будзе складацца з некалькіх дзясяткаў параметраў, а выбарка будзе рабіцца з 500 прадпрымальнікаў і прадпрыемстваў: гэта будуць як індывідуальныя прадпрымальнікі, так і малыя, сярэднія і буйныя прадпрыемствы з усёй краіны.

— Да вылічэння індэкса дзелавога аптымізму мы зараз прыцягваем экспертаў, сацыёлагаў з нашай краіны, а таксама замежных спецыялістаў — каб гэта даследаванне было дакладным, — расказвае Уладзімір Мікалаевіч. — Пытанні будуць простыя: вы плануеце павялічыць колькасць работнікаў на наступны квартал або паменшыць? Плануеце прадаць прадукцыі болей або меней? Будуць дзясяткі падобных пытанняў. Займацца апытаннем будуць падрыхтаваныя людзі з бізнэс-асацыяцый у рэгіёнах, потым будзем гэта аналізаваць і кожны квартал збіраць прэс-канферэнцыю.

Пры гэтым Уладзімір Карагін патлумачыў, што такі індэкс дапаможа рэальна паказваць, наколькі паляпшаецца дзелавы клімат у краіне. Бо, па яго словах, на сёння ў бізнэсу і ў прадстаўнікоў дзяржорганаў пакуль розныя крытэрыі вымярэння:

— У чыноўнікаў зусім іншы падыход да маніторынгу, да ацэнкі падзей. Напрыклад, яны лічаць нейкі пункт плана па рэалізацыі палажэнняў Дырэктывы № 4 выкананым, калі падрыхтаваны праект указа Прэзідэнта або праект закона. А мы, бізнэс, кажам, што падрыхтоўка праекта — гэта яшчэ не выкананне. Бо калі прадпрымальнік рэальна бачыць, што знік нейкі падатак або адміністрацыйная працэдура, калі з-за гэтага ў яго атрымаўся прыбытак — то вось тады нешта можна лічыць выкананым. А калі гэтага няма, то гэта проста страсанне паветра...

Павел БЕРАСНЕЎ.

Вітаўтас Жэймантас: цяпер і пазаштатнік «Звязды»

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Член Саюза пісьменнікаў Беларусі, вядомы літоўскі журналіст і публіцыст Вітаўтас Жэймантас наведаў учора рэдакцыю «Звязды».

Падчас сустрэчы з рэдкалегіяй Вітаўтас Мечыслававіч узгадаў былых звяздоўцаў, з якімі калісьці працаваў разам, а таксама падзяліўся планамі наконт супрацоўніцтва з нашай газетай.

— З Беларуссю мяне звязваюць прыемныя і цёплыя ўспаміны, — адзначыў літоўскі калега. — Шкада, што сёння, каб трапіць у Мінск з Вільнюса, трэба афармляць візу. Нават у ЗША ці Аўстралію віза мне не патрэбна, а тут — суседкі Беларусь і Расія, а без візы — ніяк.

Вітаўтас Жэймантас расказаў пра асаблівасці сваёй новай кнігі (іх у яго ўжо больш за дзесяць — ад публіцыстыкі да кнігі вершаў), якая будзе прысвечаная беларускім паэтам-святарам — выпускнікам Віленскай духоўнай семінарыі — і іх працы ў папулярызацыі беларускай мовы. У прыватнасці, у кнігу ўвойдуць такія імёны, як Казімір Свояк, Адам Станкевіч, Янка Семашкевіч, Вінцэнт Гадлеўскі, Андрэй Зязюля і інш.

— Усіх беларусаў, з якімі даводзілася перапісвацца, я прасіў, каб яны пісалі па-беларуску. Калі Лідзія Арабей даслала мне кнігу Цёткі на беларускай мове — гэта была першая прачытаная мной кніжка па-беларуску — я быў у захапленні. Праўда, незразумелыя словы давялося перакладаць праз інтэрнэт — на жаль, нават і сёння я не сустрэў яшчэ ніводнага беларуска-літоўскага слоўніка.

У планах журналіста — пераклад на літоўскую мову кніг беларускамоўных аўтараў. Вітаўтас Жэймантас жыве і працуе ў Вільнюсе. У мінулым ён узначальваў «Вечаровыя навіны Літвы», сёння — рэдактар і складальнік энцыклапедычнага даведніка «Журналісты Літвы».

Вітаўтас Жэймантас распавёў пра развіццё літоўскіх СМІ, адзначыўшы, што літоўскіх тэлеканалаў, якія вяшчаюць у краіне, налічваецца ажно сорак, прычым пятнаццаць з іх — на літоўскай мове.

Чакаем першых публікацый літоўскага пазаштатнага карэспандэнта «Звязды» Вітаўтаса Жэймантаса.

Ілья ЛАПАТО.

Спорт-тайм

«ДЫНАМА» ПЕРАМАГЛО «НАФТАХІМІК» У СЕРЫІ БУЛІТАЎ

Мінскае «Дынама» правяло другі матч выязной серыі, дзе сустракалася з ніжнякамскім «Нафтахімікам». Гэта, вядома, не «Ак Барс», які экзаменаваў дынамаўцаў у мінулым матчы, але і тут наш клуб не здолеў узяць ачкі па максімуму.

Ужо ў сярэдзіне першага перыяду «Дынама» саступала 0:2. Але адыгрывацца наша каманда ўмее, і другія перыяды ў яе не заўсёды правальныя, што і было прадэманстравана ў другой трэці. Намаганнямі Лукаша Крайчака і Чарльза Лінглета лік стаў роўным — 2:2. Трэці перыяд прайшоў без закінутых шайбаў. А ў серыі булітаў Плат і Іргл свае выхады рэалізавалі, а вось нашага Мезіна прабіць Дзямагін і Палыгалаў не здолелі — 3:2.

Пасля матчу Марэк Сікора пахваліў каманду і зазначыў, што яна не хацела прайграваць:

— Калі прапусцілі два галы, хоць і рыхтаваліся гуляць па-іншаму, падумаў, што сёння прыйдзецца цяжка. Але каманда не хацела прайграваць, гэта было відаць па атмасферы на лаўцы, яна, калі так можна сказаць, жыла. Таму і здолелі пераламіць ход матчу.

Гэта, дарэчы, была чацвёртая валявая перамога дынамаўцаў у сезоне. Наступны матч мінчане правядуць сёння ва Уфе супраць дзейнага ўладальніка Кубка Гагарына «Салавата Юлаева».

«РЭАЛ» РАЗГРАМІЎ «ЛІЁН», А ЦСКА — «ТРАБЗОНСПОР»

У аўторак прайшлі першыя матчы трэцяга тура Лігі чэмпіёнаў. У групе D сустракаліся мадрыдскі «Рэал» і французскі «Ліён». Іспанскі клуб яшчэ раз даказаў перавагу іспанскага футбола — 4:0, а магло быць і 5:0, калі б, скажам, не недарэчны афсайд Раналду. «Ліён» красамоўна даказаў, што такія вынікі, як БАТЭ — «Барселона» — 0:5 зусім не адзінкавыя ў групавой стадыі. Тым больш што «Рэал» — гэта ўжо не «Барселона», а БАТЭ — яшчэ далёка не «Ліён».

З першым месцам у групе D усё зразумела, а вось на другое, акрамя французаў, прэтэндуе «Аякс», які перайграў на выездзе загрэбскае «Дынама» (2:0). Становішча камандаў: «Рэал» — 9, «Аякс» — 4, «Ліён» — 4, «Дынама» — 0. Вынікі ў астатніх групах. Група «А»: «Манчэстар Сіці» — «Вільярэал» — 2:1; «Напалі» — «Баварыя» — 1:1. Становішча камандаў: «Баварыя» — 7, «Напалі» — 5, «Манчэстар Сіці» — 4, «Вільярэал» — 0. Група «В»: «Ліль» — «Інтэр» - 0:1; ЦСКА — «Трабзонспор» — 3:0. Становішча камандаў: «Інтэр» — 6, ЦСКА — 4, «Трабзонспор» — 4, Ліль — 2. Група «С»: «Базэль» — «Бенфіка» — 0:2; «Ацэлул» — «Манчэстар Юнайтэд» — 0:2. Становішча камандаў: «Бенфіка» — 7, «Манчэстар Юнайтэд» — 5, «Базэль» — 4, «Ацэлул» — 0.

Алена КРАВЕЦ.

ПА ТАННУЮ БУЛЬБУ І КАПУСТУ

Восеньскія кірмашы ў Магілёўскай вобласці працягваюцца. Яны будуць ладзіцца кожныя выхадныя аж да 5 лістапада. Сельгасвытворцы — буйныя прадпрыемствы, фермеры і прыватнікі — паспяхова прадаюць сваю прадукцыю гараджанам па прымальных цэнах. Людзі набываюць бульбу, моркву, буракі, капусту і іншую агародніну звычайна мяхамі: оптам атрымліваецца яшчэ танней. Бульба каштуе 1000-1200 за кілаграм, капуста — ад 700 рублёў за кілаграм.

Ілона ІВАНОВА.

Рашэнне Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь

АБ ДЗЕЯННІ ЗАКОНАЎ АБ АМНІСТЫІ Ў ЧАСЕ

Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь у складзе старшынствуючага — Старшыні Канстытуцыйнага Суда Міклашэвіча П.П., суддзяў Бойка Т.С., Варановіча Т.В., Данілюка С.Я., Ізоткі У.П., Козыравай Л.Р., Падгрушы В.В., Рабцава Л.М., Сяргеевай В.Г., Цікавенкі А.Г., Чыгрынава С.П.

на падставе часткі восьмай артыкула 22 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб судаўладкаванні і статусе суддзяў

у парадку рэалізацыі права на ўнясенне Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, у палаты Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, іншыя дзяржаўныя органы ў адпаведнасці з іх кампетэнцыяй прапаноў аб неабходнасці ўнясення ў акты заканадаўства змяненняў і (або) дапаўненняў, а таксама права на ўнясенне ў дзяржаўныя органы і іншыя арганізацыі іншых прапаноў, якія вынікаюць з кампетэнцыі Канстытуцыйнага Суда,

з удзелам прадстаўнікоў:

Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь — Калінковіча В.Л., намесніка Старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь;

Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь — Гарошкі Ю.І., начальніка аддзела па нагляду за законнасцю выканання крымінальных пакаранняў Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь;

Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь — Барсукова А.П., начальніка Дэпартамента выканання пакаранняў Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь,

разгледзеў у судовым пасяджэнні зварот Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь па пытанню дзеяння законаў аб амністыі ў часе.

Прааналізаваўшы палажэнні Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (далей — Канстытуцыя), Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (далей — КК), Закона Рэспублікі Беларусь «Аб нарматыўных прававых актах Рэспублікі Беларусь» і іншых заканадаўчых актаў Рэспублікі Беларусь, а таксама меркаванні зацікаўленых дзяржаўных органаў і іншых арганізацый, Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь устанавіў наступнае.

1. У звароце Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь указваецца, што па практыцы, якая склалася ў дачыненні да асоб, якія ўчынілі злачынствы да ўступлення ў сілу закона аб амністыі і асуджаны судом да пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі пасля заканчэння тэрміну выканання дадзенага закона, амністыя не прымяняецца.

У сувязі з адсутнасцю ў заканадаўстве афіцыйнага тлумачэння па пытанню дзеяння законаў аб амністыі ў часе і з мэтай выпрацоўкі аднастайнай практыкі прымянення гэтых законаў Генеральная пракуратура просіць выкласці пазіцыю аб тым, ці з'яўляюцца законы аб амністыі бестэрміновымі нарматыўнымі прававымі актамі.

Прадстаўленыя Канстытуцыйнаму Суду меркаванні дзяржаўных органаў і іншых арганізацый сведчаць аб адсутнасці аднастайнага разумення імі прававой рэгламентацыі тэрмінаў дзеяння і тэрмінаў выканання законаў аб амністыі.

Так, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і Нацыянальны цэнтр заканадаўства і прававых даследаванняў Рэспублікі Беларусь лічаць, што законы аб амністыі дзейнічаюць бестэрмінова і не спыняюць свайго дзеяння пасля заканчэння ўказаных у іх тэрмінаў выканання.

Па меркаванню Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, амністыя, што не прадугледжвае выканання дадатковых патрабаванняў у перыяд яе выканання, павінна прымяняцца да ўсіх асоб, якія ўчынілі злачынствы да ўступлення закона аб амністыі ў сілу, на працягу ўсяго часу захавання крымінальна-прававых адносін.

Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь звяртае ўвагу на тое, што законы аб амністыі, як правіла, змяшчаюць нормы, якія абмяжоўваюць дзеянне асобных палажэнняў гэтых законаў пэўнымі часовымі рамкамі, што не супярэчыць Канстытуцыі і Закону «Аб нарматыўных прававых актах Рэспублікі Беларусь».

Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь указвае, што законы аб амністыі з'яўляюцца бестэрміновымі нарматыўнымі прававымі актамі толькі ў дачыненні да тых асоб, якія з'яўляліся суб'ектамі амністыі ў перыяд яе выканання, але па аб'ектыўных прычынах яна не была да іх прыменена.

Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь лічыць, што законы аб амністыі з'яўляюцца актамі разавага характару, якія разлічаны на прымяненне на працягу пэўнага тэрміну, але дапускаюць пры пэўных умовах іх прымяненне і пасля заканчэння ўказаных у гэтых законах тэрмінаў выканання.

2. Ацэньваючы паўнату заканадаўчага рэгулявання дзеяння законаў аб амністыі ў часе, Канстытуцыйны Суд выходзіць з наступнага.

Згодна з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь — дэмакратычная сацыяльная прававая дзяржава, у якой чалавек, яго правы, свабоды і гарантыі іх рэалізацыі з'яўляюцца найвышэйшай каштоўнасцю і мэтай грамадства і дзяржавы (частка першая артыкула 1, частка першая артыкула 2); забеспячэнне правоў і свабод грамадзян Рэспублікі Беларусь з'яўляецца найвышэйшай мэтай дзяржавы (частка першая артыкула 21); усе роўныя перад законам і маюць права без усякай дыскрымінацыі на роўную абарону правоў і законных інтарэсаў (артыкул 22); Канстытуцыя валодае найвышэйшай юрыдычнай сілай; законы, дэкрэты, указы і іншыя акты дзяржаўных органаў выдаюцца на падставе і ў адпаведнасці з Канстытуцыяй (частка першая артыкула 137).

Парламент Рэспублікі Беларусь пры ажыццяўленні замацаваных у артыкулах 97 і 98 Канстытуцыі паўнамоцтваў па прыняцці законаў аб амністыі зыходзіць з прыярытэту абароны ў прававой дзяржаве правоў і свабод асобы, канстытуцыйнага абавязку дзяржавы забяспечваць грамадскую бяспеку.

Канстытуцыйны Суд звяртае ўвагу на канстытуцыйна-прававую прыроду амністыі, якая з'яўляецца актам гуманізму дзяржавы, накіраваным на вызваленне пэўных катэгорый асоб, якія ўчынілі злачынствы, ад крымінальнай адказнасці і пакарання, змякчэнне або ўстараненне прававых вынікаў назначанага пакарання, заснаваным на прынцыпах справядлівасці, роўнасці правоў грамадзян, суразмернасці і балансу канстытуцыйных каштоўнасцей у галіне процідзеяння правапарушэнням.

Законы аб амністыі не ўстараняюць злачыннасць і каральнасць дзеянняў, прадугледжаных КК. Такія законы вызваляюць ад крымінальнай адказнасці і пакарання, змякчаюць або ўстараняюць прававыя вынікі пакарання толькі ў дачыненні да пэўных катэгорый асоб, якія ўчынілі злачынныя дзеянні да ўступлення іх у сілу. Законы аб амністыі таксама не ставяць пад сумненне законнасць, абгрунтаванасць і справядлівасць прыгавораў.

3. Згодна з канстытуцыйным прынцыпам вяршэнства права дзяржава, усе яе органы і службовыя асобы дзейнічаюць у межах Канстытуцыі і прынятых у адпаведнасці з ёй актаў заканадаўства (часткі першая і другая артыкула 7 Канстытуцыі).

Законы аб амністыі, якія прымаюцца Парламентам Рэспублікі Беларусь, маюць асаблівасці, але пры гэтым адпавядаюць усім агульным патрабаванням, што прад'яўляюцца да нарматыўнага прававога акта ў адпаведнасці з Законам «Аб нарматыўных прававых актах Рэспублікі Беларусь».

Так, згодна з артыкулам 66 вышэйназванага Закона нарматыўны прававы акт дзейнічае бестэрмінова, калі ў яго тэксце не агаворана іншае. Часовы тэрмін дзеяння можа быць устаноўлены для ўсяго нарматыўнага прававога акта або яго частак. У гэтым выпадку ў нарматыўным прававым акце (яго частцы) павінны быць указаны тэрмін дзеяння нарматыўнага прававога акта або падзея, пры наступленні якой нарматыўны прававы акт страчвае сілу. Пасля заканчэння ўказанага тэрміну або пры наступленні ўказанай у нарматыўным прававым акце падзеі нарматыўны прававы акт (яго частка) аўтаматычна страчвае сілу. Да заканчэння ўстаноўленага тэрміну орган (службовая асоба), які прыняў (выдаў) нарматыўны прававы акт, можа прыняць рашэнне аб прадаўжэнні дзеяння нарматыўнага прававога акта (яго часткі) на новы тэрмін або аб наданні яму бестэрміновага характару.

Пасля прыняцця Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 года законы аб амністыі выдаваліся дзесяць разоў: 13 красавіка 1995 г., 5 лістапада 1996 г., 18 студзеня 1999 г., 14 ліпеня 2000 г., 15 ліпеня 2002 г., 8 студзеня 2004 г., 5 мая 2005 г., 22 лістапада 2007 г., 5 мая 2009 г., 1 ліпеня 2010 г. Аналіз гэтых законаў сведчыць аб тым, што ў іх адсутнічаюць палажэнні, якія ўстанаўліваюць тэрмін іх дзеяння.

Норма аб тэрміне выканання закона (шэсць месяцаў з дня ўступлення яго ў сілу), якая змяшчаецца ва ўсіх законах аб амністыі, ускладае на ўпаўнаважаныя органы абавязак выканаць у пэўны тэрмін прадпісанні дадзеных законаў у дачыненні да асоб, прыцягнутых да крымінальнай адказнасці або асуджаных, не ўстанаўліваючы пры гэтым граніц дзеяння амністыі ў часе. Амністыя з'яўляецца бестэрміновым актам, у сферу дзеяння якога трапляюць асобы, якія ўчынілі злачынствы да ўступлення закона аб амністыі ў сілу і на якіх у адпаведнасці з прадугледжанымі кожным канкрэтным законам аб амністыі крытэрыямі распаўсюджваецца дзеянне амністыі.

У сувязі з выкладзеным Канстытуцыйны Суд лічыць, што нормы Закона «Аб нарматыўных прававых актах Рэспублікі Беларусь» з дастатковай паўнатой і дакладнасцю рэгламентуюць дзеянне нарматыўных прававых актаў, якія ўступілі ў законную сілу ў часу, не прадугледжваючы пры гэтым якіх-небудзь выключэнняў, у тым ліку для законаў аб амністыі.

4. Згодна з артыкулам 95 КК амністыя прымяняецца на падставе закона Рэспублікі Беларусь у дачыненні да індывідуальна-неакрэсленага кола асоб (частка 1); на падставе акта амністыі асоба, якая ўчыніла злачынства, можа быць вызвалена ад крымінальнай адказнасці, а асоба, асуджаная за злачынства, можа быць пры гэтым вызвалена ад пакарання як асноўнага, так і дадатковага, або вызвалена ад пакарання вінаватых асоб, змякчэнне або ўстараненне прававых вынікаў назначанага пакарання, заснаванае на прынцыпах справядлівасці, роўнасці правоў грамадзян, суразмернасці і балансу канстытуцыйных каштоўнасцей у галіне процідзеяння правапарушэнням.

Законы аб амністыі не ўстараняюць злачыннасць і каральнасць дзеянняў, прадугледжаных КК. Такія законы вызваляюць ад крымінальнай адказнасці і пакарання, змякчаюць або ўстараняюць прававыя вынікі пакарання толькі ў дачыненні да пэўных катэгорый асоб, якія ўчынілі злачынныя дзеянні да ўступлення іх у сілу. Законы аб амністыі таксама не ставяць пад сумненне законнасць, абгрунтаванасць і справядлівасць прыгавораў.

3. Згодна з канстытуцыйным прынцыпам вяршэнства права дзяржава, усе яе органы і службовыя асобы дзейнічаюць у межах Канстытуцыі і прынятых у адпаведнасці з ёй актаў заканадаўства (часткі першая і другая артыкула 7 Канстытуцыі).

Законы аб амністыі, якія прымаюцца Парламентам Рэспублікі Беларусь, маюць асаблівасці, але пры гэтым адпавядаюць усім агульным патрабаванням, што прад'яўляюцца да нарматыўнага прававога акта ў адпаведнасці з Законам «Аб нарматыўных прававых актах Рэспублікі Беларусь».

Так, згодна з артыкулам 66 вышэйназванага Закона нарматыўны прававы акт дзейнічае бестэрмінова, калі ў яго тэксце не агаворана іншае. Часовы тэрмін дзеяння можа быць устаноўлены для ўсяго нарматыўнага прававога акта або яго частак. У гэтым выпадку ў нарматыўным прававым акце (яго частцы) павінны быць указаны тэрмін дзеяння нарматыўнага прававога акта або падзея, пры наступленні якой нарматыўны прававы акт страчвае сілу. Пасля заканчэння ўказанага тэрміну або пры наступленні ўказанай у нарматыўным прававым акце падзеі нарматыўны прававы акт (яго частка) аўтаматычна страчвае сілу. Да заканчэння ўстаноўленага тэрміну орган (службовая асоба), які прыняў (выдаў) нарматыўны прававы акт, можа прыняць рашэнне аб прадаўжэнні дзеяння нарматыўнага прававога акта (яго часткі) на новы тэрмін або аб наданні яму бестэрміновага характару.

Пасля прыняцця Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 года законы аб амністыі выдаваліся дзесяць разоў: 13 красавіка 1995 г., 5 лістапада 1996 г., 18 студзеня 1999 г., 14 ліпеня 2000 г., 15 ліпеня 2002 г., 8 студзеня 2004 г., 5 мая 2005 г., 22 лістапада 2007 г., 5 мая 2009 г., 1 ліпеня 2010 г. Аналіз гэтых законаў сведчыць аб тым, што ў іх адсутнічаюць палажэнні, якія ўстанаўліваюць тэрмін іх дзеяння.

Норма аб тэрміне выканання закона (шэсць месяцаў з дня ўступлення яго ў сілу), якая змяшчаецца ва ўсіх законах аб амністыі, ускладае на ўпаўнаважаныя органы абавязак выканаць у пэўны тэрмін прадпісанні дадзеных законаў у дачыненні да асоб, прыцягнутых да крымінальнай адказнасці або асуджаных, не ўстанаўліваючы пры гэтым граніц дзеяння амністыі ў часе. Амністыя з'яўляецца бестэрміновым актам, у сферу дзеяння якога трапляюць асобы, якія ўчынілі злачынствы да ўступлення закона аб амністыі ў сілу і на якіх у адпаведнасці з прадугледжанымі кожным канкрэтным законам аб амністыі крытэрыямі распаўсюджваецца дзеянне амністыі.

У сувязі з выкладзеным Канстытуцыйны Суд прыходзіць да высновы аб адсутнасці прабелаў у заканадаўчым рэгуляванні ў частцы вызначэння дзеяння законаў аб амністыі ў часе. Пры гэтым трэба ўлічваць, што акты аб амністыі разлічаны на прымяненне ў дачыненні да індывідуальна-неакрэсленага кола асоб. Адпаведна, паколькі пытанне аб прымяненні амністыі вырашаецца адпаведным органам у дачыненні да кожнай асобы індывідуальна, то пры прыняцці такіх рашэнняў правапрымяняльнікі павінны ўлічваць у сукупнасці як выкладзеныя ў законах аб амністыі крытэрыі вызначэння асоб, якія падлягаюць амністыі, так і ўмовы прымянення амністыі, што дазволіць забяспечыць адназначнае разуменне і аднастайнае прымяненне законаў аб амністыі.

На падставе выкладзенага, кіруючыся часткай восьмай артыкула 22, часткамі другой і чатырнаццатай артыкула 24 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб судаўладкаванні і статусе суддзяў, Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь

ВЫРАШЫЎ:

1. Выходзячы з прынцыпаў вяршэнства права і прававой дакладнасці, палажэнняў артыкула 137 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, прызнаць, што прабелаў у заканадаўчым рэгуляванні ў частцы вызначэння дзеяння законаў аб амністыі ў часе не існуе і на гэтыя законы ў поўнай меры распаўсюджваюцца нормы Закона Рэспублікі Беларусь «Аб нарматыўных прававых актах Рэспублікі Беларусь».

2. Адзначыць, што, рэалізуючы замацаваныя ў артыкулах 97 і 98 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь паўнамоцтвы па прыняццю законаў аб амністыі, Парламент Рэспублікі Беларусь мае права ўстанаўліваць у гэтых законах крытэрыі іх прымянення, у тым ліку вызначаць кола асоб, якія падлягаюць амністыі, умовы прымянення амністыі і тэрміны выканання законаў аб амністыі.

3. Звярнуць увагу Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь і іншых правапрымяняльных органаў на тое, што для правільнага прымянення амністыі да канкрэтных асоб неабходна ўлічваць у сукупнасці ўстаноўленыя заканадаўцам у законах аб амністыі крытэрыі вызначэння асоб, якія падлягаюць амністыі, умовы прымянення амністыі, адрозніваючы пры гэтым тэрміны дзеяння і тэрміны выканання гэтых законаў.

4. Гэта рашэнне ўступае ў сілу з дня прыняцця.

5. Апублікаваць гэта рашэнне ў адпаведнасці з заканадаўствам.

Старшынствуючы — Старшыня Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь П.П. МІКЛАШЭВІЧ

11 кастрычніка 2011 г., г. Мінск № Р-628/2011

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ по продаже государственного имущества и права заключения договора аренды земельного участка с применением метода понижения начальной цены

| Наименование предмета аукциона | Государственное имущество и право заключения договора аренды земельного участка | Здание столярного цеха и право заключения договора арен

Международный Резервный Банк

ОАО «Международный резервный банк»
220075, г. Минск, пер. Промышленный, 11
тел./факс: (017) 299 69 00, тел. (017) 299 69 02
e-mail: info@irb.by

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС НА 1 октября 2011 г.
ОАО «Международный резервный банк»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	на 01.10.2011 г.	на 01.10.2010 г.
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101		1 408,3	850,5
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102			
4	Средства в Национальном банке	1103		142,8	4 605,7
5	Средства в банках	1104		10 840,4	1 394,3
6	Ценные бумаги	1105			
7	Кредиты клиентам	1106		17 376,0	9 123,7
8	Производные финансовые активы	1107			576,6
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108		-	-
10	Основные средства и нематериальные активы	1109		798,8	918,0
11	Имущество, предназначенное для продажи	1110			
12	Прочие активы	1111		1 608,4	1 197,7
13	**ИТОГО активы**	**11**		**32 174,7**	**18 666,5**
14	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
15	Средства Национального банка	1201		-	-
16	Средства банков	1202		3 102,9	
17	Средства клиентов	1203		798,0	1 014,7
18	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204		-	-
19	Производные финансовые обязательства	1205			574,4
20	Прочие обязательства	1206		2 424,2	-185,9
21	ВСЕГО обязательства	120		6 325,1	1 403,2
22	**КАПИТАЛ**				
23	Уставный фонд	1211		16 137,8	16 137,8
24	Эмиссионный доход	1212		-	-
25	Резервный фонд	1213		657,3	313,8
26	Фонд переоценки статей баланса	1214		174,2	66,2
27	Накопленная прибыль	1215		8 880,3	745,5
28	ВСЕГО капитал	121		25 849,6	17 263,3
29	**ИТОГО обязательства и капитал**	**12**		**32 174,7**	**18 666,5**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 октября 2011 г.
ОАО «Международный резервный банк»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	на 01.10.2011 г.	на 01.10.2010 г.
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		1 418,4	1 234,2
2	Процентные расходы	2012		199,8	24,4
3	Чистые процентные доходы	201		1 218,6	1 209,8
4	Комиссионные доходы	2021		6 376,8	3 753,5
5	Комиссионные расходы	2022		368,9	244,6
6	Чистые комиссионные доходы	202		6 007,9	3 508,9
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203			
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204			274,4
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205		1 833,2	613,3
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206		7 856,8	
11	Чистые отчисления в резервы	207		498,6	346,7
12	Прочие доходы	208		533,6	209,5
13	Операционные расходы	209		5 963,7	3 932,9
14	Прочие расходы	210		400,1	1 536,0
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211		10 587,7	0,3
16	Налог на прибыль	212		2 452,7	0,0
17	**ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)**	**2**		**8 135,0**	**0,3**

И.о. Председателя Правления **В.Н. Павлюк**
Главный бухгалтер **С.С. Ящук**
Дата подписания 18 октября 2011 г.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 26 от 01.01.2010 г.
Кор/счет 3200007350013 в РЦ НБ РБ, МФО 153001735. УНП 807000043.

Форум

СПРАВА МАЙСТРА БАІЦЦА.

КАЛІ Ў ТАГО ДОБРЫ ІНСТРУМЕНТ

«У якасці нашага тавару кліенты ўпэўненыя», — сцвярджае Дзмітрый Балабановіч.

З 18 па 21 кастрычніка ў Мінску ў выставачным комплексе па вуліцы Янкі Купалы, 27 наведнікаў будуць прымаць міжнародная спецыялізаваная выстава «Будэкспа. Восень-2011» і міжнародная спецыялізаваная выстава-кірмаш «Увесь інструмент-2011». На першай удзельнікі форуму дэманструюць будаўнічыя матэрыялы, тэхналогіі і абсталяванне для будаўніцтва, на другой — інструмент для ўсіх галін прамысловасці і побыту.

Увагу журналістаў «Звязды» (магчыма, суб'ектыўна — спрачацца не будзем) прыцягнулі ў першую чаргу менавіта тыя экспаненты, якія займаюцца рэалізацыяй інструментаў. Нават вонкава іх стэнды выгадна адрозніваліся за кошт «жыўцом» прадстаўленага асартыменту. Электраінструменты, аснастка да іх, бензаінструменты, садовая тэхніка, будаўнічае абсталяванне, ручныя інструменты, зварачнае абсталяванне — гэта далёка не поўны пералік таго, што можна было ўбачыць на выставе. Убачыць і выбраць лепшае ад розных прадаўцоў. А на выставе прысутнічалі як навічкі на гэтым рынку, так і кампаніі з вялікім «паслужным спісам».

Напрыклад, бабруйская кампанія «ВіН», чый асноўны напрамак дзейнасці — аптова-рознічны гандаль электраінструментамі, пачала сваю дзейнасць у Беларусі толькі сёлета, хоць у Расіі продажы вядуцца ўжо з 2004 года. Цяперашняя выстава — толькі другая па ліку для «маладой» фірмы. Яна займаецца рэалізацыяй найперш бытавых інструментаў расійскага брэнда «Прараб», выраблена па замове ў Кітаі. У асартыментным пераліку ўвогуле — звыш тысячы найменняў інструментаў.

Бытавыя электраінструменты, як вядома, не разлічаны на працяглыя прафесійныя нагрузкі, яны не прызначаны для працы з раніцы да самага вечара. Спажыўцы такіх інструментаў — звычайныя людзі, якія ў вольную хвіліну хочуць і могуць нешта зрабіць сваімі рукамі ў кватэры, на дачы і загарадным участку. Не сакрэт, што прапаноў у гэтай нішы рынку дастаткова. Чым можна прывабіць патэнцыйнага пакупніка, асабліва калі кампанія фактычна толькі распачала сваю дзейнасць?

— Суадносінамі цана-якасць, — адказвае на пытанне яе дырэктар Яўген Паддубскі. — Дзякуючы гэтаму, як засведчыў вопыт, электраінструмент расійскага брэнда добра прадаецца ў Беларусі. Напрыклад, просты электрадрыль пакупнік можа купіць за 170-200 тысяч рублёў, перфаратар, які прадаецца ў кейсе, — ад 450 да 800 тысяч рублёў у залежнасці ад мадэлі і дадатковых насадак.

Каб прывабіць спажыўца, акрамя спалучэння цаны-якасці тавар павінен мець яшчэ нейкую «разынку», адрозненне ад аналагаў, праўда? Кампанія прапануе новую лінейку абагравальнікаў — масляных, галагенавых і іншых. Для масляных абагравальнікаў такім адрозненнем стаў больш шырокі профіль выробу, а таксама наяўнасць абароны ад падзення (у такім выпадку абагравальнік адключаецца)...

— Каб прывабіць нашых кліентаў — аптовыя арганізацыі — мы робім стаўку на суадносіны цана-якасць, — паўтарае маркетолог ужо мінскай кампаніі «Інструменткамплект» з 15-гадовым стажам працы на рынку інструментаў Дзмітрый Балабановіч. — Для гэтага аддаём інструменты на тэсціраванне.

Кампанія з'яўляецца эксклюзіўным пастаўшчыком у краіну інструментаў шэрагу гандлёвых марак. Усяго асартыментны пералік налічвае больш за 9 тысяч найменняў прадукцыі вытворчасці Тайваня.

— Аднак нельга не ўлічваць эканамічныя рэаліі, плацежаздольнасць кліентаў. Ці даступны зараз якасны інструмент большасці кліентаў? — пытаюся ў суразмоўцы.

— Думаю, не памылюся, калі скажу, што тыповае іх пажаданне — жаданне працаваць і зарабляць грошы, — сказаў Дзмітрый Балабановіч. Іншымі словамі, на любыя фінансавыя магчымасці.

...Напэўна, гэта самыя яскравыя ўражанні ад наведвання форуму. Што ж датычыцца яго «будаўнічай» часткі... Тэматыка выставы заяўленая дастаткова шырока. І не скажаш, што большасць напрамкаў не прадстаўлена ўвогуле, аднак прынамсі афармленне стэндаў, іх напоўненасць «жывым» асартыментам, на наш погляд, саступае, як ужо было заўважана, удзельнікам выставы «Увесь інструмент». Зрэшты, гэта калі гаварыць пра шэраговага наведніка, бо для саміх удзельнікаў-прафесіяналаў галоўная задача — знайсці новыя кантакты. Для абмену вопытам для іх запланавана некалькі дзелавых семінараў. І ўсё ж напрыканцы яшчэ адзін невялікі штрых. Ад форуму будаўнічага кірунку звычайна чакаеш пэўнай маштабнасці. На гэты раз удзельнікі абедзвюх выстаў занялі прыкладна дзве трэці першага паверха выставачнага комплексу. Гэта з улікам таго, што некаторыя месцы былі адведзеныя пад гандаль таварам, не звязаным з тэматыкай мерапрыемстваў: парасонамі, жаночымі ўпрыгажэннямі, адзеннем...

Сяргей РАСОЛЬКА.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Яўген Паддубскі гатовы прапанаваць бытавыя электраінструменты на любы густ і кішэню.

ХОЗЯЙСТВЕННЫЙ СУД ГОРОДА МИНСКА

ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО ООО «МИОН-ЭЛЕКТРО»

Лот № 1. Комплект оборудования КВКН-4 (КПО-Н4), предназначенный для кур-несушек, расположенный по адресу: Минский район, д. Околица, стоимостью 230 989 000 белорусских рублей.

Стоимость имущества указана с учетом НДС.

Минимальная величина первого шага составляет 5% от стоимости реализуемого с торгов имущества.

Подробная информация об имуществе размещена на сайте: http://minsk. court.by/, а также в помещении хозяйственного суда г. Минска: г. Минск, ул. Академическая, 15/1.

Торги состоятся 04.11.2011 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Академическая, 15/1, каб. 201.

За дополнительной информацией обращаться: судебный исполнитель Минец И.Н., тел.-факс: 294 93 66, ст. судебный исполнитель Вярьвильский Д.А., тел 294 93 67.

Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть перечислен на депозитный счет № 3642900000072 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, код 795, УНП 101541763 хозяйственного суда города Минска не позднее чем за 24 часа до начала проведения торгов.

В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 г. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

У ГЕРМАНІІ ВЫЙШЛІ БЕЛАРУСКІЯ ПАШТОЎКІ

У нямецкім горадзе Франкфурт-на-Одэры выйшла з друку серыя беларускіх краязнаўчых паштовак. Паштоўкі з'явіліся дзякуючы мясцоваму Інстытуту прыкладной гісторыі, рэспубліканскаму фонду імя Льва Сапегі і Таварыству беларускай мовы.

Паштоўкі падрыхтавалі беларускія краязнаўцы, якія жывуць у розных рэгіёнах нашай рэспублікі. На паштоўках адлюстраваны беларускія гістарычныя мясціны, людзі і прырода. Гэта Лунна — вёска наднёманскіх легендаў, Дзятлаўшчына на скрыжаванні часоў, Слонім, Паставы, Гродна, храмы беларускага Палесся, Верхнядзвіншчына. Таксама вельмі цікавыя падборкі паштовак «Шляхамі Яўхіма Карскага», «Шляхамі Элізы Ажэшкі» і іншыя. Прыгожыя выданні бясплатна распаўсюджваюцца сярод тых, хто цікавіцца гісторыяй нашай Бацькаўшчыны.

Сяргей ЧЫГРЫН.

Хто каго?

«У БЯДУ КАХАНЫ ЎЛЕЗ, Збыў за бесцань «Мерседэс»...

Жыве кулік (гэта я пра сябе. І пра вас?), дзе прывык, ды тое месца (каб не казаць — балота...) рознымі словамі хваліць. І мае ж, мае рацыю! Мае, мае за што! Вось разгарнула, напрыклад, любімую кніжку («Тлумачальны слоўнік беларускай мовы») на слове «даць», а пад ім больш за пяцьдзясят (і гэта не рэкорд!) залацінак-фразеалагізмаў. Гэта значыць, што нашы з вамі прадзеды чаго толькі не давалі (скажыце ўнукам, не будуць ведаць, як і ўзяць...)! Ну, узгадайце (і ацаніце): ***вестку, выхад, бой, галаву на адрэз, дзёру (драла, драпака, лататы), бярозавай кашы, дражда, жару, дуба, дулю, зевака, круга, лазы, маху, перцу, пытлю, рады, фору, часу, храпака, ходу, спуску, цягу, у косці, у лапу, па шыі (карку, загрыўку)... Само сабой — волю, само сабой — слова...***

То неяк (што было — было) рыхтавала яго да юбілею, прычым вельмі паважанага чалавека: разумніка ці, як піша той самы слоўнік, *з галавой*. А таму — ну проста грэх было не пажадаць: па-першае, каб ён нідзе не вешаў яе, не губляў (меў на плячах!)! Каб, па-другое, яна, тая светлая, ніколі не трашчала — ні ад жыццёвых праблем, ні пасля ўчарашняга. Каб ніколі і ніякі пустадомак (гэта па-трэцяе) не набіраўся нахабства дурыць яе беспатрэбнымі просьбамі ды загадамі альбо (гэта — па-чацвёртае) штосьці звальваць з нейчай хворай на яе, здаровую. Каб самога юбіляра ніколі не наведвала жаданне некаму намыліць яе (а тым больш адкруціць), біцца ёй, уласнай, у сцяну ці, бронь божа, складаць... І разам з тым, каб усё тая ж галава не страціла здольнасці злёгку кружыцца — ад удала зробленай працы, ад добрага віна, ад паху сена і жаночай блізкасці!

Гэта, дарэчы, тост. Аддаю, задарма (чаго не зробіш, каб у чарговы раз пахваліць чытачоў, якія, ну напэўна ж, не разгортваючы згаданай кніжкі на слове ***сесці***, што-колькевер там... прачыталі).

Зрэшты, па парадку, які, уважліва паглядзеўшы на здымак, зафіксаваў Міхаіл Паўлавіч Дубовік з вёскі Арэшкавічы Бярэзінскага раёна:

Ох, і здольныя жанчынкі

На прыкольныя ўчынкі!
Клешчука адна здзівіла,
Усіх на вершыкі натхніла!

Натхніла, ну напэўна ж, не ўсіх — проста шмат каго. Але, на жаль, не кожны з тых натхнёных свае думкі зрыфмаваў, паклаў у канверт ды адправіў у рэдакцыю. Нехта, магчыма, адлажыў на потым?

Для аматараў рабіць гэта вельмі карысным будзе досвед, якім дзеліцца з чытачамі дэбютант нашага конкурсу Алег Ігнатавіч Захарык з п. Цагельня Гомельскага раёна. Ён у першых жа радках свайго ліста шчыра прызнаецца:

Я, магчыма, прыпазніўся б
Напісаць пра дамачку,
Калі б здымак са «Звязды»
Не змясціў у рамачку...
А пра тое, ***што*** *ім,*
Думка мне прыбілася:
Ну, чаму ж не з дываном
Дамачка з'явілася?

Адказаў тут можа быць шмат: не патрэбны, не ў модзе, не да іх цяпер... Але ж не згадзіцца з Алегам Ігнатавічам нельга: калі б гэтая «дамачка» купіла менавіта дыван (не блытаць з канапай), калі б прынесла яго ў метро ды паслала... А потым прысела альбо і прылягла, «карціна» ў кадры была б яшчэ тая! Нехта з мужчын, прынамсі, мог бы далучыцца...

Мы нават ведаем, хто. «У 85 гадоў, — піша Мікалай Валянцінавіч Старых з Гомеля, — на аднаго мужчыну прыпадае 7 жанчын, але... позна! Гэта — анекдот. Хоць і не вельмі смешны, бо жанчына не павінна быць адзінокай! Гэта непарадак...»

Адкуль і радкі:

Адзінокая жанчына...
Прападае прыгажосць.
Дзе ж ты, дзе, яе мужчына?..
Гаспадар. Ці хоць бы госць?
Не чакаюць яе быццам?
Хоць метро кудысь вязе...
Эх, каб скінуць мне год трыццаць,
Дапамог бы ў бядзе!

У якой, Мікалай Валянцінавіч не канкрэтызуе: мо таму, што не першы год удзельнічае ў конкурсе на лепшы подпіс да здымка і дакладна ведае — гэта зробяць іншыя. Хто? Загінайце пальцы:

Нездарма жанчына крэсла
У метро з сабой прынесла —
За жыццё сваё нямала
У дарозе пастаяла, —

пішуць сужэнцы Астроўскія з Мінска.

Спадар Дубовік ведае, дарэчы, чаму:

«Дзверы адчыняюцца...»,
«Дзверы зачыняюцца...»,
Ды культура ў метро
Штосьці не мяняецца.

Гэта, вядома, крыўдна, непрыемна, але ж, як кажуць тутэйшыя, каб большай бяды ў жанчын не было! А быць яна можа. Вось уявіце (услед за Любоўю Міхайлаўнай Чыгрынавай з вёскі Забалацце Вілейскага раёна):

Зачынілі фірму
«Рогі і капыты» —
Размяло начальства
ўсе яе набыткі.
Што датычыць клеркаў —
Светак, Мань ды Зосяў,
То адной таксама
нешта дасталося.

Шкада, вядома ж, што толькі адной і толькі гэта (паглядзелі на здымак?). Але ж жанчына ўсё адно задаволена, бо рэч гэта патрэбная, нават неабходная — асабліва ў жніўні-верасні. Чаму? Адказ на гэта пытанне ў радках сужэнцаў Астроўскіх, якія пастаянна кантактуюць з выпускнікамі школ, са студэнтамі, а значыць, дакладна ведаюць:

Кожны жнівень у бацькоў
Аж трашчаць галовы —
У інтэрнатах месцы зноў
Толькі для паловы...
За вучобу заплаціць
Трэба да халеры
І ўсе ножанькі адбіць,
Каб знайсці кватэры.

І таму, шукаючы, ім хоць-нехаць прыйдзецца крэсла вазіць.

Праўда, гэта не без складанасцяў, пра якія піша спадар Гарачоў з вёскі Даўнары Іўеўскага раёна:

Адчуваю я нутром:
Гэтая кабета
Прашмыгнула ў метро
Міма турнікета...

Але ж пры гэтым, што важна, магла... зэканоміць, бо (як мяркуе нехта Л.М. з Маладзечна)

цэны ўверх паўзуць нярэдка...
І супынку ж ім няма!
...Хто ў транспарт з табурэткай, —
Той паедзе задарма!

Нешта, згадзіцеся, ёсць у гэтай прапанове? Як і ў радках Сцяпана Паўлавіча Нефідовіча з вёскі Любань Лунінецкага раёна: «Летась пры стварэнні аграгарадка паднавілі наш Дом культуры, а вось крэслаў не дакупілі. Таму, калі праводзіцца якое-небудзь важнае мерапрыемства альбо канцэрт, людзям даводзіцца стаяць».

Адкуль, відаць, і радкі:

У клуб ідзеш — бяры білет
і з сабою табурэт.
А як Станіславу,
то яшчэ і лаву.

Добра, што яны — табурэты ды лавы — ёсць, прычым ва ўсіх. А вось з пакупкай іншай мэблі апошнім часам праблемы. Мінчанка Ала Тарасік, прынамсі, не ўдакладняючы, пра сябе ці пра гэту жанчыну, з веданнем справы піша:

Былі часы (і наш — не горшы):
Гады са тры збірала грошы:
Канапу ў дом купіць хацела...
Ды на тым самым месцы села.

Гэта значыць, нічога не дамогшыся, змірылася з тым, што мела. І, магчыма, не вельмі і засмуцілася:

На канапу грошы несла,
А купіла — толькі крэсла.
Суцяшаць сябе рашыла,
Тым, што менш збірае пылу.

Наш чалавек, згадзіцеся — тутэйшы! Ён (паводле спадарыні Чыгрынавай) заўсёды знойдзе, чым сябе разважыць. Больш за тое, ён дакладна ведае, што

...жыццё наша — не булка:
Каму — мякка, каму — мулка...
Каб «вязло» й не дужа трэсла,
У сваё садзіся крэсла!

Напісаў гэтыя радкі спадар Дубовік, палічыў, відаць, што менавіта так гэтая жанчына і зрабіла...

Але ж нават у гэтым выпадку не факт, што ўратавалася, бо па нашым часе (як мяркуе спадар Гарачоў:

Часам з устаноў
Выганяюць з трэскам:
Без кранальных слоў,
Са... службовым крэслам.

(Чаго не зробіш, каб пазбавіцца...).

І, між іншым, не толькі з установ! *Па разводзе ў Аўдосі*
Толькі крэсла і засталося, —

піша пра маладзіцу са здымка спадарыня Гудачкова з Жыткавічаў.

А вось чаму так адбываецца, дакладна ведае спадар Гаўрыш з Чавусаў: «Многія пары, — піша ён, — жывуць цяпер без рэгістрацыі сваіх адносін у так званых «грамадзянскіх шлюбах», што зусім няправільна. Як тлумачаць законнікі, імі, грамадзянскімі, з'яўляюцца якраз тыя, што зарэгістраваны, бо ЗАГС і расшыфроўваецца як аддзел, дзе рэгіструюцца акты грамадзянскага становішча. Таму адсутнасць іх — гэта парушэнне закона. Прычым яшчэ і Божага: сёмая Запаведзь — не пралюбадзейнічай. А калі будзеш гэта рабіць, — то наракай тады сам на сябе, бо можаш памыліцца, апячыся і пры «разводзе» застацца ні з чым».

Што, на думку Валерыя Мікалаевіча, якраз і зрабіла вось гэтая маладзіца са здымка:

Аддала даніну модзе —
Пажыла з Пятром не ў шлюбе...
Толькі крэсла пры «разводзе»
Ён аддаў сваёй «галубе»,
А ў ЗАГС калі б схадзіла,
Усе пароўну падзяліла б!

Ёсць, ёсць рацыя ў гэтых радках! Адзінае — пра каго яны? Ці пра гэту жанчыну? Наўрад, бо яна ж (на здымак зірніце):

Месца — справа, месца злева —
Не глядзіць туды-сюды:
У сваім крэсле... Каралева!
І загадка — для «Звязды»!

Піша так спадарыня Гудачкова. А вось ***што*** магло загнаць гэтую каралеву ў метро і чаму са сваім, персанальным, крэслам, ведаюць іншыя чытачы:

У бяду каханы ўлез,
Збыў за бесцань «Мерседэс»...
Не прымае, бач, нутро
Ні аўтобус, ні метро, —

лічыць спадарыня Чыгрынава.

Шышкі ездзяць у аўто.
І не без рэзону,
Бо нямашака ў метро
Месцаў для персонаў, —

піша спадар Дубовік. Мяркуе, відаць, што вось гэтая, паставіўшы крэсла, тым самым адасобіласяся, стварыла месца... І тым самым «прадыктавала» спадару Гарачову наступныя радкі:

Карціна мне гэта
Знаёма да рэзі:
На нашу кабету
Дзе сядзеш, там злезеш!

Спадарыня Тарасік ведае, чаму:

Побач з людам можна сесці,
Але ж дзеўка — крэсла мае:
Хоць салому будзе есці
Ды фасону не губляе!

Пра яе ж, нашу ганарліўку, і радкі Інэсы Вікенцьеўны Кузьменкі з Мінска:

Жыццё, бывае, б'е балюча —
Па тварах... Мокраю анучай.
І дастаецца больш жанчыне
Ад «дабрадзея», ад мужчыны...
А хочацца, каб аж да скону
Яе цанілі, як Мадонну!

Вось на гэтай прыгожай ноце і можна было б завяршыць агляд, калі б у адрозненне ад іншых этапаў конкурсу, на гэты мы не ўсклалі сціплую надзею: навекі вечныя засцерагчы нашых чытачоў ад няправільнага ўжывання аднаго толькі слова. А менавіта: ***стул*** у рускай мове — гэта тое, на чым сядзяць, у беларускай жа яно мае толькі адно значэнне — прабачце — дзеянне кішэчніка.... Пра гэта мы папярэджвалі сваіх чытачоў. І, што прыемна, амаль усе яны прыслухаліся! За выключэннем аднаго — усміхніцеся! — настаўніка... беларускай мовы.

Але ж цяпер, будзем спадзявацца, і ён гэта слова запомніць — не будзе блытаць і памыляцца. А ў дапамогу тым, хто можа, радкі ад спадара Гаўрыша з Чавусаў, які, уважліва паглядзеўшы на здымак, выдаў (ад імя гераіні):

Усім хачу прызнацца я —
Даняла інфляцыя:
Так хацела гарнітур —
Дзень і ноч батрачыла...
Сапсаваўся тут жа стул,
Як цану ўбачыла.

Вось цяпер, будзем спадзявацца, усе засвоілі, у чым адрозненне, усе зразумелі, на што сядзеш, а на што не. А вось што пад пытаннем яшчэ, ведае мінчанін спадар Галынскі, і таму ўсіх мужчын, якія будуць сутыкацца з нашым фотакарэспандэнтам, шчыра заклікае:

Анатолю Клешчуку
Не шкадуйце чаркі,
Бо здымае ён дзяўчат
Не на нашых карках!

Хоць ім, асобным, магчыма, і хацелася б ускарабкацца туды, сесці — *на шыю, на галаву*...

А апроч таго, сесці, паводле слоўніка, можна *макам, на тым самым месцы, на пяты, на свайго канька, верхам,* крый Бог, *у лужыну, не ў свае сані, на мель,* (свят-свят-свят!) *на лаву падсудных*...

Што прыемна, асобныя з гэтых выразаў нашы чытачы, наўрад ці зазіраючы ў слоўнік, скарысталі ў падрыхтоўцы гэтага хатняга задання. І ёсць надзея, будуць скарыстоўваць у будучыні. Здымак новы, як заўжды, дадаецца.

Што датычыцца старога (на ім, нагадаем, быў можны дзядзька на кані і дробненькі араты з сошкай), то найлепшыя радкі пра іх, на думку чытачоў, склалі сужэнцы Астроўскія з Мінска, спадар Гаўрыш з Чавусаў, спадарыня Кусянкова з вёскі Лучын Рагачоўскага раёна, Гудачкова з Жыткавічаў і (з чым пагадзілася журы маленькае — рэдакцыйнае) **Фаіна Антонаўна ЦІМАХОВІЧ з мястэчка Івянец**. Таму прыз у выглядзе падпіскі на дарагую сэрцу газету на першы квартал 2012 года накіроўваецца на Валожыншчыну. Хочаце, каб да вас, — скарыстайце досвед спадара Захарыка: змясціце новы здымак у рамачку... Паразглядайце, падумайце, напішыце (па-беларуску!), што ўбачылі, перачытайце і толькі потым дашліце.

Дарэчы, тыя ж рамачкі са здымкамі і лепшымі (на ваш погляд) подпісамі здольны ўпрыгожыць не толькі жытло, працоўнае месца, але і... твары — такой патрэбнай цяпер усмешкай! А таму — поспехаў!

Валянціна ДОЎНАР.

Ад яе ж *шчырыя прабачэнні ўсім, чые подпісы не вытрымалі канкурэнцыі, не прайшлі строгі адбор — на гэты раз. Што, спадзяёмся, не падстава для таго, каб пакрыўдзіцца і адмовіцца ад удзелу — у звяздоўскім конкурсе на лепшы подпіс да здымка.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Факт

Астанкі побач са снарадамі

Астанкі чырвонаармейцаў знойдзены супрацоўнікамі УКДБ па Гомельскай вобласці.

Жыхар вёскі Холмечы Рагачоўскага раёна паведаміў пра міну-сюрпрыз ля аднаго з населеных пунктаў. Сапёры выявілі побач яшчэ больш дзясятка боепрыпасаў часоў Вялікай Айчыннай вайны. Нямецкія артылерыйскія снарады розных калібраў, рэактыўныя супрацьтанкавыя гранаты да гранатамёта «Панцэр-шрэк», а таксама гранаты, якія былі на ўзбраенні ў Чырвонай Арміі, сведчаць пра тое, што тут у розныя часы ішлі жорсткія баі. Усяго з зямлі вынята 13 боепрыпасаў нямецкага і савецкага ўзору. Знойдзены астанкі семярых чырвонаармейцаў. Іх распрабуюць ідэнтыфікаваць.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Прыватны склад зброі

У Крычаве затрыманы 53-гадовы мужчына пры спробе продажу знаёмаму гранаты Ф-1. У яго дома міліцыя знайшла цэлы склад боепрыпасаў: больш за сотню патронаў рознага калібру, 4 электрадэтанатары, часткі агнястрэльнай зброі часоў Другой сусветнай вайны. Адкуль у кватэры гараджаніна такі багаты арсенал, пакуль высвятляюць. Сам чалавек гаворыць, што проста назбіраў у навакольных лясах. У дачыненні да мужчыны распачата крымінальная справа.

Алена КАЗЛОВА.

На аб'ектах метро, якія будуюцца, усталююць відэаназіранне

У сталіцы ўзмоцнена ахова аб'ектаў метрапалітэна, якія будуюцца. Таксама прапрацоўваецца пытанне аб прымяненні тут сістэмы відэаназірання, паведаміў начальнік КУП «Дырэкцыя па будаўніцтве Мінскага метрапалітэна» Павел Царун.

Ён праінфармаваў, што ў верасні-кастрычніку былі правераны стан аховы аб'ектаў метрапалітэна, якія будуюцца, і дастатковасць захадаў, якія прымаюцца для забароны пранікнення на іх пабочных асоб. У выніку выяўлены шэраг хібаў у працы вартавой аховы, распрацаваны комплекс мерапрыемстваў па іх ліквідацыі. У прыватнасці, выключаны доступ пабочных да месцаў захоўвання маёмасці, прыцягнутыя да дысцыплінарнай адказнасці работнікі прадпрыемства, якія неналежным чынам выконваюць свае службовыя абавязкі. П. Царун таксама адзначыў, што работы па будаўніцтве новых участкаў сталічнай падземкі метро ідуць у адпаведнасці з графікам. Тры новыя станцыі Маскоўскай лініі мінскага метро: «Грушаўка», «Міхалова» і «Пятроўшчына» — адкрыюцца 1 верасня 2012 года. У канцы 2012 года павінна запрацаваць чацвёртая станцыя — «Малінаўка».

Святлана ФРАЛЯНКОВА,
«Мінск—Навіны».

САПРАЎДЫ, НЕ ВАЖНА, ЯКОГА КОЛЕРУ КОШКА

— Нам зараз самы час засяродзіцца на стварэнні нацыянальнага капіталу. Ён у нас пакуль складае 15-20% ад усёй эканомікі. Гэта вельмі мала для краіны з рынкавай эканомікай. А, у прынцыпе, трэба, каб у ёй 15-20% займаў дзяржаўны сектар, усё астатняе — прыватны, — гаворыць вядомы беларускі эканаміст Л. Ф. Заіка. З ім сустрэўся наш карэспандэнт. Тэма гутаркі — некаторыя асаблівасці развіцця капіталізму ў Беларусі.

— Як кажуць сацыёлагі, спачатку давайце вызначымся з тэрмінамі. Я маю на ўвазе ключавое слова нашай размовы — «капітал». Які толькі сёння не сустрэнеш у перыёдыцы і публічных выступленнях капітал — чалавечы, культурны, прыродны і нават духоўны! А які галоўны?

— Цяпер, у адрозненне ад Карла Маркса і яго сучаснікаў, эканамісты гавораць не проста пра капітал, а падзяляюць яго на некалькі відаў. Самыя асноўныя — фізічны капітал (заводы, машыны, абсталяванне) і фінансавы капітал (грошы, золатавалютныя рэзервы, акцыі, іншыя каштоўныя паперы). Адносна нядаўна ўзнік тэрмін «чалавечы капітал» (інтэлект). Яшчэ можна пачуць пра прыродны капітал. Я не згодны з гэтым тэрмінам. Так, ёсць прыродныя багацці: карысныя выкапні, лес і г.д. Але ўсё гэта не капітал, а рэсурсы для прамысловасці. Ёсць аматары называць па аналогіі розныя з'явы капіталам. Скажам, інвестыцыі звонку ў іх не інакш як замежны капітал, слой адукаваных і дасведчаных людзей — інтэлектуальны капітал. Але не будзем забываць і перайначваць Маркса — капітал быў і застаецца ў першую чаргу крыніцай стварэння новага кошту і атрымання прыбытку.

А вось зусім новы від капіталу, які сёння ўважліва вывучаецца, аналізуецца, — гэта сацыяльны капітал. Якраз тое, што атрымлівае грамадства ў выніку ўзаемадзеяння людзей, розных інстытутаў, сістэм кіравання, — пераход на якасна новую ступень развіцця. Але гэта можа стаць тэмай асобнай размовы. Прасцей кажучы, сацыяльны капітал — гэта тое, што аб'ядноўвае і спалучае людзей і, у рэшце рэшт, робіць нацыю больш паспяховай.

— З пункту гледжання паспяховасці нацыі які капітал можа адыграць для нас асабліва станоўчую ролю?

— Нацыянальны капітал. У нас пакуль найбольш маштабна прадстаўлены дзяржаўны капітал. Так атрымалася гістарычна. Але яго панавання ўжо недастаткова для паспяховага развіцця эканомікі. У Беларусі, на мой погляд, існуе два шляхі стварэння нацыянальнага капіталу. Першы, даць яму магчымасць сфарміравацца і разгарнуцца на ўласнай аснове дзякуючы грошам, знойдзеным унутры краіны, зароблены падчас станаўлення малога бізнэсу. Менавіта таго дробнага прадпрымальніцтва, якое самастойна і паступова ператвараецца з малога ў сярэдні бізнэс, набывае досвед, пашырае кола партнёраў дома і за мяжой. А потым з сярэдняга пераходзіць на новы ўзровень. Гэты шлях эвалюцыі дзелавой ініцыятывы самы прымальны.

Другі шлях — прыватызацыя. Але яна на постсавецкай прасторы паўсюдна насіла крымінальны, а часам бандыцкі характар. І ў Расіі, і ва Украіне хутка правялі «прыхватызацыю». Я не ўпэўнены, што і ў нас будзе выключна справядлівы падзел грамадскай уласнасці.

— А ці не супярэчыце вы самі сабе? Значна, у разы, хутка павялічыць долю нацыянальнага капіталу немагчыма без масавай прыватызацыі. І сёння час, здаецца, зручны для гэтага.

— Час вельмі неспрыяльны. Я рашуча не згодны з тымі, хто выступае за неадкладную прыватызацыю. Улічваючы вялікі ўзровень інфляцыі, нестабільную сітуацыю на валютным рынку нашай краіны, крызісныя з'явы ў эканоміцы аб'яднанай Еўропы, няпэўныя перспектывы еўразоны, я ўвогуле б у бліжэйшыя 4-5 гадоў не праводзіў маштабнай прыватызацыі. Спачатку трэба нармалізаваць сітуацыю, затым дзяліць ці прадаваць агульнанародную ўласнасць. Паўтаруся, лепш садзейнічаць стварэнню нацыянальнага капіталу на ўласнай аснове, за кошт менавіта беларускіх грошай, шляхам развіцця малога і сярэдняга бізнэсу, адкрыцця новых беларускіх прадпрыемстваў.

— Ведаеце, вельмі спрэчная выснова. Дзе яны, бізнэсмены-пачаткоўцы, назбіраюць столькі грошай? А як наконт прыцягнення і замежнага капіталу для ўмацавання пазіцый нацыянальнага капіталу?

— Няма сэнсу моцна разлічваць на падтрымку замежнага капіталу. Ён можа прыйсці да нас, хутчэй за ўсё, з Люксембурга, Ліхтэнштэйна, Манака, Швейцарыі, Кіпра, Саламонавых астравоў. Гэты міжнародны капітал не зусім чыстага паходжання, але і не стапрацэнтны крымінал. У яго велізарныя фінансавыя магчымасці. У банках некаторых краін ляжаць мільярды долараў, па якія ніхто не прыходзіць. Іх гаспадары сябе ніяк не «засвечваюць».

— Тады скажыце, хто з краін сацлагеру без прыватызацыі дасягнуў вялікіх поспехаў?

— Калі ласка. Кітай абышоўся без прыватызацыі. Яе там не было ў нашым уяўленні: узялі і падзялілі — каму большы, а каму меншы кавалак, а каму ўвогуле нічога не дасталася ад велізарнага «пірага» дзяржаўнай уласнасці. Кітайскія кіраўнікі-камуністы мудра вырашылі не спяшацца з прыватызацыяй, а праводзіць яе доўга і марудна. Але галоўнае — абачліва. Яны не тое што былі прынцыпова супраць узнікнення класа багацеяў — нехай будуць, але, як гаворыцца, са свайго мазаля. Таму ў Кітаі адразу паставілі надзейны бар'ер перад тымі, хто разявіў рот на вялікія заводы і фабрыкі. Чыноўнікі гэтыя прадпрыемствы не дзялілі паміж сабой, штучна не банкруцілі, крыміналь не рабіў іх рэйдарскія захопы. Дзяржаўная прамысловасць жыла сваім эканамічным жыццём і, што вельмі паказальна, наладжвала ўзаемавыгадныя стасункі з малым бізнэсам. Гэта паступова вылілася ў прыватна-дзяржаўнае партнёрства. У нас, дарэчы, такое супрацоўніцтва дзяржпрадпрыемстваў з малым бізнэсам, па вялікім рахунку, толькі пачынаецца.

— Значыць, для вас стварэнне нацыянальнага капіталу — гэта ў значнай ступені выкарыстанне кітайскага досведу?

— Так. Кітай пачаў развіваць свой нацыянальны капітал амаль што па Марксу і не памыліўся. Свой шлях у сусветныя эканамічныя лідары Кітай пачаў з заахвочвання індывідуальнага прадпрымальніцтва. Кітайцы свой нацыянальны капітал зараблялі самастойна. Прычым ім крэдытаў банкі не давалі. Грошы пазычаліся ў сваякоў, родных, сяброў. На сабраныя сродкі адкрывалася дробная крама, рамонтная майстэрня і г.д. Цікава прасачыць за эвалюцыяй кітайскага малога бізнэсу. Большасць прадпрымальнікаў пачынала з гандлю агароднінай і садавіной. Потым прадуктамі харчавання. Затым перакінуліся на выраб і гандаль адзеннем і абуткам. Далей кітайцы перайшлі на бытавую тэхніку і электроніку, паступова заняліся заснаваннем буйных гандлёвых экспартна арыентаваных кампаній. Што было далей, самі ведаеце: кітайскія тавары не першы год пануюць у свеце.

— І як гэта ў іх атрымалася?

— У першую чаргу таму, што кітайцы зрабілі свой нацыянальны капітал эфектыўным. У гэтым вялікая заслуга вышэйшага кіраўніцтва краіны, якое не толькі не перашкаджала прыватнікам, а наадварот, усяляк садзейнічала бурнаму развіццю малога бізнэсу. Больш за тое, адказным работнікам камітэтаў партыі даручалася курыраваць станаўленне і развіццё прыватнага сектара.

— Відаць, недарэмна архітэктар кітайскіх рэформаў Дэн Сяопін некалі сказаў: «Не важна якога колеру кошка, галоўнае — каб яна лавіла мышэй».

— Сапраўды, не важна, якога колеру кошка. Пад кошкай Дэн Сяопін меў на ўвазе лад жыцця: не важна сацыялізм ці капіталізм. Галоўнае — каб людзі ў краіне жылі заможна, не пакутавалі ад галечы, нястачы, беднасці.

— Вернемся да нашых «кошак» — айчынных капіталістаў. Нешта яны, як здаецца, не вельмі ловяць мышэй. Што ім перашкаджае?

— А нашых «кошак» да нядаўняга часу і не вельмі заахвочвалі да занятку бізнэсам. У яго пайшлі пераважна людзі рызыкоўныя, у асноўным тыя, каму плацілі вельмі мала, каго скарацілі на рабоце і каму ўжо не было што страчваць і за што чапляцца ў сваёй спецыяльнасці. За дробныя аклады? Многія першыя прадпрымальнікі разарыліся, зайшлі ў тупік, а нехта істотна ўзняўся. Але як бы там ні было, у нас ужо ёсць 250-300 тысяч айчынных бізнэсменаў. Аднак што ім уласціва: наш бізнэс не спяшаецца пераходзіць у разрад цяжкавагавікоў. Нашы прадпрымальнікі аддаюць перавагу стварэнню некалькіх невялікіх фірмаў і фірмачак па розных накірунках, чым выходзіць на заснаванне вялікай кампаніі. Такія ёсць, але іх мала. Напрыклад, даволі эфектыўнае прадпрыемства па выпуску калготак «Контэ». У нас вялікія фірмы — гэта ў асноўным фірмы са змешаным беларуска-замежным капіталам. Таму сёння варта садзейнічаць перарастанню дробных фірмаў у вялікія з іх наступным выхадам на замежныя рынкі. Кажучы навуковай мовай, наспела неабходнасць стымуляваць цэнтралізацыю капіталу.

— Не ведаю, як кітайскія камуністы ацанілі б ваш лозунг, а вось беларускія, якія па-ранейшаму трывала стаяць на ленінскіх пазіцыях, скажуць, што вы заклікаеце гадаваць алігархаў, «акул» капіталізму. І гэта ў нечым справядліва.

— Я заклікаю да росту колькасці канкурэнтаздольных прыватных прадпрыемстваў са сваімі маркетынгавымі службамі, даследчымі цэнтрамі, замежнымі прадстаўніцтвамі. Каб у нас з'явіліся свае Форды, Бошы і г.д. А якая можа быць эфектыўная служба маркетынгу ў фірме з персаналам пяць чалавек? Акрамя гэтага, працэс канцэнтрацыі капіталу — гэта аб'ектыўны працэс. Так, я не супраць павелічэння багатых людзей, якія сумленна зарабілі свае грошы.

А калі мы не створым свой эфектыўны капітал, то да нас прыйдзе замежны, у першую чаргу капітал нашых партнёраў па Мытным саюзе — расійскі і казахстанскі. І мы будзем вымушаны яго абслугоўваць. Я, між іншым, нядаўна давядзецца ў размове з рыэлтарамі, што 40 працэнтаў новага жылля ў Беларусі набываюць расіяне. Яно і зразумела: у Маскве квадратны метр каштуе ў межах 5000 амерыканскіх долараў, а ў Мінску 1000-1200 долараў. Расійскія бізнэсмены сярэдняй рукі набываюць у нас элітныя кватэры, катэджы і нават перавозяць сюды свае сем'і, наймаюць нянек і гувернантак, садоўнікаў, вартаўнікоў: у нас танная працоўная сіла. За 500-600 долараў у месяц можна на гэтыя «пасады» падабраць кваліфікаваных настаўнікаў, спецыялістаў. А колькі нашых маладых жанчын працуе сядзелкамі ў Італіі, хатнімі работніцамі ў Польшчы, малодшым медперсаналам у Германіі, прыбіральшчыцамі ў матэлях і прыбіральнях Амерыкі? Калі да нас пачнуць актыўна перасяляцца заможныя расіяне, то ўзнікне пагроза ператварэння беларусаў у нацыю слуг, краіну, якая пастаўляе для іншаземцаў гувернантак, прыбіральшчыц, нянек, сядзелак. Вас радуе такая перспектыва? Я, напрыклад, катэгарычна супраць. І ёсць падставы для трывогі. Пад Мінскам ужо дастаткова пустых катэджаў, каля якіх бадзяюцца толькі ландшафтныя дызайнеры, вартаўнікі ды прыбіральшчыцы наведваюцца. Гэтыя дамы на ўсялякі выпадак набылі расіяне.

— І што вы прапаноўваеце?

— Стварыць прывабныя ўмовы для вяртання дадому моладзі, людзей сярэдняга ўзросту, каб яны ўбачылі перспектывы для заняцця бізнэсам, стварэння новых прадуктаў. Скажам, вызваліць іх новыя фірмы на першыя 3-4 гады ад аплаты падаткаў на прыбытак. Наш чалавечы капітал — наша галоўнае багацце — не выкарыстоўваецца ў поўнай меры. І часта людзі з вышэйшай адукацыяй вымушаны ехаць на заробкі за мяжу і працаваць на непрэстыжных пасадах, куды не хочуць ісці мясцовыя жыхары. Скажам, выпускнікі нашых універсітэтаў працуюць у Расіі будаўнікамі, у аўтасэрвісе.

Каб вярнуць дадому як мага больш маладых людзей, варта яшчэ больш спрасціць магчымасць заняцца сваёй справай, зарабіць самім дастойныя грошы. Па маіх назіраннях, выязджаюць у іншыя краіны не самыя слабыя, дурныя ці абібокі. На жаль, едуць туды актыўныя, прадпрымальныя, адукаваныя, тыя, хто бачыць, што дзякуючы сваім здольнасцям і энергіі яны заробяць больш за мяжой. І ў многіх гэта атрымоўваецца. А энергічныя людзі з замежным досведам вядзення справы вельмі былі б дарэчы дома.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

ВАДКАСЦЬ ПА-ЗА ЗАКОНАМ

Упраўленне Дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК Магілёўскай вобласці спыніла спробу незаконнага ўвозу і рэалізацыі ў рэгіёне нехарчовай спіртавой вадкасці на суму ў 40 мільёнаў рублёў.

14 кастрычніка ў Магілёве затрымалі грузавы аўтамабіль «МАН» аднаго з прыватных прадпрыемстваў. Ён перавозіў амаль 4 тысячы літраў вадкасці для ачышчэння шкла ў аўтамабілях пры нізкіх тэмпературах. Гэты тавар расійскай вытворчасці не меў суправаджальных дакументаў, якія пацвердзілі б легальнасць увозу, а таксама не быў маркіраваны кантрольнымі знакамі Беларусі. Партыя нелегальнай спіртавой вадкасці арыштаваная, а парушальніку пагражае адміністрацыйная адказнасць — штраф у 50 мінімалак і канфіскацыя тавару. Дэпартамент фінансавых расследаванняў звяртае ўвагу, што грамадзяне, якія займаюцца нелегальным абарачэннем спіртавых вадкасцяў, могуць быць прыцягнуты і да крымінальнай адказнасці за незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць.

Ілона ІВАНОВА.

ОАО «БПС-Банк» информирует, что с 20 октября 2011 г. устанавливаются следующие процентные ставки по срочным банковским депозитам физических лиц в иностранной валюте:

Наименование депозита	Срок привлечения	Размер процентов (годовых)	
		доллары США, евро	российские рубли
Праздничный	65 дней	8	8
Баланс интересов	1 год	за 1-й мес. – 8 за 2-10 мес. – 8,75 за 11-12 мес. – 9	-
Карт-счет Универсальный	1 год	8,5	-
Настоящий выбор	370 дней	до 5 тыс. – 8,5 от 5-10 тыс. – 8,7 от 10 тыс. – 8,9	до 150 тыс. – 8,5 от 150-300 тыс. – 8,7 от 300 тыс. – 8,9
Динамичный	3 года	9	9

По срочным банковским депозитам в иностранной валюте «Баланс интересов», «Настоящий выбор», «Динамичный», карт-счету «Универсальный» (с неснижаемым остатком 1000 долларов США, евро), привлеченным (переоформленным на следующий срок) до 20.10.2011, установленные процентные ставки применяются с 21.11.2011.

Дополнительную информацию можно получить в любом подразделении ОАО «БПС-Банк», на сайте банка www.bpsb.by или по телефонам:

- **148** (в стационарной сети);
- МТС **(029) 5-148-148, 2-148-148;**
- Velcom **(044) 77-00-148, 77-55-148.**

Проценты, выплаченные по депозитам в иностранной валюте в течение 2010 г. (млрд. руб.): январь – 6,3; февраль – 6,4; март – 8,2; апрель – 7,4; май – 7,7; июнь – 7,7; июль – 8,1; август – 8,8; сентябрь – 8,7; октябрь – 8,6; ноябрь – 9,9; декабрь – 10,3.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 10.10.2011 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673.

Суб'ектыўнае меркаванне з нагоды

ТЫСЯЧУ ЗА АДНАГО

Павучальная гісторыя аднаго абмену

Ізраіль за свайго сяржанта, які знаходзіўся ў руках баевікоў «Хамаса», выпусціў з турмаў тысячу зняволеных палесцінцаў. Вось такі адбыўся абмен.

Палесцінская аўтаномія святкуе перамогу. А інакш як можна ўспрымаць такі абмен? Не за генерала, не важную персону, а за звычайнага салдата Ізраіль выпусціў на волю 1000 злачынцаў. Праўда, для Палесціны яны з'яўляюцца патрыётамі, змагарамі за незалежнасць, і таму выйшлі радасныя палесцінцы на вуліцы сваіх гарадоў.

Насельніцтва Ізраіля ў большасці (паводле некаторых звестак, 80%) падтрымала абмен, але многія ўсё ж трывожацца і задаюць пытанне: «А ці не ўльюцца выпушчаныя ў рады радыкальнай палесцінскай арганізацыі «Хамас» і не пойдуць шляхам, які прывёў іх у турму?». Акрамя гэтага, у турмах Ізраіля знаходзяцца яшчэ 6 тысяч палесцінцаў, то ці не настроіць гэты факт хамасаўцаў да захопу ізраільцян, каб затым іх абмяняць?

З боку Ізраіля абмен не з'яўляўся прапагандай ці палітычнай акцыяй, бо аналагічныя абмены, хоць і не ў такім маштабе, Ізраіль праводзіў і раней.

Факт абмену сведчыць пра цану чалавечага жыцця, пра тое, што дзяржава не пакідае свайго грамадзяніна ў бядзе, што гатова прыйсці яму на дапамогу, і размова пра цану не ідзе.

І тут успамінаюцца словы савецкай песні «У нас адна на всех Победа — мы за ценой не постоим». А гэта значыла, што для Перамогі не шкада было тысяч і мільёнаў жыццяў. Асабліва гэтая ўстаноўка праявіла сябе ў часы вайны. Калі генералісімус загадаў да гадавіны рэвалюцыі вызваліць нейкі горад, то яго вызвалялі, нягледзячы ні на якія чалавечыя страты: важна была перамога, а жыццё салдата да ўвагі не бралася.

У Савецкім Саюзе ўсё было падпарадкавана ўхваленню дзяржавы, яе велічы, і асобны чалавек разглядаўся як часцінка калектыву: індывідуалізм успрымаўся, у лепшым выпадку, як непажаданая з'ява. Не толькі ў былым Саюзе, але і пры любым таталітарным рэжыме жыццё чалавека не мела асаблівай каштоўнасці.

І не дзіўна, што мы з нейкім недаверам успрымаем абмен, зроблены ў Ізраілі. Як гэта — за аднаго салдата выпусціць тысячу? На чыйсьці погляд, даволі абсурдны абмен, але ў яўрэяў іншая псіхалогія. Яна фарміравалася на працягу тысячагоддзяў. У яўрэяў даўно ўжо быў закон Майсея. І гэты факт для народа Ізраілева быў лёсавызначальным. Іудаізм — гэта фундаментальная рэлігія, якая стала для яўрэяў непрыступнай крэпасцю. Толькі дзякуючы ёй гэты народ здолеў выжыць: субота выратавала яўрэяў.

І ўзаемавыручка, якая ў яўрэяў вельмі моцная, ідзе ад Закона Майсеева. Свайго супляменніка, які трапіў у бяду, неабходна выручаць. З рабства яўрэяў выкуплялі, з палону вызвалялі ці, як у апошнім выпадку, — абменьвалі.

На працягу тысячагоддзяў яўрэяў праследавалі. Каб выжыць, яўрэям пастаянна даводзілася прыстасоўвацца. Падобна ртуці яны разбягаліся, прасочваліся, аб'ядноўваліся, але ртуць — гэта метал.

З'яўленне на палітычнай карце свету Ізраіля павінна быць павучальным для краін, якія ўзніклі на постсавецкай прасторы. Калі ў народа ёсць свая дзяржава, то ён знаходзіцца пад яе абаронай.

Мы не павінны забываць і ўрокі сваёй гісторыі. Вось ужо дваццаць год, як Беларусь з'яўляецца суверэннай дзяржавай, а мы не можам усё яшчэ «пераварыць» гэты факт.

З часоў Вітаўта Вялікага мінула шмат стагоддзяў. Ліцвіны страцілі Вялікае Княства, калі другія народы фарміраваліся ў нацыі, і гэты прабел наклаў свой адбітак на свядомасць народа.

У нас не было закона Майсеева, які аб'яднаў бы беларусаў. Рэлігія ж, наадварот, пачалі дзяліць народ.

Хто мог абараніць народ, якім пагарджалі, у Рэчы Паспалітай ці Расійскай Імперыі? І ў Савецкім Саюзе стваралі камунізм, які аказаўся міфам. У савецкай імперыі лёс асобнага народа, а тым больш чалавека, нікога не турбаваў. У тагачаснай дзяржавы былі грандыёзныя планы: акрамя будаўніцтва камунізму, гэта яшчэ завяванне космасу, вайна ў Афганістане...

Невялікі Ізраіль можа абараніць непрыкметнага чалавека — свайго грамадзяніна і даць урок іншым краінам. Толькі ў сваім доме, сваёй сям'і, сваёй краіне чалавек можа знайсці апору. Куды б лёс чалавека не закінуў, ён павінен ведаць, што ў яго ёсць Радзіма.

Яўрэі «параскіданы» па ўсім свеце, але ў іх існуе сувязь з Ізраілем, магчыма, толькі духоўная ці ўвогуле неўсвядомленая, патаемная, закладзеная з біблейскіх часоў.

Беларусы атрымалі суверэнітэт, нібы «манну нябесную», таму, можа, і ўспрынялі яго спакойна. Але суверэнітэт — гэта не пустое слова.

Як толькі Ізраіль аформіўся як дзяржава, у краіне адрадзіўся іўрыт, які быў мёртвай мовай. А можна было ў якасці дзяржаўнай мовы пакінуць ідыш, якую ведалі многія яўрэі, ці рускую, якая для 25% насельніцтва Ізраіля не была чужой. Зроблена было гэта для таго, каб вярнуцца да сваіх культурных і гістарычных каранёў, каб аб'яднаць грамадства. Не сакрэт, што якраз мова з'яўляецца магутнейшым у гэтым плане фактарам.

А што мы? Без напоўненага сэнсам суверэнітэту, без мовы і гісторыі па інтэграцыйнай прасторы мы будзем хадзіць, як па мінным полі? Небяспечна!

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Печать ЧТУП «АльянсАЗАвто» считать недействительной
в связи с ее утерей.
УНП 191396442

2 мільёны навагодніх падарункаў ад кандытараў

па цане ад 20 тысяч да 80-100 тысяч рублёў. Навагоднія баулы збіраюцца ўручную, дзеля чаго на прадпрыемствах фарміруюцца спецыяльныя брыгады з вопытных майстроў. На традыцыі многія навагодніх падарункі будуць аформленыя з выкарыстаннем сімволікі наступнага года. Першыя партыі навагодніх баулаў паступяць у продаж у канцы месяца.

Якім будзе расклад руху цягнікоў у лістападзе?

Па інфармацыі Мінскага аддзялення, на ўчастках Мінск — Асіповічы, Мінск — Маладзечна, Мінск — Баранавічы, Мінск — Орша рух прыгарадных цягнікоў вызначаецца: 4 лістапада — як па пятніцах, 5 і 6 лістапада — як па суботах, 7 лістапада — па раскладу нядзелі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЗАГІНУЛА ПАД КОЛАМІ ТРАМВАЯ

У цэнтр аператыўнага ўпраўлення пры Мінскім гарадскім упраўленні МНС паведамілі, што па вуліцы Бабруйскай жанчыну зацяснула пад коламі трамвая маршруту №1. Цела пацярпелай пры дапамозе гідраўлічнага інструмента работнікі МНС дасталі з пад першай колавай пары.

АДРАЗУ ДВА ПАЖАРЫ З ГІБЕЛЛЮ

адбыліся за адны суткі ў Слуцкім раёне. Напачатку бяда здарылася ў вёсцы Бялевічы. Каля 12 гадзін зяць зазірнуў да цешчы і ўбачыў цела жанчыны на ложку без прыкмет жыцця. У двухпакаёвай кватэры было нязначнае задымленне. Як мяркуецца, прычынай пажару стала захоўванне гаручых рэчаў у непасрэднай блізкасці да адкрытай духавой шафы печы. Астатнія кватэры ў доме не пацярпелі.

У вёску Ячава выратавальнікі прыбылі па выкліку ў 22.44, і на той момант драўляны жылы дом гарэў ужо адкрытым полымем, дах абрынуўся. Работнікі МНС знайшлі труп гаспадара-пенсіянера. Мяркуецца, што ён загінуў з-за неасцярожнасці пры курэнні.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Дополнительная информация к извещению о проведении аукционных торгов, опубликованному в газете «Звязда» от 30 сентября 2011 года

Лот	Наименование техники	Местонахождение объекта	Год выпуска	Пробег в км/ наработка в м/ч, (износ в %)	Начальная цена продажи (руб.)	Сумма задатка (руб.)
Лот № 167 изложить в следующей редакции:						
1	**2**	**3**	**4**	**5**	**6**	**7**
167	Труба алюминиевая из комплекта ПМТА-150, партия — 50 шт.	п/о Линово р-н Оранчицы, в/ч 67675	1979	-	55 000 000	5 500 000
167a	Труба алюминиевая из комплекта ПМТА-150, партия — 50 шт.	п/о Линово р-н Оранчицы, в/ч 67675	1979	-	55 000 000	5 500 000
167в	Труба алюминиевая из комплекта ПМТА-150, партия — 50 шт.	п/о Линово р-н Оранчицы, в/ч 67675	1979	-	55 000 000	5 500 000
167c	Труба алюминиевая из комплекта ПМТА-150, партия — 50 шт.	п/о Линово р-н Оранчицы, в/ч 67675	1979	-	55 000 000	5 500 000
167d	Труба алюминиевая из комплекта ПМТА-150, партия — 62 шт.	п/о Линово р-н Оранчицы, в/ч 67675	1979	-	68 200 000	6 820 000

Условия проведения аукциона изложены в газете «Звязда» № 187 от 30 сентября 2011 года. УНП 101099370

Извещение о повторном проведении аукциона по продаже в частную собственность земельного участка для строительства и обслуживания жилого дома

Организатор аукциона	**Лот № 1** — Козловщинский сельский исполнительный комитет, 211835, Витебская область, Поставский район, д. Козловщина, ул. Советская, д. 8, тел. 8 (02155) 57 7 18. **Лот № 2** — Волковский сельский исполнительный комитет, 211853, Витебская область, Поставский район, д. Волки, ул. Центральная, д. 2а, тел. 8 (02155) 55 9 87
Дата, время, место проведения аукциона	28 октября 2011 года в 10.00 в здании райисполкома (г. Поставы, пл. Ленина, 25, 3-й этаж, каб. 58)
Адрес, площадь, кадастровый номер земельного участка, начальная цена	**№ лота** / **Адрес участка** / **Площадь, га** / **Кадастровый номер** / **Начальная цена, рублей** 1 / д. Ласица, ул. Каштановая, д. 25 / 0,2500 / 224082006601000021 / 10 000 000 2 / д. Коловцы, ул. Озёрная, д. 4 / 0,2500 / 224080809101000005 / 10 000 000
Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельных участков для проведения аукциона	внесение победителем аукциона в местный бюджет платы за право частной собственности на земельный участок в размере, заявленном на торгах; возмещение соответствующему исполкому расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельных участков, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельных участков; государственная регистрация права на земельный участок в двухмесячный срок со дня принятия решения исполкома о предоставлении земельного участка; получение победителем аукциона в установленном порядке технической документации разрешения на строительство жилого дома; занятие (освоение) земельного участка не позднее одного года после получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации
Порядок осмотра на местности земельных участков, которые предполагается передать в частную собственность по результатам аукциона	в рабочие дни с 8.00 до 17.00 по мере обращений лиц, заинтересованных в участии в аукционе. Обращаться в землеустроительную службу Поставского райисполкома: г. Поставы, пл. Ленина, 25 (здание райисполкома), 1 этаж, каб. 11
Перечень документов, которые необходимо представить участникам аукциона до его начала	заявление на участие в аукционе (бланк можно получить и заполнить непосредственно в землеустроительной службе); квитанция об уплате задатка; ксерокопия стр. 25, 31, 32, 33 общегражданского паспорта без нотариального засвидетельствования
Место, дата и время начала и окончания приёма заявлений и прилагаемых к ним документов	г. Поставы, пл. Ленина, 25 (здание райисполкома), 1 этаж, каб. 11 в рабочие дни с 8.00 до 17.00, по субботам с 8.00 до 14.00 с 20 октября по 27 октября 2011 года включительно
Сумма подлежащих возмещению организатору аукциона расходов на его проведение (уплачивается победителем по соответствующему лоту помимо суммы, заявленной на торгах)	Лот № 1 — 1 805 393 руб. Лот № 2 — 1 774 219 руб.
Размер задатка, срок и порядок его внесения	10% от начальной цены соответствующего участка до подачи заявлений на счёт соответствующего исполкома. Реквизиты платежа указаны в бланке заявлений на участие в аукционе
Адрес и номер контактного телефона	г. Поставы, пл. Ленина, 25 (здание райисполкома), 1 этаж, каб. 11 в рабочее время с 8.00 до 17.00, тел. 8 (02155) 4 11 32

г. Клецк **24 ноября 2011 года**

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ И ПРОДАЖИ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

№ лота	Месторасположение земельного участка, адрес, кадастровый номер участка, арендодатель	Вид аукциона	Характеристика инженерных коммуникаций	Площадь земельного участка, га	Срок аренды, лет	Назначение участка	Условия продажи	Начальная цена предмета аукциона (руб.)	Сумма задатка (руб.)	Расходы по формированию и регистрации земельного участка и проведению аукциона (руб.)
1.	г. Клецк, ул.17 Сентября Кадастровый номер 622550100002003065 Арендодатель – Клецкий райисполком	На право заключения договора аренды	Водопровод, электроснабжение; канализация, центральное теплоснабжение имеет ограничение в использовании в связи с нахождением в охранной зоне сетей и сооружений теплоснабжения	0,2235	40	Для строительства административно-торгового центра	- заключение победителем аукциона с Клецким райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении земельного участка государственной регистрации прав на земельный участок; - получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ, разработки технической документации и разрешения на строительство в срок, не превышающий 2 года; - возмещение потерь сельхозпроизводства в сумме 6600000 руб.; - занятие земельного участка не позднее 6 мес. после получения свидетельства о гос. регистрации; - осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией	35537925	3553800	3032560
2.	г. Клецк, ул. Гагарина, 17 Кадастровый номер 622550100002003064 Арендодатель – Клецкий райисполком	Продажа в частную сбственность	Водопровод, электроснабжение; газоснабжение, ограничений в использовании не имеет	0,1446		Для сторительства и обслуживания жилого дома	- осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении земельного участка государственной регистрации прав на земельный участок; - получение победителем аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство; - занятие земельного участка не позднее 1 года после получения свидетельства о гос. регистрации	23246691	2324700	1858404

1. Аукцион состоится **24 ноября 2011 г.** в 11 часов в здании Клецкого райисполкома по адресу: г. Клецк, пл. Маяковского, 10.

2. Для участия в аукционе приглашаются индивидуальные предприниматели, юридические лица, граждане Республики Беларусь. Аукцион проводится при наличии двух или более участников.

Участнику необходимо подать заявление в Клецкий райисполком.

Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают: заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также представляются: юридическими лицами (резиденты РБ) – доверенность, выданная представителю юридического лица, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копия свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица; индивидуальными предпринимателями – копия свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования; представителями индивидуальных предпринимателей – нотариально удостоверенная доверенность; юридическими лицами (нерезиденты РБ) – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; представитель иностранного юридического лица дополнительно представляет легализованную в установленном порядке доверенность; граждане РБ представляют копию документа, содержащего их идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования. При подаче документов на участие в аукционе уполномоченные лица представляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

3. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00 по адресу: г. Клецк, пл. Маяковского, 10, кабинет 204; последний день приема документов **23 ноября 2011 г. до 11.00.** Заключительная регистрация участников **24 ноября 2011 г. с 10.00 до 10.45.** К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

4. Сумма задатка перечисляется на расчетный счет 3642207430706 в ЦБУ № 607 г. Клецк филиала № 620 г. Несвиж ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Клецка код 523. Получатель – Клецкий райисполком, УНП 600198162.

5. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, если ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер. Предмет аукциона не может быть продан по начальной цене.

6. Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; не позднее 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка внести плату за предмет аукциона, возместить расходы по формированию и регистрации земельного участка и затраты на подготовку и проведение аукциона**;** внести плату на право заключения договора аренды земельного участка или плату за земельный участок.

7. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи. Контактные телефоны в Клецке: (8 01793), 54657, 50822, сайт www.kletsk.minsk-region.bu

На свае вочы

ПРАГУЛКА ПА АСЕННІМ КІЕВЕ, ці Як не ўлезці ў палітыку

Калі гутарка ідзе пра сталіцу Украіны, наш турыст найчасцей атаясамлівае яе з цэнтральнай вуліцай — Хрышчацікам. Натуральна, я выправіўся сюды, бо меў толькі адзін дзень на гулянне. Экзотыка чакала на кожным кроку.

Уздоўж кіеўскага Хрышчаціка шмат клубаў, кавярняў, а па выхадных перакрываецца рух транспарту. Так што можна шпацыраваць проста па асфальце.

Забудовы, што стаяць паабапал шашы, не пададуцца вам звыш-эксклюзіўнымі. Як і ў Мінску, цэнтральная вуліца будавалася пасля Другой сусветнай вайны, калі ўсё навокал было падарвана. Нешта знішчылі гітлераўцы, да нечага прыклалі руку свае.

Але будынкі савецкага часу на Хрышчаціку — у два-тры разы вышэйшыя, чым нашы, амаль роўныя па памерах з маскоўскімі.

Тлумачыцца гэта тым, што ў «іерархіі народаў» СССР украінцы негалосна займалі другую пазіцыю пасля «рускіх». Беларусы, як кажуць, замыкалі тройку прызёраў. Усё гэта адбівалася і на велічы будынкаў.

***

Калі ў навінах паказваюць Хрышчацік, ведай: у Кіеве адбываюцца палітычныя баталіі.



Так яно і ў рэчаіснасці.

Непадалёк ад Бесарабскага рынку я ўбачыў цэлы гарадок з намётаў. Імправізаванае паселішча зіхацела каляровай гамай разнастайных сцягоў — памяранцавых, васільковых, белых, чырвоных... Такім чынам людзі пратэставалі супраць прысуду, які 11 кастрычніка вынеслі былому прэм'ер-міністру Украіны Юліі Цімашэнцы. Далі сем гадоў пазбаўлення волі за «перавышэнне службовых паўнамоцтваў падчас падпісання газавых кантрактаў з Расіяй».

Ля нямётаў — дзясятак людзей у сіняй уніформе (унутраныя войскі). Унутры імправізаванага мястэчка — столікі, плакаты і вадкакрышталічны тэлевізар пад навесам, з якога вяшчае Юлія Цімашэнка і дэманструюцца гістарычныя дакументальныя стужкі.

«Колы будэ потрібно, мы ляжэм костьмы. Януковыч хочэ статы Пыночэтом! Нэ допустэмо цёго», — абступілі мяне і адну маю калегу жыхары «намётавага мястэчка», калі я папрасіў некага сфатаграфаваць.

Дарэчы, кіяўляне, з якімі мне давялося паразмаўляць, маюць і іншыя думкі адносна прысуду Юліі Цімашэнцы. І ахвотна, у адрозненне ад беларусаў, пра гэта выказваюцца.

Некаторыя пагаджаюцца, што кантракты былі падпісаны на кабальных умовах, і падтрымліваюць прысуд. Некаторыя бэсцяць аднолькава і Юлію Цімашэнку, і прэзідэнта Януковіча: маўляў, цяпер у біяграфіі кожнага ёсць судзімасці...

Пакідаю «намётавае мястэчка» і рушу па перакрытым Хрышчаціку далей. У будні тут — беспрыпынны аўтамабільны рух з раніцы да вечара. Як у Мінску ў гадзіну пік. Пры гэтым, як мне далажылі мясцовыя кіроўцы, ганяць можна больш хутка, чым у Беларусі.

У нас штрафуюць, калі перавысіш лічбу, пазначаную на абмежавальным знаку, больш як на 10 км/г. Ва Украіне даецца калідор у 20 км/г.

Дарэчы, далёка не ўсе ўкраінскія дарогі «дзіравыя», пра што прынята думаць. Калі ехаць у Кіеў машынай з боку Гомеля па галоўнай шашы (праз Новую Гуту), то шаша на ўкраінскім баку не пакідае дрэнных уражанняў. Наадварот, па ёй можна рухацца больш хутка, чым на беларускім баку.

***

На знакамітым кіеўскім Майдане Незалежнасці, на які трапіце, гуляючы па Хрышчаціку, стракаты народны палітычны плюралізм працягваецца.

Побач са сцэнай музычнага фестывалю ў мегафон вяшчае дзядзечка сярэдніх гадоў: «Людзі, схамяніцеся!». Якія палітычныя сілы падтрымлівае чалавек, я не разабраўся. Мяркую, што турысты, якіх на Майдане большасць, таксама.

Адбываецца гэты экшн непадалёк ад адной з калон мясцовага паштамта. Дарэчы, калона захавала надпісы з часоў «памяранцавай рэвалюцыі», якая здарылася ў 2004 годзе. Віктар Юшчанка, які пасля тых падзей зрабіўся прэзідэнтам, ужо на адпачынку. Пасаду атрымаў яго апанент па «памяранцавай рэвалюцыі» Віктар Януковіч. Але надпісы на слупах з тых часоў засталіся. На адной з калон іх «абаранілі» празрыстым пластыкам. Атрымаўся своеасаблівы музейны экспанат.



***

Калі ад Майдана Незалежнасці пакрочыць уверх па вуліцы Сафіеўскай, вы трапіце да легендарнага кіеўскага Сафійскага сабора, які быў збудаваны ў 1037 годзе. Прынамсі, гэта найбольш верагодная дата. Наш Сафійскі сабор у Полацку быў збудаваны прыкладна ў гэты ж час — паміж 1030-1060 гадамі.

Вялізны Сафійскі сабор сімвалізуе магутнасць Кіеўскай Русі — аднаго з самых вялікіх дзяржаўных ўтварэнняў Еўропы за часамі Сярэднявечча.

Сёння сабор не адносіцца ні да адной з украінскіх рэлігійных арганізацый.

У пытаннях духоўных, папярэджваю, ва Украіне не ўсё проста.

Толькі праваслаўе мае тры асноўныя адгалінаванні.

Самай вялікай па колькасці вернікаў называюць Украінскую праваслаўную царкву Кіеўскага патрыярхату (УПЦ КП), якую стварылі ў 1992 годзе. Гэтая рэлігійная арганізацыя з'яўляецца незалежнай ад сучаснай Рускай праваслаўнай царквы, чый патрыярх Кірыл у Маскве. Службы вядуцца ў асноўным на роднай мове.

Навошта ўкраінцы стварылі незалежную праваслаўную царкву? Каб патлумачыць матывацыю, некаторыя кіяўляне прыводзяць у прыклад усё той жа мясцовы Сафійскі сабор, які быў збудаваны задоўга да афіцыйнага ўтварэння Масквы. Вось адзін з доказаў, на думку прыхільнікаў УПЦ КП, чаму падначальвацца маскоўскаму патрыярхату нелагічна.

Але адной незалежнай ад Расіі праваслаўнай арганізацыяй украінцы не абмежаваліся. Існуе і Украінская аўтакефальная праваслаўная царква (УАПЦ), якая, тым не менш, паступова збліжаецца з згаданым Кіеўскім патрыярхатам.

Трэцяе рэлігійнае адгалінаванне — Украінская праваслаўная царква Маскоўскага патрыярхату (УПЦ МП). Тая самая, што падначальваецца маскоўскаму патрыярху Кірылу. Такая ж рэлігійная арганізацыя дзейнічае і ў нас — Беларуская праваслаўная царква Маскоўскага патрыярхату. У нас, калі параўноўваць з Украінай, праваслаўных альтэрнатыў няма. Беларуская мова падчас богаслужэнняў практычна не гучыць...

***

Што тычыцца моўнага гучання горада, Кіеў чымсьці нагадвае Вільню. З усіх бакоў гучаць розныя мовы. Такое ўражанне, што ў роўнай ступені размаўляюць і па-руску, і па-ўкраінску, і па-англійску. Разумеюць тут добра і беларускую мову.

Нават калі адысці ад турыстычных месцаў, вы дакладна зразумееце, што такое сапраўднае двухмоўе. Калі ў Беларусі роднае слова не пачуць, то ўкраінская мова ў Кіеве — на кожным кроку. Размаўляюць на ёй як пажылыя людзі, так і асобы сярэдніх гадоў. Не забываюцца на родную мову і стыльныя юнакі з дзяўчатамі...



***

У цэлым па менталітэце ўкраінцы многім падобныя да беларусаў. Можа, таму так шмат беларускіх журналістаў і музыкантаў імкнуцца ехаць зарабляць грошы менавіта ў Кіеў.

Зарабіўшы, пільна сачыце за сваімі кішэнямі.

Пакуль быў ва ўкраінскай сталіцы, па інфармацыйных агенцтвах пранеслася інфармацыя: пакралі пашпарты і гаманцы ў замежных журналістаў. Некалькіх абчысцілі ў клубе. А з адным прарабілі такое трукацтва: пад ногі падкінулі партманет, а потым пераапрануты ў міліцыянта махляр забраў у замежніка грошы, якія той нібыта прысвоіў.

Ці праўду напісалі, ці гэта прыдумкі жоўтай прэсы — невядома. У міліцыю ніхто з ахвяр не звяртаўся.

Калі праўда, то той, каму абчысцілі кішэні, напэўна, загледзеўся на ўкраінскіх дзяўчат і страціў пільнасць. А ўкраінкі, калі шчыра, могуць паспрачацца з беларускамі за званне самых прывабных у свеце.

***

P.S. *Будзьце ўпэўненыя, што каб пабачыць цікавыя помнікі архітэктуры ў Кіеве (Дом з хімерамі, Залатую браму, Кіева-Пячорскую лаўру, Міхайлаўскі сабор і г.д.) аднаго дня вам не хопіць. Кіяўляне, ў адрозненне ад мінчан, захавалі безліч цікавых будынкаў, якія не знішчылі за савецкай уладай. Яшчэ адна зручнасць украінскай сталіцы: амаль усе цікавыя месцы можна абысці сваімі нагамі...*

У цэнтры Кіева працягвала віраваць палітычна-забаўляльна-культурнае жыццё, калі я вяртаўся з праменаду да месца начоўкі. І толькі спакойная ўкраінская поўня ціха пазірала з-за матавых аблокаў на ўсё гэта. Калі вы тут не былі, раю прыехаць і паглядзець на свае вочы.

Яўген ВАЛОШЫН.
Фота аўтара.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.46	18.02	10.16
Віцебск —	7.38	17.49	10.11
Магілёў —	7.36	17.52	10.16
Гомель —	7.30	17.52	10.22
Гродна —	8.00	18.18	10.18
Брэст —	7.58	18.21	10.23

Месяц

Апошняя квадра ў 6.31. Месяц у сузор'і Льва.

Імяніны

Пр. *Пелагеі, Мікалая, Сяргея, Юльяна.*

К. *Ірэны, Віталя, Яна.*

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

НАДВОР'Е на заўтра

Геамагнітныя ўзрушэнні

Абазначэнні:
- — няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў
- — невялікія геамагнітныя ўзрушэнні
- — слабая геамагнітная бура

Дзве даты

20 кастрычніка

1733 год — на Піншчыне ў беларускай шляхецкай сям'і нарадзіўся Адам Станіслаў Нарушэвіч, беларускі гісторык, паэт, перакладчык, рэлігійны дзеяч. Вучыўся ў Пінскім калегіуме, Віленскай акадэміі, вышэйшую адукацыю атрымаў у Лліёне, пасля чаго быў прызначаны адным з чатырох прафесараў лацінскай славеснасці ў Віленскай акадэміі. Выкладаў таксама ў Варшаўскім езуіцкім калегіуме, Рыцарскай школе ў Варшаве. З 1781 года — пісар вялікі ВКЛ і сакратар Пастаяннай Рады. Суправаджаў караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага ў паездках па Беларусі. Браў удзел у рабоце Чатырохгадовага сейма 1788-92 гадоў. Выступаў за манархічны лад дзяржавы, моцную цэнтралізаваную ўладу. Аўтар палітычных од, ідылій, сатырычных твораў. Адзін з аўтараў «Палітычнай гісторыі старажытных дзяржаў». Сабраны ім 231 том гістарычных матэрыялаў, так званыя «Папкі Нарушэвіча», маюць вялікую навуковую каштоўнасць. Памёр У 1796 годзе.

1961 год — у Берліне адбылося чарговае абвастрэнне сітуацыі. Каля кантрольна-прапускнога пункта на Фрыдрыхштрасэ гармата ў гармату сталі амерыканскія і савецкія танкі. Маршал Іван Конеў быў вымушаны выклікаць да тэлефона Мікіту Хрушчова — прама з прэзідыума XXII з'езда партыі, які праходзіў у тыя дні ў Маскве. «Маторы амерыканскіх танкаў ужо паўгадзіны працуюць на павышаных абаротах», — дакладваў маршал савецкаму лідару. Падумаўшы, Хрушчоў распарадзіўся: «Адвядзіце нашы танкі на суседнюю вуліцу, але няхай іх маторы працуюць у такім жа рэжыме. Дадайце шуму і грукату праз радыёўзмацняльнікі». Праз некаторы час маршал з відавочнай палёгкай даклаў у Маскву: «Амерыканцы сышлі!».

Цытата дня:

«У сур'ёзных і вялікіх справах людзі паказваюць сябе такімі, якімі ім належыць выглядаць; у дробязях — такімі, якія яны ёсць».

Нікала Шамфор (1741—1794), французскі пісьменнік-мараліст.

КРЫЖАВАНКА

Лявон ЦЕЛЕШ, *г.Дзяржынск.*



«СЫПЛЕ ЗОЛАТА ВОСЕНЬ ПАД НОГІ...»

Па гарызанталі: 1. ... за стол просім (прык.). **4.** Святыя ... пакрываюць траву лістам, зямлю снегам, ваду мёдам, а дзяўчат шлюбным чэпкам (прык.). **8.** Віно з яблычнага соку. **9.** Прадмет старажытнай ручной зброі для засцярогі ад стрэл. **11.** Тое, што і дранік. **12.** На пустым полі і ... не расце (прык.). **14.** У кастрычніку і хата з дровамі, і ... з лапцямі (прык.). **18.** Спартсмен-бягун на доўгія дыстанцыі. **19.** Ганаровая вядомасць, прызнанне заслуг. **22.** «Восень распісала\\... клёнаў барвай». З верша Юрася Півунова «Восень распісала». **23.** «Час падходзіў за Пакровы.\\... ліст з лясоў атрос». З паэмы Якуба Коласа «Сымон-музыка». **28.** «Быў ... у лістапад,\\А снег пайшоў — стаў першапутак». З верша Віктара Гардзея «Першапутак». **30.** Гатунак яблыкаў. **31.** «Адыйшло ад нас ты, ...\\Жаўталісцем лес адзеты». З верша Якуба Коласа «За навуку». **32.** Прыхільнік радыкалізму. **33.** Чацвёртая частка года.

Па вертыкалі: 2. Дзе ..., там і вярба (прык.). **3.** У царскай арміі казацкі афіцэрскі чын. **5.** Не вялікі..., ды ўсё ж такі птушка (прык.). **6.** «Знізвае пацеры восень,\\... ўтаропеўшы ўдаль». З верша Янкі Купалы «Восень». **7.** Не чакай з ... дараванага хлеба (прык.). **8.** Тое, што дае пачатак чаму-небудзь радаснаму, вясёламу (перан.). **10.** Прылада працы, з якой звязаны і пашыраны на Беларусі танец «Таўкачыкі». **13.** Той, хто займаецца выдавецкай справай. **15.** «А бярозы, клёны, дзе ні глянеш -\\Апранулі жоўтае ...». З верша Петруся Броўкі «Восень...Восень». **16.** «У ...». Верш Янкі Купалы. («Зашумела нудна восень»). **17.** «Адспявала лета ...,\\\Усе сабрала каласы». З верша Язэпа Пушчы «А ў бары, бары сасонкі». **20.** «Сыпле ... восень пад ногі». З верша Алены Руцкой «Ліставад закружыў галаву». **21.** Тая ..., што голасна раве, мала малака дае (прык.). **24.** Пачатак дня. **25.** «Асенні дзень. Шумяць бары,-\\... лістам апасці». З верша Пятра Глебкі «Размова аб шчасці». **26.** Асенняе ..., — як удаўцова сэрца (прык.). **27.** Па восені і ў кошкі ляпёшкі, і ў вераб'я ...(прык.). **29.** Упэўненасць у чым-небудзь.

Адказы на крыжаванку:
Па гарызанталі: 1. Уосень. 4. Таварові. 8. Сідр. 9. Шыст. 11. Бульбянік. 12. Трава. 14. Мужык. 18. Стаер. 19. Слава. 22. Лісце. 23. Верас. 28. Чарнатрон. 30. Аніс. 31. Лета. 32. Радыкал. 33. Квартал.
Па вертыкалі: 2. Вада. 3. Есаул. 5. Кулік. 6. Вочы. 7. Неба. 8. Свята. 10. Таўкач. 13. Выдавец. 15. Убранне. 16. Вырай. 17. Пясні. 20. Зората. 21. Карова. 24. Раніца. 25. Пара. 26. Сонца. 27. Піва. 29. Вера.

ГРАФІЦІ памерам ў дзвесце квадратных метраў

Замест надпісаў, што шкодзяць фасады пабудоў, — карціны ў стылі графіці, замест «вулічнага хуліганства» — сацыяльны праект. Гэта і ёсць галоўная ідэя фестывалю графіці «СценаГрафія», які сабраў пяцьдзясят аўтараў лепшых работ з Мінска, Брэста, Жодзіна, Бабруйска, Смаргоні і іншых куткоў Беларусі. На першым этапе фестывалю каманды графітчыкаў і самастойныя «вулічныя» мастакі дасылалі арганізатарам эскізы на прапанаваную тэму «Тэхніка на грані фантастыкі». 18 кастрычніка аўтары лепшых работ сабраліся ў сталіцы, каб афарміць сцяну каля 200 квадратных метраў Рэспубліканскага цэнтра тэхнічнай творчасці. Дарэчы, хутка гэтыя працы будуць упрыгожваць не толькі вуліцы, але і кішэнныя календары.

Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.

СВЯТЫ Ў ГОНАР МЯДЗВЕДЗЯ

Культ мядзведзя, вельмі распаўсюджаны ў міфалагічнай і вусна-паэтычнай спадчыне беларусаў, не мог не набыць статусу самастойнага святочна-абрадавага комплексу.

- Такое свята на самой справе было зафіксавана ў Докшыцкім раёне (абшары Бягомльшчыны) Віцебскай вобласці. Яно адзначалася 6 красавіка (24 сакавіка па старым стылі), якраз напярэдадні Дабравешчання (або Звеставання) і атрымала незвычайную назву — Камаедзіца.
- Акрамя Камаедзіцы, беларуская сакральна-абрадавая традыцыя так ці інакш узгадвае мядзведзя на Каляды, у чацвер на Масленічным тыдні або 24 лютага — у дзень ушанавання бога-ахоўніка Вялеса.
- Не менш значнымі былі святы, звязаныя з засынаннем мядзведзя і яго пераварочваннем на другі бок, што азначала пералом зімы. Лічылі, што на працягу зімы мядзведзь паварочваецца на другі бок некалькі разоў. Першы з іх прыпадаў на Спірыдона-сонцаварота (25 снежня), другі — на Аксінню-паўзімніцу (6 лютага). У беларусаў (Ашмянскі павет), як адзначаў І. Берман, мядзведзь паварочваўся ў бярлозе на другі бок 9 сакавіка, таму дзень і атрымаў назву Абертас, або Паўраценне. На Сорак пакутнікаў (22 сакавіка) мядзведзь павінен быў пакінуць сваё лежбішча.
- Існавала прыкмета: калі мядзведзь, разбуджаны веснавым цяплом, выйдзе з бярлогі і ўбачыць свой цень, то ён вернецца назад і праспіць яшчэ сорак дзён, бо столькі будуць працягвацца замаразкі. Канчаткова мядзведзь пакідаў сваю зімовую будыніну 7 красавіка — на Дабравешчанне.
- У асяроддзі паўднёвых славян таксама існавалі «мядзведжыя дні». 11 студзеня балгары адзначалі дзень святога Савы, які ахоўваў людзей ад мядзведзяў. У якасці падарунка-ахвяравання варылі кукурузную або аўсяную кашу і пакідалі яе нанач. У гэты ж самы дзень строга забаранялася хадзіць у лес, узгадваць мядзведзя ў гаворцы, працаваць, запрагаць хатнюю жывёлу. 21 ліпеня балгары адзначалі яшчэ адзін «мядзведжы дзень«, таму што лічылі, што функцыю ахоўніка ад дзікага звера выконвае і святы Пракоп. Аналагічныя падзеі разгортваліся і ў дзень святога Андрэя — 13 снежня. Прычым у гэты дзень абмежаванняў у характары працоўнай дзейнасці было яшчэ больш.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

«Чайнікам» паказалі траўматалогію

Магілёўскае ДАІ шукае новыя формы працы для павышэння бяспекі дарожнага руху. На гэты раз навучэнцы аўташкол наведалі траўматалагічнае аддзяленне Магілёўскай гарадской бальніцы «хуткай дапамогі», дзе на свае вочы ўбачылі і даведаліся пра наступствы парушэнняў правілаў дарожнага руху.

Пацыенты траўматалогіі не хавалі сваіх страшных траўмаў і гісторый пра тое, як яны іх атрымалі.

— Малады чалавек, якога ўрачы літаральна сабралі па частках, сказаў, што не памятае, як усё адбылося, таму што матацыкл завёў моцна п'яным, — расказаў старшы інспектар аддзялення агітацыі і прапаганды Магілёўскай ДАІ Андрэй Калеснік. — Але на бальнічным ложку зрабіў для сябе выснову — болей за руль у нецвярозым стане не сядзе ніколі.

У ДАІ спадзяюцца, што падобную цвёрдую выснову зробяць для сябе і маладыя кіроўцы, якія гутарылі ў бальнічным пакоі з тымі, хто выжыў у ДТЗ.

Ілона ІВАНОВА.

Усміхнемся

У адэскай краме:

— Паслухайце, вы кажаце, што гэта чыстая баваўна, а на бірцы напісана «сінтэтыка»?!

— Мадам, гэта ж мы моль падманваем!

☺

Дыялогі ў сеціве.

— Вітаю! Пытанне ў наступным: ты варыць умееш?

— Ну, бульбу-макарону-пельмені магу... А што, з Машкай пасварыўся?

— Ды не. Марыя, вядома, цудоўны кухар, але, баюся, дзірку ў глушыцелі яна не здужае...

☺

Добрая зарплата — гэта калі трэба атрымліваць наступную, а ты яшчэ папяроднюю не патраціў.

☺

Дзве бутэлькі — дастаткова, але тры — спакуса!

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар НАРКЕВІЧ Уладзімір Браніслававіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, В. ПАЗНЯКОЎ.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 5047 Нумар падпісаны ў 19.30 19 кастрычніка 2011 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12